ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Выдаецца з 1932 г.
№ 29 (2608)
ПЯТНІЦА
21
ліпеня 1972 г.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ НА ШАСНАЦЦАЦІ СТАРОНКАХ

Цана 8 кап.

50 год утварэння СССР

Кожны год Масква ўлетку робіцца форумам тэатральнага мастацтва. Цяпер на сталічных сцэнах дэманструюць свае дасягненні прадстаўнікі Эстоніі і Грузіі, Украіны і Расіі. У памяшканні МХАТа, там, дзе калісьці развінула крылы чэхаўская «Чайка» і паімчаў па рэйках «Браняпоезд 14—69» Ус. Іванава, дэбютаваў Горкі-драматург і заваёўваў ўсесаюзны аўтарытэт А. Карняйчук, на падмостках, якія помняць крокі К. Станіслаўскага і І. Масквіна, В. Кніпер-Чэхавай і М. Хмялёва, М. Лілінай і В. Качалава, сёлета ў ліпені вось ужо трэці тыдзень выступае Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, вядучы драматычны тэатр беларусаў.

Масквічы аднадушна адзначаюць жанравую разнастайнасць яго рэпертуару, маштабнасць і глыбіню арыгінальных сцэнічных вобразаў, самастойнасць рэжысёрскіх пошукаў, выразны нацыянальны характар артыстычнага мастацтва. Адбываюцца хвалюючыя сустрэчы купалаўцаў з гледачамі, з калегамі, з крытыкамі. Трупа мае магчымасць яшчэ і яшчэ раз ўзважыць свае каштоўнасці і пралікі, праверыць сябе перад патрабавальнай і добразычлівай аўдыторыяй. Перад аўдыторыяй не толькі сталых масквічоў—на спектаклі беларускага тэатра імкнуцца патрапіць і шматлікія госці сталіцы.

Па просьбе рэдакцыі фотакарэспандэнты «Литературной газеты» А. Любімаў і І. Сідараў сфатаграфавалі групу купалаўцаў напярэдадні галоўнага ўваходу ў памяшканне славутага МХАТа.

У НУМАРЫ ЧЫТАЙЦЕ:

ГАЛОЎНАЯ ТЭМА ДНЯ
Стар. 2—3

НА ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ БССР
Стар. 3

БЕЛАРУСЬ АДЗНАЧАЕ ДНІ ПОЛЬСКАЙ КУЛЬТУРЫ
Стар. 4—5

СЁННЯШНІ ДЗЕНЬ ПАЭЗІІ
Працягваем дыскусію. Выступаюць Мікола Арочка і Васіль Жуковіч
Стар. 6—7

«СНЕЖНЫЯ ЗІМЫ» Івана ШАМЯКІНА—НА СЦЭНЕ
Стар. 8—9

СЯРОД КНІГ
Стар. 10—11

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА
Па выставачных залах і ў майстэрні кераміста
Стар. 12—13

ЯК МЫ АПРАНАЕМСЯ
Паразважаем разам з мадэльерамі
Стар. 15

РАБОЧАЯ ТЭМА Ў ЛІТАРАТУРЫ...

РАБОЧЫ, рабочая тэма ў літаратуры... Словы гэтыя ўсё часцей можна сустрэць на старонках літаратурных часопісаў і газет, пачуць на пісьменніцкіх сходах і чытацкіх канферэнцыях. Адчуваецца жывы, гарачы клопат, прадыктаваны надзённымі патрэбамі нашага сацыялістычнага грамадства, паказаць на ўвесь рост не толькі чалавека працы наогул, але перш за ўсё прадстаўніка сучаснага рабочага класа. Асабліва моцна гэтая заклапочанасць выявілася пасля XXIV з'езда КПСС, які, даўшы навукова-абгрунтаваную праграму далейшага руху савецкага народа да камунізма, падкрэсліў узрастаючую ролю рабочага класа ў жыцці нашага грамадства. Урэшце, надзённая неабходнасць асвятліць сацыялістычныя, эканамічныя і маральныя праблемы жыцця сённяшняга савецкага рабочага і на гэтай жыватворнай глебе стварыць вобраз такога літаратурнага героя, з якога можна было б браць прыклад, «рабіць жыццё», другімі словамі «выхоўваць масы на працоўных традыцыях слаўнага рабочага класа нашай краіны»,—асоба адзначыў I XV з'езд прафсаюзаў СССР. Гутарка ідзе, як бачым, не проста аб паказе чалавека працы, звычайнага працаўніка (характар якога заўсёды быў і будзе прадметам мастацкага даследавання), а менавіта аб канкрэтным паказе літаратурнага героя з асяроддзя рабочага класа і яго авангарда—партыі камуністаў.

У абвостранай ідэалагічнай барацьбе, калі на Захадзе наўмысна ўсяляк прыніжаецца роля рабочага класа ў сучасным свеце, шматлікі савецкі чытач яшчэ з большай падставай чакае ад мастацкай літаратуры выразнага адказу на пытанне: што ж на самой справе ўяўляе сёння з сябе рабочы чалавек, як жыве ён, як у ім прачынаецца, расце, дужэе класавая свядомасць, як яна праяўляецца ў паўсядзённым жыцці... Менавіта ж для рабочага класа ІДЭАЛЫ ПАРТЫІ, ІДЭАЛЫ КАМУНІЗМА СТАЛІ СУТНАСЦЮ ЎСЯГО ЯГО СВЕТАПОГЛЯДУ. Такім чынам, стварыць вобраз рабочага чалавека, актыўнага змагара за справу камунізма, на ўсёй шырыні яго інтарэсаў, багацці думак і пачуццяў, які б паланіў сэрца чытача эстэтычнай дасканаласцю — пачэсны грамадзянскі абавязак савецкага літаратара.

Нельга сказаць, каб у мастацкіх творах апошніх год беларускія пісьменнікі абышлі магістральную тэму савецкай літаратуры. Тэма рабочага класа, тэма горада выразна гучыць у творах І. Шамякіна, Ул. Карпава, А. Савіцкага, Т. Хадкевіча, А. Кулакоўскага, М. Матукоўскага і іншых. Каралей, ёсць пэўныя здабыткі. На Усесаюзным конкурсе 1970—1972 гадоў на лепшы твор аб сучасным савецкім рабочым класе была адзначана заахвочвальнай прэміяй дакументальная аповесць А. Савіцкага «След праходвае першы». Чытачы памятаюць —аўтар расказаў у ёй пра калектыў сталявараў Мінскага аўтазавода, пра Героя Сацыялістычнай Працы Д. І. Барашкіна. Бясспрэчная вартасць аповесці ў тым, што А. Савіцкі на багатым фактычным матэрыяле, на лёсе сталявара Барашкіна паказаў, як складваўся рабочы калектыў першынца беларускага аўтамабілебудавання. І меў рацыю сказаць адзін з прадстаўнікоў гэтага калектыву, майстар плавільнага ўчастка сталеліцейнага цэха С. Чуб, што аповесць «мае вялікае выхаваўчае значэнне».

Некалькі твораў пра рабочага чалавека належаць пяру В. Мысліўца. Яны прываблiваюць добрым веданнем маладым празаікам жыцця рабочых, разуменнем іх праблем, пошукамі. Менавіта гэтыя пошукі В. Мысліўца ў асваенні «рабочага мацерыка» падкрэсліў нядаўна ў сваім артыкуле «Новыя набыткі рабочай тэмы» пісьменнік М. Воранаў («Литературная газета», № 12, 1972 г.).

Аднак у цэлым прычын для самазадавальнасці няма. Тое, што зроблена беларускімі пісьменнікамі па адлюстраванні тэмы рабочага класа ў літаратуры, крайне недастаткова. Ды і не заўсёды гэтыя мастацкія творы адпавядаюць эстэтычным крытэрыям часу. Як слушна адзначыў на VI з'ездзе пісьменнікаў Беларусі Максім Танк, нямала ў нас твораў «напісана пра горад, але большасць з іх узнімаюць праблемы, якія маюць месца ў асяроддзі інтэлігенцыі. На вялікі жаль, пра рабочы клас мы пішам усё яшчэ мала». Гэткі справядлівы дакор вельмі часта чуе пісьменнік, выступаючы ў рабочых аўдыторыях... Разам з тым, трэба ўлічваць, што прыкметна павысілася і патрабавальнасць чытача, з якой ён ставіцца да мастацкіх твораў аб рабочым чалавеку. Сёння ўжо недастаткова ў творы пра рабочы клас аднаго «індустрыяльнага пафасу», паказу толькі сферы вытворчых адносін—гэткі паказ збядняе духоўны свет сучаснага героя... Гутарка ідзе аб разнастайным і шырокім узнаўленні духоўнага аблічча чалавека працы, яго спраў, не абавязкова выключных, але абавязкова напоўненых жывой творчасцю, прасякнутых страсным імкненнем быць карысным грамадству. Пісьменніку неабходна, паказваючы рабочага чалавека, яго багаты і складаны ўнутраны свет, адказваць чытачу не толькі на пытанні, якія стымулы рухаюць гэтым чалавекам у працы, але і які ён, рабочы, у звычайным жыцці, асяроддзі, які ў самых розных сувязях з навакольным.

Ёсць і другія аспекты гэтай важнай праблемы. Выказваючы на студзеньскім пленуме праўлення Саюза пісьменнікаў СССР сур'ёзную заклапочанасць тым, што шэрагу кніг пра рабочы клас усё не хапае сапраўднай глыбіні ў раскрыцці характару сучасніка, якому ўласцівы лепшыя класавыя рысы і якасці, дакладчык В. Озераў звярнуў увагу на наступнае: у гэтых кнігах ёсць розныя публіцыстычныя меркаванні па розных праблемах, апісваюцца падзеі, якія адбываюцца на вытворчасці, але адсутнічае мастацкае асэнсаванне сацыяльна-этычнага зместу перамен, што прынесла навукова-тэхнічная рэвалюцыя...

Сапраўды, мы жывём у час нябачнага навукова-тэхнічнага перавароту. Аб гэтым нямала пішуць нашы сацыёлагі. Яны справядліва сцвярджаюць, што ўсё больш актыўна ідзе працэс якасных змен у рабочым класе, што навукова-тэхнічная рэвалюцыя караджае новыя прафесіі, звязаныя з комплекснай механізацыяй і аўтаматызацыяй вытворчасці, адначасова скарачае некаторыя старыя прафесіі, звязаныя, перш за ўсё, з цяжкай фізічнай працай і г. д. А прафесія, змест працы, у значнай ступені вызначаюць і сацыяльнае аблічча, сацыяльную актыўнасць нашага сучасніка.

НАРАДА ІДЭАЛАГІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ

У Мінску 18 ліпеня адбылася скліканая ЦК КПБ рэспубліканская нарада ідэалагічных работнікаў. У ёй удзельнічалі кіраўнікі рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў, работнікі газет, часопісаў, выдавецтваў, тэлебачання і радыёвяшчання, навуковых устаноў, устаноў культуры, армейскія палітработнікі, сакратары партыйных камітэтаў, намеснікі старшынь выканкомаў гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных, кіраўнікі ідэалагічных устаноў горада Мінска і Мінскай вобласці.

Нараду адкрыў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі П. М. Машэраў.

З дакладам «Вынікі ўсесаюзнай нарады ідэалагічных работнікаў па пытаннях ідэйна-выхаваўчай работы ў святле рашэнняў XXIV з'езда КПСС і ў сувязі з падрыхтоўкай да 50-годдзя ўтварэння СССР і задачы партыйных арганізацый рэспублікі» выступіў сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін.

У спрэчках па дакладзе выступілі міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, сакратар Мінскага гаркома КПБ Т. Ц. Дзмітрыева, міністр культуры БССР Ю. М. Міхневіч, рэдактар рэспубліканскай газеты «Звязда» М. І. Дзялец, сакратар Салігорскага гаркома КПБ А. Г. Міхаленя, сакратар ЦК ЛКСМБ Г. П. Анціпаў, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні М. А. Суша, намеснік начальніка Палітупраўлення ЧБВА В. А. Захараў, першы намеснік міністра асветы БССР А. І. Канцавая, сакратар Мінскага абкома КПБ У. С. Багданаў, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі пры Савеце Міністраў БССР Я. П. Нікулкін і намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі П. Б. Жукоўскі.

У рабоце нарады ўдзельнічалі другі сакратар ЦК КПБ А. Н. Аксёнаў і намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. Л. Сняжкова.

БЕЛТА.

ВІНШУЕМ!

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

АБ ПРЫСВАЕННІ ТАВ. МЕЛЕЖУ І. П. ГАНАРОВАГА ЗВАННЯ НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА БЕЛАРУСКАЙ ССР

За вялікія дасягненні ў развіцці беларускай савецкай літаратуры прысвоіць тав. Мележу Івану Паўлавічу ганаровае званне народнага пісьменніка Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Ф. СУРГАНАЎ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Л. ЧАГІНА.

19 ліпеня 1972 года, гор. Мінск.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

АБ ПРЫСВАЕННІ ТАВ. ШАМЯКІНУ І. П. ГАНАРОВАГА ЗВАННЯ НАРОДНАГА ПІСЬМЕННІКА БЕЛАРУСКАЙ ССР

За вялікія дасягненні ў развіцці беларускай савецкай літаратуры прысвоіць тав. Шамякіну Івану Пятровічу ганаровае званне народнага пісьменніка Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Ф. СУРГАНАЎ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Л. ЧАГІНА.

19 ліпеня 1972 года, гор. Мінск.

З УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў развіцці тэатральнага мастацтва і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў галоўнага рэжысёра Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра імя ЛКСМ Беларусі, народнага артыста Беларускай ССР Волкава Георгія Андрэевіча Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

□

За заслугі ў развіцці беларускай савецкай літаратуры і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў пісьменніка Махнача Алеся Іванавіча Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

—ДЗЯДУЛЯ, я сёння паслала пісьмо Анджэле Дэвіс! — вось якую навіну паведаміла мне вучаніца трэцяга класа.

Так, гэта вялікая навіна. Гэта— велізарная падзея ў жыцці дзіцяці, па ўзросту маленькага чалавека, які жыве вялікімі хваляваннямі цэлага свету.

Калі гнеў, абурэнне супраць зла, несправядлівасці, якія творацца на другім канцы планеты, перапаўняюць не толькі нас, дарослых, але па-асобаму адгукаюцца ў дзіцячым, чулым і ўражлівым сэрцы,—гэта не можа не выклікаць нашай грамадзянскай гордасці за духоўныя заваёвы грамадства, у якім пачуццё інтэрнацыянальнага абавязку з самага ранняга дзяцінства ўваходзіць у маральную свядомасць чалавека.

З асаблівым хваляваннем думаеш аб гэтым зараз, калі народы нашай краіны, народы ўсяго прагрэсіўнага свету сустракаюць слаўны юбілей вялікай дзяржавы, якая жыве па запаветах Леніна, па законах сардэчнага адзінства, дружбы і братняга раўнапраўя.

Для нас, дзіцячых пісьменнікаў, няма большага шчасця, чым служыць самым юным грамадзянам гэтай нябачанай у гісторыі дзяржавы, выхоўваць сапраўдных патрыётаў Радзімы, людзей, якія заўсёды адчуваюць і ўсведамляюць свой братні абавязак і адказнасць за сваю будучыню і за шчасце чалавека на зямлі.

Зараз, калі партыя рашэннямі свайго XXIV з'езда паставіла перад намі задачу фарміравання духоўна і эстэтычна багатай асобы савецкага чалавека, мы асабліва адчуваем сваю адказнасць за інтэрнацыянальнае выхаванне з самых першых дзён далучэння чалавека да свядомага жыцця.

Пастанова ЦК КПСС «Аб падрыхтоўцы да 50-годдзя ўтварэння СССР», гэты глыбокі тэарэтычны і практычны дакумент на многія гады вызначае нашы задачы па інтэрнацыянальным выхаванні.

Радасць узаемаразумення, духоўнага ўзбагачэння, братняга таварыства і дружбы савецкіх людзей—вось крыніцы натхнення, якія жывяць творчасць кожнага з нас.

Беларускія пісьменнікі па-асобаму гэта перажылі ў дні Усесаюзнага тыдня дзіцячай кнігі, якая ў гэтым годзе выбрала сваёй сталіцай наш Мінск. Нашы сябры — пісьменнікі з братніх рэспублік, нашы госці — вучні, педагогі, выхавацелі, якія прыехалі ў Беларусь на «кніжчыны імяніны», з пачуццём радаснага хвалявання знаёміліся паміж сабой, з беларускай дзіцячай літаратурай і з пачуццём вялікай

рабочага. Як падкрэслівалася на XV з'ездзе прафсаюзаў СССР, цяпер сярод рабочага класа краіны, які за гады Савецкай улады павялічыўся ў шэсць разоў, больш дзвюх трэціх складаюць індустрыяльныя рабочыя. Значна вырас атрад рабочага класа і ў нашай прамысловай Беларусі. Аднак, у паказе росту і фарміравання класавай, грамадскай свядомасці ў новых умовах сацыяльна-эканамічнага жыцця беларускай літаратурай, кансалідуючая роля якой у фарміраванні грамадскай думкі агульнавядомая, зроблена да прыкрага мала... Дарэчы, аб гэтым даволі канкрэтна гаварылася на нядаўнім сходзе камуністаў-літаратараў, на якім была абмеркавана пастанова ЦК КПБ аб рабоце партыйнай арганізацыі Саюза пісьменнікаў БССР. Гаварылася слушна, грунтоўна аб тым, што калі мы хочам быць на ўзроўні патрабаванняў часу, калі хочам ісці ў нагу з жыццём, калі, урэшце, не жадаем страціць вялікую чытацкую аўдыторыю рабочых, то павінны неадкладна ўзмацніць творчыя сувязі з сучаснай вытворчасцю, з яе людзьмі, павінны стаць бліжэй да Яго Вялікасці рабочага класа, да яго патрэб і задач. Ды час перайсці ўжо і да справы. Досыць чакаць таго моманту, калі, як пішуць некаторыя нашы крытыкі, «вялікая «гарадская» проза з'явіцца разам з прыходам у літаратуру таленавітых пісьменнікаў-гараджан» або спакойна назіраць, як яна «будзе стварацца па меры «урбанізацыі псіхалогіі літаратараў, якія выраслі ў вёсцы...». Ад такой пазіцыі патыхае звычайнай інертнасцю, а інертнасць ніколі не прыносіла карысці. Між тым, у 20—30-я гады савецкія пісьменнікі не чакалі, пакуль вырастуць «пісьменнікі-гараджане», яны горача адгукнуліся на патрэбы часу, на заклік партыі, стварылі нямала цудоўных кніг пра рабочы клас, ярка адлюстравалі маральнае, сацыяльнае абуджэнне чалавека, яго асабістае далучэнне да сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Дастаткова прыгадаць такія творы, як «Соть», «Время, вперед!», «Танкер «Дербент», «Цемент», «Люди из захолустья» і многія іншыя, што ўвайшлі ў залаты фонд савецкай літаратуры.

На сённяшнім этапе камуністычнага будаўніцтва перад літаратарамі стаяць не менш важныя і пачэсныя задачы ў святле гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС. Думаецца, што доля адказнасці за пралікі ў асвятленні тэмы рабочага класа ў нашай літаратуры ляжыць і на пісьменніках старэйшага пакалення. Каму, як не ім, жывым сведкам гістарычна-сацыяльных пераўтварэнняў у рэспубліцы, людзям з вялікім жыццёвым і творчым вопытам паказаць прыклад у напісанні твораў пра гераічны рабочы клас — так, як рабіў гэта Максім Горкі. А не захапіцца, не ўсхвалявацца сапраўднаму мастаку слова высакародным вобразам перадавога рабочага—проста немагчыма... Бо, як вельмі пранікнёна, дакладна і ярка сказаў на XV з'ездзе прафсаюзаў Л. І. Брэжнеў, «перадавы рабочы сёння — гэта чалавек, які валодае глыбокімі ведамі, шырокім культурным далягляданям, свядомымі і творчымі адносінамі да працы. Ён адчувае сябе гаспадаром вытворчасці, чалавекам, адказным за ўсё, што адбываецца ў нашым грамадстве. Такі рабочы палітычна актыўны, ён нецярпімы да расхлябанасці і безадказнасці, да любых недахопаў у арганізацыі вытворчасці. Ён непрымірымы вораг усялякага мяшчанства, любых перажыткаў мінулага ў свядомасці і паводзінах людзей».

Менавіта такі вобраз сучаснага прадстаўніка слаўнага рабочага класа павінен атрымаць пастаянную прапіску ў мастацкіх творах нашых пісьменнікаў.

АД КАМІТЭТА ПА ДЗЯРЖАЎНЫХ ПРЭМІЯХ БССР У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ, МАСТАЦТВА І АРХІТЭКТУРЫ

Камітэт па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўных прэмій БССР 1972 года дапушчаны наступныя кандыдатуры:

У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Бугаёў Д. Я.** Кнігі крытычных і літаратуразнаўчых работ: «Шматграннасць» і «Зброяй сатыры, зброяй праўды».

Прадстаўлены праўленнем Саюза пісьменнікаў БССР.

2. **Бураўкін Г. М.** Кніга паэзіі «Жніво».

Прадстаўлена праўленнем Саюза пісьменнікаў БССР.

3. **Бярозкін Р. С.** Кніга крытычных і літаратуразнаўчых работ «Постаці».

Прадстаўлена праўленнем Саюза пісьменнікаў БССР.

4. **Грахоўскі С. І.** Кніга «Паэма дарог». Вершы і паэма.

Прадстаўлена праўленнем Саюза пісьменнікаў БССР.

5. **Карпаў У. Б.** Раманы: «Нямігі крывавыя берагі», «За годам год», «Вясеннія ліўні», «Сотая маладосць».

Прадстаўлены праўленнем Саюза пісьменнікаў БССР.

6. **Кірэенка К. Ц.** «Кніга ста песень». Вершы.

Прадстаўлена праўленнем Саюза пісьменнікаў БССР.

7. **Лобан М. П.** Раманы «На парозе будучыні» і «Гарадок Устронь».

Прадстаўлены праўленнем Саюза пісьменнікаў БССР.

8. **Навуменка І. Я.** Літаратуразнаўчыя кнігі: «Янка Купала. Духоўны воблік героя» і «Якуб Колас. Духоўны воблік героя».

Прадстаўлены кафедрамі беларускай і рускай літаратур Магілёўскага педагагічнага інстытута і Магілёўскім аддзяленнем СП БССР.

У ГАЛІНЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ

1. **Сіпакоў Янка.** Кніга нарысаў «Па зялёную маланку».

Прадстаўлена праўленнем Саюза пісьменнікаў БССР.

2. **Ус А. П., Уладзімірава А. П.** Дакументальная аповесць «Вікторыя».

Прадстаўлена праўленнем Саюза журналістаў БССР.

У ГАЛІНЕ МУЗЫКІ

1. **Семяняка Ю. У.** Цыкл патрыятычных песень: «Беларусь—мая песня», «Расцвітай, Беларусь», «Ленінская праўда расцвітае», «Люблю цябе, Белая Русь», «Славім мы свой край любімы».

Прадстаўлены праўленнем Саюза кампазітараў БССР.

У ГАЛІНЕ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

1. **Кашкурэвіч А. М.** Серыя графічных лістоў «Партызаны» і серыя графічных лістоў па матывах твораў Янкі Купалы.

Прадстаўлена праўленнем Саюза мастакоў БССР.

У ГАЛІНЕ ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

1. **Матукоўскі М. Я.** — аўтар п'есы, **Кандрашоў Ц. А.** — рэжысёр, **Грыгар'янц А. Б.** — мастак, **Браварская З. І., Кармунін П. В.** —выканаўцы роляў. Спектакль «Амністыя» ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы.

Прадстаўлена праўленнем Беларускага тэатральнага аб'яднання.

2. **Папоў І. С.** — рэжысёр. Пастаноўка спектакляў «Жыццё ўсяго адно», «Залатая карэта», «Першы грэх» у Гомельскім абласным драматычным тэатры.

Прадстаўлена Міністэрствам культуры БССР.

У ГАЛІНЕ КІНЕМАТАГРАФІІ

1. **Губарэвіч К. Л.** — аўтар сцэнарыя, **Голуб Л. У.** — рэжысёр, **Масальскі Р. І.**—аператар. Мастацкі фільм «Паланез Агінскага» вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм».

Прадстаўлены Дзяржкамітэтам Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі і праўленнем Саюза кінематаграфістаў БССР.

ЗА ТВОРЫ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

1. **Вітка Васіль (Крысько Ц. В.).** Кнігі: «Чытанка-маляванка», «Беларуская калыханка», «Казкі».

Прадстаўлены праўленнем Саюза пісьменнікаў БССР.

2. **Маўр Янка (Фёдараў І. М.).** Сукупнасць твораў: «Чалавек ідзе», «У краіне райскай птушкі», «Амок», «Сын вады», «Палескія рабінзоны», «ТВТ», «Шлях з цемры».

Прадстаўлена Мінскай абласной дзіцячай бібліятэкай імя Янкі Маўра і супрацоўнікамі дзіцячых бібліятэк Мінскай вобласці.

3. **Якімовіч А. І.** Аповесці «Адкуль ліха на свеце», «Кастусь Каліноўскі», «Канец сервітуту».

Прадстаўлены праўленнем Саюза пісьменнікаў БССР.

●

Адбіраючы работы для ўдзелу ў конкурсе, Камітэт, у адпаведнасці з палажэннем аб Дзяржаўных прэміях БССР, у некаторых выпадках упёс змены ў склад кандыдатур, прапанаваны арганізацыямі, якія іх вылучалі.

Для шырокага азнаямлення з работамі, вылучанымі на атрыманне Дзяржаўных прэмій БССР, Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні арганізуе цыкл перадач па радыё і тэлебачанні, а Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі — дэманстрацыю фільма «Паланез Агінскага» ў кінатэатрах рэспублікі. Праўленне Саюза мастакоў БССР наладзіць выстаўку твораў А. Кашкурэвіча.

Вялікай дапамогай Камітэту па Дзяржаўных прэміях БССР з'явіцца актыўнае абмеркаванне прадстаўленых работ савецкай грамадскасцю і органамі друку. Камітэт звяртаецца да творчых і грамадскіх арганізацый, устаноў культуры, навукова-даследчых інстытутаў, а таксама да рэдакцый газет і часопісаў з просьбай арганізаваць абмеркаванне работ, пакінутых для ўдзелу ў конкурсе, да 1 снежня г. г.

Водгукі аб кандыдатурах, матэрыялы грамадскіх абмеркаванняў прысылаць па адрасе: Мінск, вул. Акадэмічная, 15-а, БелСЭ, Камітэт па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

ПІСЬМЕННІК І ЖЫЦЦЁ

ТАЛЕНТ І СЭРЦА

Васіль ВІТКА

зацікаўленасці гаварылі аб многіх практычных справах.

Творчы сімпозіум, які адбыўся ў Мінску, быў прысвечаны ролі дзіцячай літаратуры ў інтэрнацыянальным выхаванні. У юбілейным годзе ўсе мы з асаблівай сілай адчулі глыбокае інтэрнацыянальнае значэнне самога свята дзіцячай кнігі, якое стала ўжо добрай традыцыяй нашага жыцця. Гэта адзіны ў годзе тыдзень, які не мае выхадных дзён. Але за сваю звышурочную працу мы, дзіцячыя пісьменнікі, узнагароджваемся такой радасцю сувязі са сваімі чытачамі, што творчай зарадкі хапае потым на многія месяцы і гады.

І ўсё ж, свята — святам. Хацелася б, каб усесаюзныя тыдні былі своеасаблівымі аглядамі дзіцячай літаратуры, і канкрэтна — аглядам дзіцячай літаратуры той рэспублікі, якая прыняла эстафету «кніжчыных імянін» на наступны год.

Каб, прыехаўшы на чарговы тыдзень, мы былі не толькі гасцямі, а і людзьмі, зацікаўленымі ў развіцці і дасягненнях дзіцячай літаратуры кожнага нашага братняга народа, каб усё лепшае, што з'яўляецца ў кожнага з нас, рабілася нашым агульным здабыткам.

Стварэнне вялікай літаратуры для дзяцей ужо немагчыма толькі намаганнямі адных пісьменнікаў, без вопыту савецкай педагогікі, без удзелу выхавацеляў, без сапраўды творчых школьных падручнікаў, якія абуджаюць жывую дапытлівую дзіцячую думку.

Таму нельга не парадавацца, што за складанне школьных дапаможнікаў узяліся і вопытныя літаратары. Аўтарамі прызнаных вельмі ўдалымі малдаўскага і беларускага букваро ў з'яўляюцца пісьменнікі: Спірыдон Вангелі, Грыгарэ Віеру, Анатоль Клышка. Беларускі крытык Рыгор Шкраба напісаў падручнік па літаратуры для старшых класаў, беларуская паэтэса Эдзі Агняцвет разам з вопытнымі педагогамі — хрэстаматыю для трэцяга класа.

Зараз у святле высокіх ідэйных і эстэтычных патрабаванняў без прафесійнага ўдасканалення, без сістэмы перадавых педагагічных перакананняў, без асваення народнага вопыту выхавання нельга быць ні дзіцячым пісьменнікам, ні педагогам.

Педагогіка і літаратура — дзве родныя, неразлучныя сёстры. Толькі пры іх самай актыўнай садружнасці магчыма сапраўднае духоўнае і эстэтычнае выхаванне чалавечай асобы з першых дзён яе свядомасці.

У дзіцячай літаратуры нецярпіма саматужніцтва, аматарства і рукадзелле, якія, на жаль, часта яшчэ прымаюцца за творчасць. Ведаючы, што ў нас нечуваны попыт на кнігу для дзяцей і што кожная з іх расходзіцца ў першыя ж дні з'яўлення на кніжным прылаўку, мы суцяшаем сябе шкоднай ілюзіяй усеагульнага поспеху, у той час, як многія заведама бездапаможныя, прымітыўныя падробкі наносяць густам нашых дзяцей непапраўную шкоду. Вядомая пастанова ЦК КПСС аб дзіцячай літаратуры, прынятая тры гады назад, абавязвае нас быць нецярпімымі да падобнага літаратурнага саматужніцтва. Дзе-дзе, а ўжо ў дзіцячай літаратуры асабліва неабходная арганізатарская роля і жывая ініцыятыва. Не будзем забываць бясцэннага вопыту А. М. Горкага, які першы паказаў нам прыклад такой актыўнай арганізатарскай зацікаўленасці ў стварэнні літаратуры для дзяцей.

Для дзяцей трэба пісаць па закліку сумлення, па закліку душы, па закліку сапраўднай любві. «Сэрца аддаю дзецям», — так назваў сваю кнігу наш украінскі друг, выдатны савецкі педагог. Сёння гэтыя словы гучаць як запавет нам, таму што сам аўтар кнігі Васіль Аляксандравіч Сухамлінскі даказаў сваю любоў да дзяцей усім жыццём патрыёта, воіна, камуніста, вучонага і пісьменніка — усім жыццём да апошняй яго мінуты.

Я шчаслівы, што ведаў гэтага цудоўнага чалавека, супрацоўнічаў з ім. Сваю кнігу паэтычных навел і казак «Блакітныя жураўлі» Сухамлінскі прысвяціў беларускім сябрам. Упершыню яна выйшла ў нас, у Беларусі, выклікаўшы жывую цікавасць бацькоў, педагогаў і выхавацеляў.

Гаворачы пра Сухамлінскага, мы ставім яго прыкладам сапраўднага служэння дзецям. Гэта не толькі самая высакародная, а і самая адказная справа — служыць дзецям, аддаць ім усяго сябе, усе свае веды, талент і сэрца!

ГРАМАДСКІ АГЛЯД БІБЛІЯТЭК

Калегія Міністэрства культуры БССР і прэзідыум Беларускага рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў культуры з ліпеня па снежань 1972 года праводзяць рэспубліканскі грамадскі агляд работы бібліятэк, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР.

Мэта агляду — павысіць ідэйна-палітычны ўзровень работы бібліятэк, іх ролю ў камуністычным будаўніцтве і выхаванні моладзі.

За час грамадскага агляду бібліятэкі абавязаны павысіць ідэйны ўзровень прапаганды кнігі і кіраўніцтва чытаннем; шырока карыстацца найбольш эфектыўнымі формамі і метадамі масавай і індывідуальнай работы сярод чытачоў; сістэматычна весці паглыбленую прапаганду рашэнняў XXIV з'езда КПСС, памагаць партыйным, савецкім і гаспадарчым органам у іх здзяйсненні.

Палажэнне аб грамадскім аглядзе бібліятэк прадугледжвае выкананне мерапрыемстваў Міністэрства культуры БССР па Міжнародным годзе кнігі.

Для кіраўніцтва грамадскім аглядам бібліятэк створаны рэспубліканскія, абласныя, гарадскія і раённыя аргкамітэты. Старшынёй аргкамітэта па правядзенні рэспубліканскага грамадскага агляду бібліятэк зацверджана начальнік упраўлення культасветустаноў Міністэрства культуры БССР Ж. Сінельнікава, намеснікам — сакратар прэзідыума БРК прафсаюза работнікаў культуры Г. Кузьмінова.

У НАШАЙ РЭСПУБЛІЦЫ пачаліся Дні савецка-польскай культуры. дружбы і польскай

На прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, у навуковых установах Беларусі з дакладамі і гутаркамі аб развіцці эканомікі і культуры Польскай Народнай Рэспублікі, яе поспехах у сацыялістычным будаўніцтве выступаюць лектары таварыства «Веды».

Беларускія чытачы любяць і ведаюць польскую літаратуру. У рэспубліцы творы класікаў і сучасных пісьменнікаў Польшчы ў перакладах на рускую і беларускую мовы выдаваліся 39 разоў агульным тыражом 355 тысяч экземпляраў. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца кнігі Адама Міцкевіча, Баляслава Пруса, Яніны Бранеўскай, Уладзіслава Бранеўскага, Марыі Канапніцкай, Генрыка Сянкевіча і іншых аўтараў.

У гарадскіх і сельскіх бібліятэках праводзяцца канферэнцыі чытачоў па творах сучаснай польскай літаратуры, якая вырасла на прагрэсіўных і рэвалюцыйных традыцыях Міцкевіча і Ажэшкі, Някрасава і Горкага. Арганізуюцца выстаўкі кніг польскіх пісьменнікаў.

Гомельская абласная бібліятэка правяла тэматычны вечар «Нацыянальнае свята Польскай Народнай Рэспублікі», прысвечаны 28-годдзю вызвалення Польшчы. На вечары зроблены агляд новай польскай літаратуры, выступілі чытачы, якія пабывалі ў дружалюбнай нам сацыялістычнай краіне. Парадавалі ўдзельнікаў вечара вялікая кніжная выстаўка і музычная старонка «Мастацтва Польшчы».

Кніжная выстаўка «Польская Народная Рэспубліка — да 28-й гадавіны нацыянальнага адраджэння Польшчы» з вялікай цікавасцю ўспрынята наведвальнікамі Магілёўскай абласной бібліятэкі. Цяпер там рыхтуюцца вечар польскай паэзіі, а таксама кніжныя выстаўкі «Шлях барацьбы, стварэння і перамог польскага народа» і «Беларуска-польскія літаратурныя сувязі». Будзе праведзены адкрыты прагляд «Кнігі нашых сяброў», рыхтуюцца выстаўкі па матэрыялах газет і часопісаў «Польшча сёння» і «Мастацтва Польшчы».

Аматары блакітнага экрана ўбачаць польскія фільмы, якія будуць дэманстравацца ў час тэлевізійнага кінафестывалю. Адкрыецца фестываль цікавым захапляючым дакументальным фільмам «Вітаем вас».

Сябры з народнай Польшчы прыслалі ў Беларусь творы жывапісу, графікі, прыкладнога мастацтва, кнігі. У сталіцы рэспублікі, а таксама ў Маладзечна будуць дэманстравацца тры выстаўкі мастацкіх фатаграфій, прадстаўленыя варшавянамі. Выстаўкі жывапісу і графікі «Савецкі Саюз — вачыма польскіх мастакоў», вырабы прыкладнога мастацтва майстроў Польскай Народнай Рэспублікі прыслала на агляд мінчан галоўнае праўленне Таварыства польска-савецкай дружбы.

У кніжныя магазіны Мінска і іншых гарадоў рэспублікі паступаюць навінкі выдавецтваў Варшавы. Нядаўна вялікая партыя такіх кніг паступіла ў сталічны магазін «Дружба». У акруговым Доме афіцэраў наведвальнікі ўбачаць выстаўкі кніг выдавецтва міністэрства абароны Польшчы і польскага плаката.

БЕЛТА.

«УЗБАГАЧАЕ ЗМЕСТАМ І ФОРМАЙ...»

Кніга, на вокладцы якой красуецца ўзор нашага народнага арнаменту, называецца сціпла — «Беларускія вершы». Але выхад гэтай кнігі ў Лодзі — падзея ў жыцці дзвюх краін-суседак: польскаму чытачу ўпершыню ў гісторыі нашых літаратурных узаемаадносін дадзена анталогія сучаснай беларускай паэзіі.

Ініцыятарам выдання з'яўляецца добры знаўца і актыўны прапагандыст нашай літаратуры ў Польскай Народнай Рэспубліцы паэт Ян Гушча — ён, як зазначана на тытульным лісце, анталогію «склаў, апрацаваў і прадмовай забяспечыў». Прадмова, дарэчы, вельмі ўдала ўводзіць польскага чытача ў праблематыку гісторыі і сучаснага стану беларускай літаратуры. Падкрэсліваючы традыцыйную блізкасць яе да літаратуры польскай, Ян Гушча адзначае дружбу лепшых прадстаўнікоў дзвюх братніх славянскіх культур, дружбу, якая прайшла праз стагоддзі.

Мэтай складальніка было паказаць як мага больш поўна і прадстаўніча нашу паэзію XX стагоддзя. Задача не з лёгкіх. І Я. Гушча з уласцівай яму сціпласцю прызнаецца ў прадмове, што анталогія не можа быць здавальняючай і з-за абмежаванасці ў аб'ёме, і з-за цяжкасцей у выбары таго ці іншага паэта, і з-за суб'ектыўнасці ў выбары твораў. Але, аддаючы належнае патрабавальнасці складальніка, скажам, што анталогія атрымалася па-сапраўднаму прадстаўнічай — у ёй пададзена творчасць 49 беларускіх паэтаў розных пакаленняў — ад Янкі Купалы і Максіма Багдановіча да Алены Руцкай і Людмілы Забалоцкай. Вершы перакладалі 30 паэтаў і перакладчыкаў.

Зразумела, Ян Гушча абапіраўся на выдадзеную ў нас трохтомную «Анталогію беларускай паэзіі», але ў яго свой пункт гледжання, і польскае выданне не паўтарае нашага ні ў падборы перакладзеных вершаў, ні ў выбары імён —ужо хоць бы таму, што за дзесяцігоддзе, якое прайшло паміж гэтымі анталогіямі, вырасла новае пакаленне паэтаў.

Разумеючы, што творчасць паэта не можа быць з дастатковай паўнатой ахарактарызавана аднымдвума вершамі, Я. Гушча больш шырока падаў паэзію чатырох нашых аўтараў — Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Максіма Танка і Рыгора Барадуліна. Пра апошняга ён зазначае: «З той прычыны, што і ў нас «вясковая тэма» займае многа ўвагі, можна думаць, што ў паэме Барадуліна польскі чытач знойдзе нейкія паралелі да гэтай праблематыкі».

Ацэньваючы беларускую паэзію ўвогуле, складальнік прызнаецца, што «паэзія гэта ўзбагачае як зместам, так і формай», і таму ён хацеў «запэўніць самыя розныя перажыванні і ўзрушэнні, выяўленыя рознымі паэтычнымі сродкамі — гэта значыць ахарактарызаваць агульную карціну сучаснай беларускай паэзіі».

Можна смела сказаць, што складальніку многае ўдалося. Адзначаем гэта мы, адзначаюць і нашы польскія сябры. У рэцэнзіі на анталогію штотыднёвік «Культура» пісаў:

«Анталогія, на нашу думку, уяўляе сабой добрасумленна зроблены агляд беларускай паэзіі. Яна не засяроджваецца на творчасці некалькіх найбольш вядомых пісьменнікаў, такіх, як хоць бы Колас ці багата перакладзены ў Польшчы Максім Танк. Наадварот, яна прадстаўляе многіх паэтаў, паказваючы тым самым своеасаблівую разнастайнасць мастацкіх тэндэнцый, уласцівых імённа сучаснай беларускай паэзіі... Анталогія мае значную інфармацыйную вартасць. Яна пашырае далягляды ведаў польскага чытача, звяртае ўвагу на з'явы, якія ён даволі часта не ўсведамляў, ды, зрэшты, і не мог усведамляць з прычыны невялікай колькасці перакладаў з беларускай паэзіі. Пасля вайны ў польскім перакладзе з'явіліся толькі два томікі — Янкі Купалы і Максіма Танка».

А. ВАСІЛЕНКА.

...І

Рыгор ШЫРМА

АД НІЎ БЕЛАРУСКІХ

СЁЛЕТА сусветная грамадскасць адзначала стагоддзе з дня смерці кампазітара Станіслава Манюшкі. У нас, беларусаў, да гэтага музыканта ёсць своеасаблівы сентымент. Бо не адна мелодыя, народжаная яго талентам, убірае ў сябе напевы нашага краю, народных спеваў нашых. Можна смела сказаць, што мы гартаем сёння творы С. Манюшкі з пачуццём удзячнасці і пашаны.

Беларуская зямля, пазначаная сотнямі рэк і азёраў, над якімі на высокіх прасторах узнімаюць гордыя вершаліны дрымучыя бары і лясы, падшытыя дыванамі верасу і папараці, — гэтая зямля на працягу стагоддзяў была калыскай, адкуль не адзін вялікі паляк пачынаў сваё вандраванне па жыцці.

Тут, на нашай зямлі, малы засценак Марачоўшчына пад Косавам даў Польшчы славутага Тадэвуша Касцюшку, імя якога стала несмяротным сімвалам мужнасці польскага народа.

На Навагрудчыне расквітнеў паэтычны геній Адама Міцкевіча, найвялікшага польскага паэта—рамантыка, палымянага барацьбіта за свабоду свайго народа, за грамадскі прагрэс.

Прадстаўнікі рамантызму — як літаратары, так і музыканты — звярнуўшыся да народнай творчасці, узбагацілі мастацтва новымі тэмамі, ідэямі, фарбамі. Чачот, Зан, Адынец, а перад усім Міцкевіч поўнай жменяй чэрпалі са скарбніцы беларускай народнай паэзіі, якую добра ведалі, бо выхоўваліся ў беларускім асяроддзі. Сярод польскай моладзі ў Віленскім універсітэце беларускія песні карысталіся вялікай папулярнасцю. Захаваліся, напрыклад, звесткі аб тым, што любімай песняй Міцкевіча была беларуская «Ой, лянела цяцера ды цераз лес».

З беларускай зямлёй цесна звязаны лёс Ул. Сыракомлі, Э. Ажэшкі, М. Карловіча.

Гісторыя захавала многа прыкладаў, якія сведчаць аб вялікай дружбе паміж славянскімі народамі. Адзін з іх — збліжэнне Міцкевіча з перадавымі рускімі літаратарамі, у прыватнасці—з А. Пушкіным.

ХЛАПЕЧЫЯ ГУЛЬНІ

Войцех ЖУКРОЎСКІ

Аўтар апавядання — вядомы польскі празаік — прымае ўдзел у Днях польска-савецкай дружбы і польскай культуры ў Беларусі.

Хлапчукі сабраліся ля саду. Санлівая цішыня восеньскага адвячорка ўжо ахінула яго шызаватай смугой. Гулі восы. Яны прыпадалі да патрэсканых сліў, смакталі сок.

З саду цягнула церпкім водарам пераспелых груш. Але да іх цяжка было дабрацца. Дрэвы даводзілася трэсці, грушы, падаючы, біліся аб голле, і з іх бруіўся сок. Хапчукі прагна ўпісвалі іх, схіліўшы набок галовы, ласаваліся салодкім сокам.

Часам у разлеглай цішыні, якую толькі час ад часу парушалі дзікія качкі ў прыбярэжным сітоўі, чуўся нечаканы пляск. Гэта спелая груша, перамераўшы ўсю даўжыню пабеленага ствала, разбівалася на вытаптаным дзірване, ператвараючыся ў жменьку залацістай кашкі. Але гэты ласунак ужо даставаўся матылькам-жалобнікам...

А хлапчукам — сваё. Рыжы Вацак, сын садоўніка, сеў, падабраўшы ногі, і, мармычучы нешта пад нос, лушчыў падзяўбаны курамі круг сланечніка. Ад семачак яго пальцы і вусны былі фіялетавыя; Вацак дзіравіў цвіком дно бляшанкі, рыхтуючы на вечар кадзільніцу для Юркі. Грыцько, самы старэйшы, засунуўшы за надарваны рамень кароткую пугу, ляжаў у сухой траве — ён да млоснасці аб'еўся грушамі-падаліцамі і цяпер цяжка дыхаў, пазіраючы на воблакі.

Толюсь прыглядаўся да яго з бяздумнай і блазнаватай задуменнасцю. Падпёршы галаву далонямі, ён ляжаў на жываце і боўтаў босай нагой. Побач на кійку сохла вымытая сандалька: у гульні ён не заўважыў, як па костачкі залез у каровін бліп.

Яго, найменшага, бралі гуляць толькі з ласкі, ашуквалі ў лічылках, прымушалі рабіць найгоршае. Звычайна ён першы жмурыўся, заўсёды быў жандарам, калі разбойнікі разбягаліся па кустах і хаваліся за каменнямі, чакаючы, пакуль пагоня не адыдзе далей.

— Іду-у-у шу-у-укаць! — крычаў ён, прыкладваючы далоні да вуснаў.

Ён разгублена азіраўся па баках... Яшчэ калыхаліся галінкі ракіты, яшчэ не аціх тупат задубелых пятак, а наўкола ўжо было пуста. Усе сталіся. У далечыню цягнуліся хвалістыя ўзгоркі, якія пераходзілі ў мокры луг. На ружовым небе цямнеў, нібы вежа, Астапкаў востраў.

Асцярожна, зігзагамі, ён пачаў пошук. Нечакана паміж кустоў і конскага шчаўя імкліва вывалілася ўся чародка. Захлынаючыся паветрам, яны імчаліся наперагон адзін аднаму, потым падалі на траву і доўга адлежваліся, супакойваючы шалёную калатню сэрца, а то раптам падавалі сябрам фальшывы сігнал і заходзіліся ад смеху, калі Толюсь іх застукваў.

Цяпер яны сядзелі і чакалі, які план ім прапануе Грыцько. Малы Юрка, сын праваслаўнага свяшчэнніка, наморшчыўшы лоб, выцягваў з пяткі стрэмку, выціраючы кроў лістамі падарожніка.

— Можа, згуляем, хлопцы, — азваўся, нарэшце, Грыцько.

— Замала нас, — фыркнуў Вацак, лускаючы семачкі.

— Я не магу бегаць, — уздыхнуў Юрка, — кульгаю...

— Ужо нарывае ці толькі баліць?

— Баліць, на нагу не ступлю...

— То надзень мае сандалі, — ахвяраваў Толюсь.

— Замалыя мне...

Але калі прымераў, то выявілася, што сандалі акурат.

— Ну, цяпер — іншая справа...

— Трэба мяч надзьмуць. — Грыцько павярнуўся на бок і выцягнуў з кішэні штаноў згнечаны шматок анучы.

Яны рушылі. Нарвалі сухой травы і пачалі набіваць ёю залапленую шкарпэтку. Футбольным полем у іх была пляцоўка на схіле ўзгорка, непадалёк ад падмуркаў закінутай будоўлі. Вароты абазначылі шапкамі.

У варотах паставілі Юрку, а Толюся Грыцько паставіў у правыя нападаючыя. За каменным падмуркам хаты, у круглаватым паглыбленні таілася студня, нядбала выкапаная і абшаляваная спарахнелымі дошкамі. У асеннюю слату пастухі іх павыдзіралі і спалілі. Дол чарнеў паміж кудламі аслізлай асенняй травы.

Грыцько свіснуў прарэзліва, аж залапаталі

У галіне музычнай культуры збліжэнню польскага і рускага народаў садзейнічалі Глінка, Даргамыжскі, Сяроў, Кюі і — Станіслаў Манюшка.

С. Манюшка нарадзіўся ў 1819 годзе ў невялікім маёнтку Убель на Міншчыне. У процілегласць Шапэну, музычная слава якога расквітнела ўжо ў дзяцінстве, станаўленне Манюшкі як кампазітара адбывалася павольна. Малы Манюшка не належаў да так званых «вундэркіндаў», аднак музыка з дзяцінства вабіла яго больш за ўсё.

Першыя настаўнікі Манюшкі — Фрэер з Варшавы і Стэфановіч з Мінска — не заўважылі «божай іскры» ў сваім выхаванцы, як, дарэчы, і берлінец Рунгенгаген, у якога Манюшка вучыўся ў 1837—40 гг. Але сам Манюшка вырашае цалкам прысвяціць сябе музыцы. Для будучага кампазітара гэта былі гады ўпартай працы: знаёмства з тэорыяй музыкі, правіламі кампазітарскага мастацтва, блукання па таямнічых лабірынтах гармоніі і кантрапункту.

У 40-х гадах Станіслава Манюшку звязвае блізкае знаёмства і з першым беларускім прафесійным пісьменнікам В. Дуніным-Марцінкевічам. Знаёмства, а пазней і творчае супрацоўніцтва гэтых двух прадстаўнікоў беларускай і польскай культур прыносіць багаты плён: нараджаюцца опера «Сялянка» і дзве аперэты — «Рэкруцкі набор» і «Спаборніцтва музыкаў». Да нашага часу, на жаль, захаваліся толькі асобныя фрагменты «Сялянкі», рукапісы «Рэкруцкага набору» і «Спаборніцтва музыкаў» загінулі.

Жывучы на Беларусі, таленавіты Манюшка ў сваёй творчасці не мог пазбегнуць уплыву беларускага народнага мелаcу: у песнях і асабліва ў оперы «Фліс» («Пыльтагон») такое багацце песенных і танцавальных народных інтанацый, што часам ствараецца ўражанне, нібы ты недзе пад Слуцкам або каля Мінска прысутнічаеш на народным свяце.

Творчасць Манюшкі стала якасна новым этапам у польскай музыцы, асабліва ў галіне інструментальна-вакальных форм. Народны характар яго твораў праяўляецца як у падборы тэм, так і ў артыстычным выкарыстанні мелодый народных песень і танцаў. Музыка гэтая адыгрывала сваю ролю ў тагачасным прагрэсіўным руху, будзіла сацыяльную свядомасць, выклікаючы сваім зместам, багаццем і разнастайнасцю мелодыкі захапленне тагачасных музыкантаў, у першую чаргу рускіх. Пазнаёміўшыся з «Першым хатнім спеўнікам» Манюшкі, А. Сяроў пісаў, што без вялікага роздуму можа залічыць песні, напісаныя Манюшкам, да найлепшых узораў гэтага музычнага жанру — жанру, прадстаўнікамі якога ў Германіі былі Ф. Шуберт і Р. Шуман, а ў Расіі—М. Глінка і А. Даргамыжскі.

Калі ідзе гаворка аб кантактах і дружбе славянскіх народаў, аб ролі ў гэтым працэсе Манюшкі, можна прыгадаць і аб тым, з якім поспехам прайшла ў 1860 годзе прэм'ера песмяротнай «Галькі» ў Пражскай оперы, аб тым, з якім захапленнем і энтузіязмам гэты спектакль падрыхтаваў і бліскуча дырыжыраваў ім вялікі чэх—Бедржых Сметана. Музыка Манюшкі паказала свету прыгожую, мужную і разам з тым лірычную душу польскага народа, паказала гарачае, напоўненае любоўю да людзей сэрца такога абаяльнага і сціплага ў жыцці аўтара.

Глыбокай павагай, разуменнем і поспехам карыстаецца творчасць Манюшкі ў Савецкім Саюзе. У нашай памяці жыве незабыўная пастаноўка оперы «Страшны двор» у Мінску. У выдатным выкананні беларускіх майстроў гэтая опера была паказана падчас Дэкады беларускага мастацтва на сцэне Вялікага тэатра ў Маскве і атрымала высокую ацэнку як гледача, так і маскоўскай крытыкі.

Сёлета па II фестывалі польскай музыкі выконвалася таксама і «Байка», якая з вялікай цеплынёй была ўспрынята маскоўскай публікай.

Некалькі слоў аб манюшкаўскіх традыцыях — выкарыстанні народнага меласу, яго шырокай папулярызацыі.

Шматлікія польскія выканаўцы, сярод іх многія з сусветнымі імёнамі, далі магчымасць пазнаёміцца з цудоўным талентам свайго кампазітара шырокай аўдыторыі слухачоў розных краін.

Калектывы «Шлёнск» і «Мазоўша» з'яўляюцца жывым прыкладам трываласці манюшкаўскіх традыцый, творчага выкарыстання народных крыніц. Аб гэтым гаворыць у адной са сваіх кніг мастацкі кіраўнік «Шлёнска» прафесар С. Хадына: «Мы прадстаўляем фальклор, які існуе, і народ, які таксама існуе. Мы працягваем і дабудоўваем народную фантазію на вялікай прасторы. Ствараем новую рэчаіснасць, якая, нібы з зерня, вырастае са старога».

З юнацкіх гадоў назаўсёды звязаў я сваё жыццё з роднай песняй. І мой жыццёвы вопыт умацаваў мяне ў глыбокім перакананні, што толькі на ніве народнай вырастае цудоўны плён, імя якому народная музыка, народнае мастацтва і культура.

Прыкладам такой менавіта доўгай натхнёнай працы і была творчасць вялікага польскага кампазітара Станіслава Манюшкі.

ВАЧЫМА СЯБРОЎ

НЕ ПЕРШЫ раз у Мінску экспануюцца работы польскіх мастакоў. І кожная сустрэча нязменна адкрывае нам нешта новае ў творчай лабараторыі нашых сяброў, новыя задумы. Вось і гэтымі днямі ў Мінск паступіла 80 работ польскіх майстроў выяўленчага мастацтва.

Учора з удзелам прадстаўнікоў Міністэрства культуры БССР, Саюза мастакоў БССР, Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі, Беларускага аддзялення таварыства савецка-польскай дружбы адкрылася выстаўка жывапісу і графікі «Савецкі Саюз вачыма польскіх мастакоў». Выстаўка гэтая — адно з важных мерапрыемстваў Дзён савецка-польскай дружбы і польскай культуры ў БССР, якія пачаліся 20 і працягнуцца да 25 ліпеня бягучага года.

Выстаўка дае багатае ўяўленне аб тым, як успрымаюць польскія мастакі жыццё і працу савецкіх людзей. У работах шырока адлюстраваны знакамітыя куткі нашай неабсяжнай Радзімы. Гэта — Масква і Ленінград, Урал і Узбекістан, Далёкі Усход і сонечны Каўказ...

Прываблiваюць жывапісныя работы Веслава Гарбалінскага «Конная разведка», «Партрэт героя», «Нацюрморт», Юліуша Краеўскага «Кедры над Байкалам», «Ленінград», Браніславы Велімоўскай «Масква — Астанкіна», «Ленінград. Зімні палац», «Байкал. Порт», Казімежа Шрамкевіча «Ленінградская філармонія», а таксама архітэктурныя помнікі ў Пскове, Кіжах, Загорску Магдалены Спасовіч, Уладзімежа Закжэўскага.

Багаты раздзел графікі. Спыняешся ля работ Яцэка Рыбчыньскага з цыкла «Ленін», Стэфана Дамскога «Электрыфікацыя Краіны Саветаў», «Ідэя, пераўтвораная ў жыццё». Цікавая па задуме яго серыя «З паездак па СССР». Прыцягваюць увагу афорт «Ленін» і каляровая лінагравюра «Улада Саветам» Бянона Ліберскага, літаграфія «Апафеоз» Мацея Мадзалеўскага, «Залп Аўроры» (тэмпера) Зігмунта В. Гурніцкага і шэраг іншых работ.

Сёння ў Палацы культуры прафсаюзаў адкрываецца выстаўка вырабаў народнай творчасці Польскай Народнай Рэспублікі, а ў акруговым Доме афіцэраў — выстаўка кніг выдавецтва міністэрства нацыянальнай абароны ПНР і польскага плаката. У Доме мастацтваў наладжана выстаўка работ мастацкай фатаграфіі нашых польскіх сяброў.

ПАДАРУНАК Януша ПШЫМАНОЎСКАГА

Генерал Драйчук, ураджэнец в. Ржаўка Слаўгарадскага раёна, вызваляў Польшчу, змагаўся ў Германіі, удзельнічаў у разгроме японскіх мілітарыстаў у Кітаі.

Пасля вайны Якаў Іванавіч падарыў роднай вёсцы вялікую бібліятэку. Сярод кніг былі творы вядомага польскага пісьменніка і актыўнага ўдзельніка барацьбы з гітлераўскімі захопнікамі Януша Пшыманоўскага, аўтара рамана «Студзёнкі», чалавека, чые подзвігі ўвекавечаны ў тэлефільме «Выклікаем агонь на сябе».

Калі мы, два гады назад, адбіралі рэчы і дакументы для нашага музея ў падмаскоўнай кватэры генерала Драйчука, дык міжволі звярнулі ўвагу на невялікую кніжачку, падобную на альбом з тэкстамі. Гэта было першае польскае выданне сцэнарыя шматсерыйнага тэлефільма «Чатыры танкісты і сабака». Мы ведаем, што аўтар сцэнарыя—Януш Пшыманоўскі. Але нас зацікавіў даравальны надпіс. Па-руску было напісана: «Якаву Іванавічу Драйчуку, каб лягчэй было фільм успамінаць». А ніжэй подпіс і дата: 23.02.1968 года—дзень 50-годдзя Савецкай Арміі, калі наш польскі друг быў госцем Масквы.

М. МЕЛЬНІКАЎ,
дырэктар Крычаўскага музея.

САВЕЦКАЯ ПЕСНЯ НА БЕЛАСТОЧЧЫНЕ

Жыхары Беластоцкага ваяводства (ПНР), сярод якіх значная частка беларусы, — шчырыя прыхільнікі савецкай песні. Вось ужо адзінаццаты раз ваяводскае праўленне Таварыства польска—савецкай дружбы ў Беластоку правяло конкурс самадзейных аматараў на лепшае выкананне савецкай песні, і кожны раз колькасць удзельнікаў конкурсу павялічвалася.

Сёлета было іх амаль 4 тысячы. Пасля ўступнага адбору да раённых спаборніцтваў было дапушчана 385 спевакоў-аматараў, а ў ваяводскіх спаборніцтвах прымала ўдзел 64 спевакі.

Чарговы, XII конкурс савецкай песні арганізатары рашылі прысвяціць слаўнаму юбілею — 50-годдзю ўтварэння СССР.

У гэтым жа дні да нас прыязджалі самадзейныя артысты з Беларусі. Яны падрыхтавалі да сустрэчы таксама і польскія песні і танцы. Слухачы горача прымалі сваіх гасцей — Дзяляцінную народную харадую капэлу калгаса «Сцяг Саветаў» і народны ансамбль танца «Раніца» Гродзенскага палаца культуры тэкстыльшчыкаў.

В. РУДЧЫК.
Беласток.

крыллем курапаткі, узнімаючыся ў паветра з травы. Яны праляцелі нізка над цярноўнікам і бязгучна зніклі ў першых палосах восеньскага ворыва.

Хлапчукі заялла ганялі мяч, збілі з ног і павалілі Толюся. Пад радасныя крыкі, падскокваючы ў паветры, мяч ляцеў на Юрку, які стуліўся ў чаканні.

— Бліжэй нельга! — перасцярожліва крычаў ён, абапіраючыся рукамі на калені, але Грыцько імчаўся, як вецер. Мяч апісаў дугу, праляцеў над выцягнутымі рукамі варатара і — пакаціўся па адхону.

— Трымай, скоціцца!..

А мяч каціўся, набіраючы хуткасць, падмінаючы купкі травы. Здавалася, што ён вось-вось затрымаецца ў травяным гняздзе, ды не, ён, нібы спалоханая жаба, скачучы па зямлі, кіраваўся на дно варонкі.

Юрка гнаўся за мячом пад заахвочвальныя воклічы сяброў.

— Ой, глядзі, брат! — перасцярог Грыцько.

Але хлопчык ужо зразумеў, што прыпыніцца будзе цяжка. Ён прысеў, ды выслізганыя падэшвы сандаляў цяпер самі цягнулі яго ўніз.

— Я не хачу! Я не-е-е-е...

Ён хапаўся рукамі за траву, але яна выдзіралася з зямлі жмуткамі, нібы лінялая поўсць. Ён з'язджаў на пятках. Раптам перакуліўся і знік у студні. Гучна плюхнула вада.

— Юрка! Юрка! — зваў, нахіліўшыся над студняй, Грыцько.

На паверхні вады расплылася шырокая пляма, як ад нафты.

— О, божа, утапіўся, — залемантаваў Вацак.

Скамянеўшы, яны глядзелі на ваду.

— О, божа...

Толькі Грыцько не разгубіўся і паімчаўся да аратых. Сяляне адпялі лейцы і пабеглі да студні, спатыкаючыся на свежаўзараных скібах зямлі.

Грыцька апаясалі лейцамі, чапляючыся пальцамі за дошкі, выгнутыя пад напорам зямлі, ён спускаўся ў замшэлую пашчу. Часам жменька жвіру асыпалася, і па вадзе ішлі кругі. Тады ў хлопцаў поўзалі мурашкі па скуры.

— Наверсе яго няма, — прагучала з глыбіні.

— То нырай, — падахвочвалі сяляне, — рамяні ўтрымаюць... А вы, малыя, падалей адсюль, бо яшчэ бераг асунецца і вы ўваліцеся...

— Праглыне, як сабака муху!

Грыцько завагаўся над самай паверхняй вады і, расставіўшы ў бакі ногі, аж трымцеў ад напружання. Ды вось ён перажагнаўся, заціснуў у кулак нос і скочыў нагамі ўніз у ваду.

Праз хвіліну ён вынырнуў.

— Знайшоў, цягніце...

Сяляне асцярожна пачалі падбіраць лейцы. Яны нахіліліся над студняй і памаглі выцягнуць цела, з якога струменіла вада. Грыцько вылез услед, атрэсваючыся, як сабака, скінуў штаны і адціснуў валасы. Ён дрыжаў усім целам...

— Вада, нібы лёд, мусіць, там б'е крыніца.

Сяляне пачаставалі яго самакруткай, ён ганарліва курыў, неспадзявана залічаны ў лік дарослых.

Юрку паклалі на адхоне, галавой уніз, расчапілі сашчэмленыя зубы. З роту пацякла тарфяністая вада. Сагнутым пальцам вышкрабалі з роту глей.

— Гатоў, — дзелавіта вымавіў вусаты.

— А ты на рэбры націсні...

— Трэба яго на прасціну і падкідваць, — раілі нечыя галасы ўпоцемку.

— Не паможа, паглядзіце, як ён рэзнуўся, аж цвік у цемя ўбіла...

— Даўно ўжо трэба было засыпаць гэтую студню...

— Калі што каму наканавана, то хоць на край свету ўцякай...

Некаторыя пачалі выварочваць з падмурка вышчарбленыя камяні і са злосцю кідаць іх у змрочную тонь.

— На, удавіся! — крыкнуў Грыцько.

Толюсь укленчыў і зняў з ног тапельца мокрыя, забруджаныя сандалі.

Яны ішлі ў вёску, везучы цела на голых дошках воза. Ад выцертага на чарназёме лемяха на лоб тапельца падаў слабы водбліск. Неба зацягнула хмарамі. Статак кароў вяртаўся з пашы, запахла малаком і гноем.

Побач з возам бег Вацак і круціў на дручку бляшанку, у ёй смылела сухая трава, і ў цемры мігцелі чырвоныя кругі.

Далёка на ўзгорках таксама мігцелі гэткія ж кругі, і ў паветра ўзляталі іскры, адтуль даносіліся працяглыя, жаласныя галасы пастухоў.

— Не круці, кінь, гэта ж яго кадзільніца, — нагадаў Толюсь.

— Ну і што? Ён і так даў бы мне пакруціць! А ты не вельмі ганарыся, бо каб не твае дурныя сандалі, ён бы папэўна ўтрымаўся. Знайшоўся мне добранькі!

Толюсь трымаў у руцэ канцы слізкіх раменьчыкаў, з сандаляў капала вада. У глыбокім маўчанні, не звяртаючы ўвагі на сяброў, ён павярнуў да варот парку і знік за стайняй.

У маленькай пабеленай хатцы на зэдлічку сядзела каля печы Марта. Яна ламала аб калена сухое голле і падкідвала яго ў агонь.

— А, гэта ты, — не адразу пазнала яна, аслепленая зыркім полымем.

Ён маўчаў, шмыгаючы носам.

Яна, ахопленая раптоўным прадчуваннем, пяшчотна спытала:

— Ну, што табе гэтыя благія хлапчукі зрабілі? Пабілі?

Тады ён ступіў яшчэ крок і асунуўся перад ёй на калені. Утуліўшы твар у яе шорсткія, нагрэтыя агнём далоні, хлопчык расплакаўся.

— Скажы, што гэта не я, — маліў ён, — ну, скажы, што не я...

Пераклаў з польскай А. МАЖЭЙКА.

ДЫСКУСІІ
На парадку дня:
ПРАБЛЕМЫ ПАЭЗІІ

Мікола АРОЧКА

ПА РАХУНКУ ВЫСОКАЙ

ЗА КРУГЛЫМ сталом «ЛіМа» — зноў спрэчкі, сур'ёзнае абгаварэнне, праблем нашай літаратуры. На гэты раз — сфера тонкай, ідэальнай формы служэння слова — паэзія. Уражанне: быццам гэта працяг папярэдняй шырокай дыскусіі, якую не так даўно з добрым плёнам правяла наша крытыка. Праз увесь «Дыялог», якім распачата новая дыскусія, праходзіць найбольшым клопатам тая ж праблема, што стала, па сутнасці, асноўнай у літаратуры, — праблема высокай змястоўнасці, грамадзянскасці. Катэгорыя грамадзянскасці сёння пачала абдымаць і моцна трымаць у сваім прыцяжэнні мноства пытанняў тэорыі і практыкі мастацкага слова, прыроды таленту і творчай асобы, творчай пазіцыі. Адбыўся відавочны зрух у важкасці гэтай праблемы, якая, нібы планета, выплыўшы з паласы туманнасці, на вачах прыбывае ў масе і абумоўлівае рух іншых планет.

Дыялог В. Бечыка з А. Вярцінскім («ЛіМ», 23 чэрвеня г. г.) атрымаўся важкі, бадай, «асновапалагаючы», пазначаны сталасцю крытычнай думкі, погляду на патрэбы сённяшняй паэзіі. Праўда, чытаецца ён як цэласны артыкул — відаць, зашмат у ім узаемнай дапасаванасці, папярэдняй узгодненасці і здагадлівага ківання галавой. І чаго яшчэ не хапае гэтаму дыялогу — спраецыраванасці многіх зусім правільных палажэнняў на сённяшні літаратурны працэс.

Як вядома, мінулае дзесяцігоддзе, асабліва ў першай палове, не збаўляла, а яшчэ нарошчвала актывізацыю ўнутраных сіл многіх паэтаў, якія набылі нібыта сваё другое творчае дыханне — дыханне часу. Наша паэзія набрала такую якасна новую вышыню грамадзянскай і творчай культуры, што магла смела станавіцца ўпоравень з мастацкім плёнам суседзяў, з паэтычнымі дасягненнямі часу. На прасторах савецкай паэзіі на поўны рост узняліся постаці М. Танка і Э. Межэлайціса, П. Броўкі і М. Рыльскага, А. Куляшова і Р. Гамзатава, Л. Мартынава і П. Панчанкі, К. Кулієва і А. Пысіна.

А следам, наступаючы «на пяткі», напірала шумліва-неўтаймаваная генерацыя маладзейшых... Цікава, што якраз дзесяць гадоў назад, пад час вострай «лімаўскай» дыскусіі вельмі дарэчы з'явіліся з-пад пяра П. Панчанкі гарачыя радкі аб адзінстве, аб адной «заквасцы» двух творчых пакаленняў: «Гэта не двух пакаленняў сварка, гэта эпохі гарачая зварка». Моладзь, якая сягала ў глыбіню грамадзянскіх пачуццяў, і сапраўды ўбачыла, што ёй зусім па дарозе з тымі, хто быў здольны на якасна новае творчае абнаўленне, хто бескампрамісна і мужна загаварыў з сабой і з часам. «Мы з аднаго ваяўнічага цеста», — як бы ў жарт гаварыў Панчанка. Па ваяўнічай напорыстасці, па атакуючавыкрывальным запале нашы маладзейшыя — Вярцінскі, Барадулін, Гілевіч — тады, бадай, не ўступалі гэткай жа баявітай кагорце сваіх равеснікаў, скажам, ва ўкраінскай паэзіі — В. Сіманенку, М. Вінграноўскаму, І. Драчу або ў літоўскай паэзіі — Ю. Марцынкявічусу, В. Шымкусу...

У найбольш яркіх постацей з гэтага, сёння ўжо творча сталага пакалення — каго б мы ні ўзялі: Вярцінскага, Еўтушэнку, Тэлеукэ — узнікла нямала граняў вельмі блізкага па сваёй прыродзе свячэння таленту — гэта няўтольная прага прыпасці мужнасцю свайго радка да самых набалелых праблем сучаснасці і да свайго грамадскага сумлення. Здзіўляе іх душэўная ранімасць, абвостраная ўспрымальнасць і рамантычна-страснае парыванне — адкрываць і абераццa у чысціні сваё «высокае неба ідэалу».

Цяпер перавядзем наш позірк на самы пярэдні план паэтычнай панарамы — у сённяшні дзень паэзіі. Відаць, мае рацыю В. Бечык, калі кажа ў сваім падагульненні: «...Наша паэзія ў многіх выпадках здае грамадзянскія і творчыя пазіцыі. Рэдка трапляюцца творы, дзе знойдзеш новую тэму, убачыш новы зрэз жыццёвай праблемы, уразішся пранікліваму позірку ва ўнутраны свет сучасніка...»

Як ні горка вымаўляць такія словы, але пра тое, што сталася фактам, іначай не скажаш. Горка тым болей, што ў нашых суседзяў — у рускай, украінскай, літоўскай, латышскай, нарэшце, малдаўскай паэзіі — паэтычныя справы, трэба прызнаць, ідуць у апошнія гады куды лепш, чым у нас. Грамадзянская паэзія нашых суседзяў стараецца не здаваць сваіх пазіцый — яна інтэнсіўна шукае і абжывае новыя формы і шляхі грамадзянскага пранікнення ў жыццё. Вось два характэрныя загалоўкі палемічных артыкулаў аб творчасці М. Вінграноўскага на ўсю паласу «Литературной газеты» (29 сакавіка 1972 г.): «Збядненне палітры?..», «Не, узбагачэнне» — як бачыце, не аб спадзе гаворка, а пра ўзбагачэнне... (Міжволі прыкідваеш: хто з маіх равеснікаў-паэтаў «цягне» на арэну такой маштабнай гаворкі — Барадулін? Макаль?..). А вось у руках свежай фарбай пахне важкі том І. Драча «До джерел» — як непаўторна зайграла тут у глыбокіх пералівах сэнсу арыгінальна абжытая форма балад, алегарычна ёмістых, невычэрпна шматзначных... Не менш мяке ўразіла нядаўна апублікаваная ў «Дружбе народов» драматычная паэма «Міндаўгас» Ю. Марцынкявічуса, паэта магутнага эпічнага таленту, які ўмее нават у гістарычным палатне заставацца ў межах сілавога поля злабадзённых канфліктаў і праблем.

У народзе кажуць: трасі, як грушу, любі, як душу. Прашу зразумець маё крытычнае стаўленне да сённяшняй паэзіі. Гэта мне нічуць не перашкаджае добра ўсведамляць яе дасягненні. Калі прайсціся па-гаспадарску, ашчадна, не раскідаючыся, як кажуць, хлебам, то знойдуцца і ў нас добрыя прыклады, нават узоры высока-эстэтычнага служэння многіх шчодрых талентаў — любога пакалення. Не буду паўтараць свае ацэначныя погляды, выказаныя неаднойчы ў гадавых аглядах паэзіі, а таксама высокія, заслужаныя, на маю думку, ацэнкі, якія робіць А. Лойка ў сваім аглядным артыкуле «На грані звычайнага і незвычайнага» («Неман», № 4, 1972). Крытыка не магла не заўважыць і не сказаць шчырае слова пра асобныя таленавітыя вершы М. Танка, П. Панчанкі, А. Пысіна, С. Дзяргая, К. Кірэенкі, У. Караткевіча, Я. Сіпакова. Добра сустрэты і паэмы «Блакада» Р. Барадуліна, «Мацярык маленства» В. Макарэвіча, «Сяліба» В. Зуёнка, а таксама апошняя, на маю думку, найбольш значная з'ява двух паэтычных год, паэма А. Куляшова «Далёка да акіяна». Праўда, вакол гэтай паэмы нечакана загарэўся сыр-бор — я маю на ўвазе нядаўні «лімаўскі» артыкул Н. Кісліка «Аб некаторых зігзагах эпічнай красамоўнасці» («ЛіМ», 2 чэрвеня г. г.), палемічна накіраваны супраць аўтара паэтычнага гадавога агляду А. Лойкі. Калі чытаў, падумалася: і было б тут з чаго раздзьмухваць полымя? Але ж, бывае, загараецца бор ад адной мімаходзь неасцярожна кінутай запалкі. У аглядным артыкуле Лойкі куляшоўскай паэме ўдзелена ўвагі да крыўднага мала — усяго некалькі абзацаў. Было б смешна, калі б аўтар на такой «плошчы» думаў пра паўнату ацэнкі! Захоплены сваёй даўняй ідэяй — магчымасцямі стварэння сучаснага эпасу, а такія магчымасці ў савецкай паэзіі, бадай, ужо ёсць, — А. Лойка рашыў зірнуць на шырокае, шматпланавае палатно куляшоўскай паэмы толькі ў адным ракурсе: наколькі яна адпавядае класічным нормам сапраўднай эпічнай паэмы. Пад рукамі ў аўтара твора быў жа такі ўдзячны матэрыял з «невычэрпнымі магчымасцямі эпічнага асэнсавання...»! Шкадаванне крытыка перарасло ў пэўную недацэнку твора — як паэмы не да канца рэалізаваных эпічных мажлівасцяў. Але сёння эпічны пачатак — хіба адзіная мера паэмы? Спрэчнасць такога падыходу відавочная, аднак Лойка мае рацыю ў адным пункце: рэалізацыя шырокай задумы А. Куляшову не скрозь удалася. Паэмная задума, структура, сюжэт, нават памер сутыкнуліся з цяжкасцямі пераадолення «супраціўлення» матэрыялу. Бурную хаду эпохі — у такім маштабным ахопе часу — відаць, нялёгка было асэнсаваць праз сюжэтна-псіхалагічны ўдзел галоўнага героя твора. Прыйшлося многія этапы гістарычнай памяці народа пераказваць бегла — для фону. Прыёмы мантажу, застаўкі, адступленні аказаліся не заўсёды ўнутрана злітыя з маналагічнай споведдзю асноўнага героя. І крытыка павінна ўдумна паставіцца да ўсяго гэтага, а не разводзіць уседаравальную апалогію, быццам многія пралікі і сур'ёзныя страты знанага паэта, бачыце, «больш цікавыя... за многія іншыя «дасягненні» сучаснай нашай паэзіі. Бясспрэчна, некаторыя думкі і «контрзакіды» Н. Кісліка можна прыняць, апрача аднаго — нявытрыманасці яго тону, нейкай зласлівасці, раздражнёнасці, якія так не пасуюць да сур'ёзнай гаворкі.

Гаворачы пра паасобныя творчыя ўдачы нашых паэтаў, мне, аднак, хацелася б у дыскусійным парадку па класці на «круглы стол», магчыма, спрэчнае меркаванне. Мяне трывожыць вось што: за апошнія пяць год наша паэзія не пераўзышла ўзровень, дасягнуты раней — грамадзянскай лірыкай і нашай паэмай. Не з'явілася за гэты час ніводнай паэтычнай кніжкі, якая б па гучанні дацягвалася, скажам, да зборнікаў М. Танка «Мой хлеб надзённы», «Перапіска з зямлёй», да «Новай кнігі» А. Куляшова, да кнігі П. Панчанкі «Пры святле маланак» — гэтых сапраўды «кнігаў кніг нашых».

Мы ведаем, што новыя кнігі спеюць і пішуцца ў Панчанкі, Вярцінскага, Макаля, але каторы ўжо год як мы чакаем ад іх чарговага паэтычнага падрахунку! Апынуўся ў стане назапашання, магчыма, і ўласнага перагляду Р. Барадулін. Шмат апошніх яго твораў пачалі не вытрымліваць павышанага крытэрыю патрабавальнасці. Дасціпна, скажам, назваць казу «малалітражнай каровай» або падмеціць, як за камароўскім прылаўкам дзяўчына на качарыжцы качана «цану вызначае хімічным алоўкам, нібы ў працвярэзніку нумар на пятцы». Але пасля таго, як пасмяешся з досціпу, мне заўсёды балюча было бачыць, як талент, абмінаючы важкае, набалелае, часам растрачвае сябе на дробязь, на каламбуры, забавы. Думаецца, што творчы вечар паэта, які адбыўся сёлета ў клубе Саюза пісьменнікаў, быў своеасаблівым падагульненнем першага этапу сталасці: каб ісці далей, паэту трэба ў нечым пераступіць праз сябе — у новую якасць...

Такім чынам, у абрысах нашай паэтычнай панарамы атрымалася не зусім суцяшальная карціна: гарызонт суседніх паэтычных краін аказаўся сёння значна вышэй нашага ўзроўню паэзіі, у выніку чаго яна часова як бы апынулася ва ўпадзіне. Я падкрэсліваю гэтае спадзяванне: часова. Каб спакойна, па-дзелавому разабрацца ў тым, што здарылася, патрэбна сур'ёзная, кваліфікаваная дапамога як з боку крытыкі, так і з боку вопыту нашых старэйшых майстроў слова.

Ужо самі нашы дыскусіі падказваюць, што выйсце да новых паэтычных шырот, бясспрэчна, — у павышэнні грамадзянскага тонусу нашай паэзіі, у пошуку новых формаў і шляхоў яе эстэтычна-змястоўнага служэння. Спрэчкі выяўляюць і іншае: відавочна, на шляху асэнсавання высокіх катэгорый грамадзянскасці і змястоўнасці паўсталі нейкія ўскладненні, суб'ектыўныя вытлумачэнні, а то і непаразуменні. Дужа шкодзяць, як мне здаецца, дзве няплённыя тэндэнцыі ў самім падыходзе да вызначэння катэгорыі грамадзянскасці. Адны настойваюць на звужэнні яе «параметраў»,

---

Васіль ЖУКОВІЧ

У ЯКІ СВЕТ ЗАПРАШАЕШ, ПАЭЦЕ?

Сваё выступленне я не хацеў бы будаваць на аснове спрэчкі з другім аўтарам, аднак такая неабходнасць з'явілася пасля знаёмства з артыкулам Алеся Марціновіча «А праўда пачуцця?», змешчанага ў нумары «ЛіМа» за 23 чэрвеня. Праяўляючы той жа клопат аб якасці паэзіі, і ў прыватнасці маладой, аўтар артыкула, на мой погляд, часам не дацягваецца да сутнасці і спыняецца на неістотным. Такім неістотным, па-першае, мне здаецца яго разважанне аб узросце пісьменніка, аб тым, як уплывае на якасць твораў позні або ранні ягоны дэбют. Вось у які пункт гледжання пераходзіць гэтае разважанне: «...як сведчаць жыццёвыя прыклады, больш познія зборнікі часта з'яўляюцца сапраўднай падзеяй у літаратурным жыцці. Успомнім заўчасна памёршага паэта Сымона Блатуна. Ён дэбютаваў у серыі «Першая кніга паэта». І было аўтару ўжо за трыццаць. Друкаваўся ён тады шмат, у тым ліку і ў тоўстых часопісах, але кнігу не спяшаўся выдаваць. Затое цяпер, калі чытаеш яго два зборнікі (адзін пасмяротны), адчуваеш, што гэта сапраўдная паэзія».

Калі не рабіць абагульнення і не ўстанаўліваць нейкай заканамернасці, прыклады можна прадоўжыць. Скажам, кніга «Песня пра хлеб» А. Вярцінскага ўбачыла свет, калі ае аўтару было 32 гады. М. Купрэеў выдаў свой першы зборнік «Непазбежнасць» у 30 гадоў. Запозненым быў і дэбют Ул. Караткевіча. Але яго «Матчына душа», як і «Песня пра хлеб» А. Вярцінскага і «Непазбежнасць» М. Купрэева, стала добрай з'явай, падзеяй у беларускай паэзіі.

Усё гэта так, але ці трэба тут рабіць націск? Вось жа і іншыя прыклады: Р. Барадуліну, Я. Сіпакову, Г. Бураўкіну, Ул. Паўлаву ў час дэбюту, таксама ўдалага, было па 24 гады, а Ю. Голубу, Р. Семашкевічу і А. Разанаву і таго менш. Аднак гэта не перашкодзіла ім таксама паспяхова і таленавіта заявіць аб сабе ў літаратуры.

І, урэшце, яшчэ адзін факт. Выдавецтва «Беларусь» выпусціла ў свет у мінулым годзе зборнік вершаў М. Мінчанкі «Зялёны звон», а сёлета — кнігу Г. Казака «З любоўю к людзям». Абодва аўтары не могуць паскардзіцца на сваю маладосць, жыццёвую нявопытнасць. Аднаму з іх — пад трыццаць, другому — за трыццаць. Аднак сталасць узросту не дапамагла ім выдаць арыгінальныя і змястоўныя кнігі...

Хай мне даруе чытач, што я заняўся далёкай ад тэмы справай — падлікам... Я гэта раблю, каб падкрэсліць, што якраз не трэба капацца ва ўзростах паэтаў, паколькі сама паэзія не мае ўзросту. Справа, відаць, у творчай сталасці. Гаворка павінна ісці не **аб узросце паэта, а аб яго творчым росце або таптанні на месцы**, аб таленце і натхненні, аб патрэбе ва ўласнай споведзі, **аб асобе паэта, яго духоўным свеце.** Дарэчы, такія пытанні і ўзняты ў дыялогу. Вось словы А. Вярцінскага з гэтага дыялогу: «...Паэт павінен мець «лица не общее выраженье», адрозніваццa сваім светам. Магчыма, у першай кнізе гэты свет будзе яшчэ толькі праглядвацца, толькі акрэслівацца, але ён абавязкова будзе. Паэт без свайго свету — гэта пасол без сваёй дзяржавы».

Свет паэта... Багаты духоўны свет Уладзіміра Караткевіча ўбачылі мы ўжо ў яго першай кнізе «Матчына душа», у тых, напісаных ледзь не гекзаметрам, баладах, а таксама ў лірычных вершах, накшталт «У векавечнай бацькаўшчыне клёны...». І няхай сабе па-рознаму сустрэлі яго крытыкі (некаторыя лічылі паэта архаічным, несучасным), а ён ішоў далей, узнімаўся вышэй, каб праз нейкі інтэрвал паказаць яшчэ больш складаны і прыгожы свет «Маёй Іліяды».

У добры свет з чалавечым даверам і любоўю, з мажорным настроем і ўсмешкай адразу павёў нас Ніл Гілевіч «Песняй у дарогу».

Захапіў чытача сваёй кнігай «Маладзік над стэпам» Рыгор Барадулін. Тэма цаліны была тады ў паэзіі ў поўным сэнсе «цаліннай», і яе паэт узняў умела, па-майстэрску.

Нешта значнае праглядвалася ў кнізе Янкі Сіпакова «Сонечны дождж». Адчувалася, што ў аўтара першай кніжкі ёсць пра што расказаць, і ёсць тыя паэтычныя сродкі, якія могуць прыцягнуць увагу чытача. І вось ягоння ў нашым актыве — «Веча славянскіх балад».

Магчыма, малавата ў свой час было сказана пра першую кнігу Анатоля Вярцінскага «Песня пра хлеб», але за гэтай кніжкай ужо адчуваўся арыгінальны, таленавіты паэт.

ЗМЯСТОЎНАСЦІ

другія—на бясконцым іх расшырэнні, адны чуюць яе пульс выключна ў публіцыстычнай страснасці, у адкрытых формах прамаўлення, другія гатовы ўключыць у яе сферу, бадай, усе паэтычныя жанры, у тым ліку і камерна-інтымную лірыку. Адсюль — «пагранічныя» канфлікты. Няйначай, канфлікты гэтыя маюць пад сабой рэальную глебу. Відаць, існуюць два розныя псіхалагічныя «полюсы» як у паэтычным, так і крытычным мысленні.

Успомнілася з гэтай нагоды рэцэнзія Г. Бураўкіна на выбраныя творы Н. Гілевіча («Полымя» № 10, 1969) —цікава, што ў вачах рэцэнзента найбольшую каштоўнасць набыла якраз гэтая якасць Гілевічавых вершаў — «адкрытая, ваяўнічая грамадзянскасць», якасць, дарэчы, вельмі блізкая творам і самога Бураўкіна. Мне таксама да спадобы гэтая якасць адкрытага страснага прамаўлення ў лепшых творах гэтых двух маіх равеснікаў. Але ж не трэба думаць, што гэта — адзіная і найвышэйшая каштоўнасць грамадзянскай паэзіі, што заглыбленне ў падтэкст, неадназначнасць намнога ўступаюць непасрэднаатакуючым формам, калі зло адкрыта называецца злом, дабро—дабром і г. д.

У дыскусійным артыкуле Ю. Свіркі («ЛіМ», 30 чэрвеня г. г.) таксама выступае супраць «вершаў-загадак, у якіх усё трымаецца на выбуховым падтэксце, на шматзначных намёках...» Шырмачкі і намёкі, вядома, не да твару сапраўднай паэзіі. Але ці варта зноў-такі браць пад абстрэл «выбуховасць падтэксту», мастацкую шматзначнасць? Калісьці вось гэтак жа і баечная алегорыя разглядалася не як эстэтычная катэгорыя, а спрычана—як нейкая дымавая заслона ад празорлівых вачэй... А між тым прырода шматзначнасці—у прыродзе самога мастацкага вобразу, у якім тоіцца безліч слоўных і асацыятыўных сувязяў. «Кожнае мастацкае слова...—пісаў Л. Талстой,—тым і адрозніваецца ад немастацкага, што выклікае незлічонае мноства думак, уяўленняў і тлумачэнняў». Дык не адбірайма ў грамадзянскай паэзіі права на шырокі мастацкі падтэкст!

Наколькі невычэрпныя і ёмістыя могуць быць іншасказальныя формы сцвярджэння і адмаўлення, добра пацвердзіць творчая практыка М. Танка, У. Караткевіча, Я. Сіпакова, ды і самога Ю. Свіркі.

Звужэнне формаў, а таксама тэматыкі і праблематыкі — няплённае, недапушчальнае для грамадзянскай лірыкі. Мяне, шчыра кажучы, падзівіла ў тым жа артыкуле Ю. Свіркі нейкая павярхоўная бесклапотнасць адносін да нашай святыні — лесу, асабліва вось гэтая спроба — крытычна высмеяць нашы трывогі за лёс таго зялёнага дрэва, што сёння ўжо асацыіруецца з дрэвам жыцця. У сваіх вершах паэт сам умее чуйна слухаць душу прыроды, тонка перадаваць боль за яе («не пачуць нікому ў бары, калі ў пяску карэнне задыхнецца»), але вось ён—ужо ў ролі крытыка — нечакана бянтэжыць мяне утылітарнасцю падыходу: «спелыя дрэвы выразаюць для людскіх патрэб, а на месцы іх растуць пасаджаныя». Нібыта нашы паэты і сапраўды выступаюць за тое, каб спелае дрэва не пускаць на падлогі, цымбалы, калыскі. Як быццам Танк, Панчанка, Пысін, Русецкі, Макаль, Зуёнак па-мастацку не давялі перад гэтым, што адвечная тэма — прырода і чалавек, чалавек і лес — у наш час павярнулася з плоскасці традыцыйна-інтымнага, натурфіласофскага асэнсавання ў сферу надзвычай надзённай грамадзянскай заклапочанасці. Ужо цяпер заўтрашні дзень чалавецтва ўсё больш адкрыта ставіцца ў залежнасць ад таго, наколькі мы навучымся, нарэшце, шанаваць і паважаць усё жывое ў прыродзе, наколькі ўсвядомілі «раўнапраўе дрэў і людзей». Нядаўняе пагадненне на вышэйшым узроўні аб ахове акаляючага нас асяроддзя вельмі своечасова пацвярджае, што праблема прыроды, у тым ліку і лесу, набыла сусветныя маштабы.

Звернемся, аднак, да другой трактоўкі грамадзянскага служэння паэзіі. Мне ўжо прыходзілася выказваць трывогу з гэтай прычыны: ці не размываецца ўсё больш паняцце грамадзянскасці, калі яе сёння стараюцца пашырыць на ўсе жанры і формы лірыкі без выключэння? Або—сілком падцягваюць да гэтай эстэтычнай катэгорыі ўсё, што нават не пазначана высокім зместам?

Цытую А. Вярцінскага: «Ужо тое, што яна (паэзія; далей падкрэслена мной.—**М. А.**)—**якая б яна ні была** — не можа выяўляцца інакш як праз слова, праз мову, якія, як вядома, з'яўляюцца і прадуктам і сродкам грамадскіх сувязяў, — ужо гаворыць пра яе грамадскае значэнне». Гэта аргумент першы. Мова — сродак грамадскіх сувязяў, значыць, і **любы** верш, які б ён ні быў — з'ява грамадскага парадку. Аказваецца — усё проста! Калі ласка — ледзь не універсальны крытэрый грамадзянскасці. Але тут дапушчана істотная падмена паняццяў: не ўсё грамадскае адэкватна грамадзянскаму. Паэзія з **такой шырокай формулай — якая б яна ні была** — ніколі не можа быць цалкам і заўсёды, у любых праяўленнях грамадзянскай па гучанні.

Аргумент другі: «Ды нават і той элементарны факт, што паэт чытае свой верш альбо друкуе яго, сведчыць аб тым, што паэзія заўсёды грамадская з'ява». Аксіёма, якая не патрабуе доказу, але вымагае пытання: хіба гэты прачытаны ці надрукаваны верш — заўсёды абавязкова грамадзянскі па сваёй сутнасці?

Можна зразумець гэта імкненне — перанесці «межавыя слупы» традыцыйных формаў грамадзянскасці чым далей у глыб лірыкі. Высокія крытэрыі маюць таксама сваё развіццё і рух у часе. Агульны працэс лірызацыі паэзіі ў бок шчырага даверу, душэўнай размовы захапіў у сваё рэчышча і грамадзянскія пачуцці, якія пачалі шукаць выйсце ў абноўленых формах асэнсавання. І ў гэтым рэчышчы штучныя застаўкі толькі шкодзілі б.

Але захапленне «ціхай» лірыкай, узгадаванай на ўзбочынах жыцця, пачало перарастаць у сваю крайнасць. У ход пайшла культывацыя ціхай «акруглай» паэзіі «залатых сноў», патрыярхальных ідылій, пазбаўленых выразнага сацыяльнага напаўнення. І вось, каб надаць усяму гэтаму нейкія правы «грамадзянства» ў паэзіі, пачалося дзіўнае падцягванне ўсіх «ціхіх» лірыкаў да ўзроўню высокай катэгорыі паэта-грамадзяніна.

На кішынёўскай нарадзе аб праблеме грамадзянскасці А. Лупан справядліва назваў такую з'яву ўцёкаў ад рэальнага жыцця «літаратурнай сімуляцыяй» (так, як у свой час У. Бранеўскі ахрысціў паэтаў, што баяцца сутыкнуцца з рэчаіснасцю, «дэзерцірамі жыцця»). «Гэта дэзерцірства пад агнём, пад святлом, што розумам завём», — аналагічны вывад зрабіў і А. Вярцінскі (верш «Перасцярога»). Шкада толькі, што вывады Вярцінскага-паэта і Вярцінскага-крытыка не заўсёды ўзгадняюцца (прынамсі, там, дзе ён не супраць таксама падцягнуць лірыку любога гатунку да вышыняў грамадскай значнасці).

Як жа мы яшчэ вяла і нясмела крытыкуем тых, хто і сапраўды, як кажа А. Лупан, не супраць уцячы ад апакаліптычных прывідаў у ціхую ідылію адцягненых слоўных карункаў альбо здацца на літасць абсурду. Цяжка зрабіць нават першы крок у праўду, лягчэй заплюшчыць вочы, каб не бачыць трагедый сучасных і трагедый магчымых у будучыні.

Не думаю, што трэба браць пад ахову і другое прыстанішча для літаратурнага сімулянцтва. Мы часта любім дэкламаваць: «я адказны за ўсё чалавецтва!», «усе кулі, што раняць іншых, трапляюць у маё сэрца». Але ж калі ў вершы такога пачуцця няма, не сцякае крывёю сэрца — гучныя словы становяцца псеўдаграмадзянскасцю, прафанацыяй сталай паэзіі.

Крайнасці, як бачым, сходзяцца. І наша паэзія можа іх шчодра пракаменціраваць прыкладамі любога гатунку. Вось характэрная любоўная рыторыка з уяўным драматызмам: «Я то люблю, то ў злосці ўсё крышу», «Я уцякаю ад свайго кахання, як ад спякоты уцякае ранне» (Р. Тармола) і з альбомнай варыяцыяй — у таго ж аўтара: «Нам ад дажджу не уцячы і ад свайго кахання», а то—з пастаральна-пейзажнай сентыментальнасцю: «Будуць зноўку звінець капяжы і вятры на праменнях іграць. Толькі ты, глядзі, не кажы пра сцяжынку на сенажаць» (А. Шаўня).

А колькі блякла-беспачуццёвых копій знята з прыроды (бяру іх з «Дня паэзіі», 1972 г.): «Развеселая картина: лес угрюм и ярок, охмелевшая рябина не скрывает ягод» (Л. Ганчарова); «Пакажаш чыстую крыніцу, што пад бярозаю хаваеш, раскажаш быль ці небыліцу, услед галінкай паківаеш» (В. Законнікаў); «Тут вербы ніцыя і вольхі вясною кожнаю цвілі. Тут рэчка на світанні гаманіла жывым цымбальным спевам» (І. Калеснік); «Птушыныя не моўкнуць галасы ад сіняга золку, як сонца патушыць апошнюю зорку» (Я. Крупенька); «Вецер носіцца, як ашалелы, абрывае апошняе лісце. Працягнулі бярозы белыя долу тонкія кісці» (В. Шыханцоў); «Ды вабяць зноў дарожкі між сосен і дубоў, і нам з табой, Алёшка, зусім не да грыбоў» (В. Ярац).

А вось — ужо з другога «полюса» — тыповае дэкларацыйнае прамаўленне ісцін пры поўным раўнадушшы да іх (цытую па той жа крыніцы): «Любоў народа — вось узнагарода, адзіная з усіх пахвал-адзнак, якой сагрэты ў бурах і нягодах яго сумленны сын — паэт-мастак» (Н. Гілевіч).

Да спрэчкі аб мяжы паміж лірычна-інтымнымі вершамі і лірыкай грамадзянскага гучання хочацца дадаць адно: прыгледзьцеся ўважлівей, якая асоба стаіць за радкамі, які яе духоўна-маральны патэнцыял — і ўсё стане на месца! Відаць, якраз у значнасці творчай асобы тоіцца важнейшы крытэрый грамадзянскасці.

Так адкрываецца свята паэзіі ў нашых літоўскіх сяброў у Каўнасе...

Я не выпадкова назваў столькі першых кніжак. У кожнай з іх быў свой **непаўторны свет, за якім стаяла асоба** са своеасаблівым абліччам і голасам, са сваім непадобным на іншыя почыркам. Такога паэта хацелася чытаць, слухаць, хацелася ісці ў яго свет, бо відаць было, куды ідзеш, і была ўпэўненасць, што там не патраціш дарэмна час, а нешта знойдзеш, узбагаціш душу. І кожны з нас у тых вершах знаходзіў і часцінку самога сябе, бо жылі ў іх трывогі і радасці цэлага пакалення.

І вось у маіх руках — зборнік Генадзя Казака «С любовью к людям», які сёлета з'явіўся на кніжных паліцах. У першым жа вершы чытаю аб тым, што чалавеку Радзіма патрэбна «как ростком (?) удобренная (??) почва, а старухе (?) утренняя (???) почта...». Што гэта? Трэба быць зусім сляпым і глухім, каб не бачыць і не чуць, як гэта далёка ад паэзіі, як гэта страшэнна непрыгожа, бо выпадковымі словамі сказана аб самым дарагім! Вочы міжволі пабеглі за кароткай даведкай: рэдактар зборніка—У. Машкоў, на грамадскіх асновах адрэдагаваў яго П. Валкадаеў. І карціць спытаць у іх: дзе тут элементарны густ, дзе звычайная рэдактарская адказнасць? Ды не менш дзіўнага наперадзе...

Паэт «далікатна» расказвае аб тым, як «...листочки, встречая утренний рассвет, упрямо взламывают почки. И пробиваются на свет. И к солнцу тянутся спросонок». Дык як усё ж —лісточкі спалі ці «упрямо взламывали»? Відаць, у сутнасць радкоў не ўніклі дастаткова ні сам аўтар, ні рэдактары яго кнігі. Недакладнасць, лёгкаважкасць, урэшце і звычайная бессэнсоўнасць даволі часты госць у гэтай кнізе. Вось прыклады: «Отчий дом мне до капли знаком, только Родина больше и шире». Прымітыўна? Але. Яшчэ прыклады? Калі ласка... «А на последнем этаже ребята кроют крышу» — так сказана ў вершы «Кровельщики». Побач — захапленне лірычнага героя: «Брожу босой, сшибаю палкой груши. В крестьянской бане душу отвожу. И лайку тихо трогаю за уши». І тут жа, у вершы, раптам такое: «А если станет грустно от того, что дочь моя, как я, расправит крылья...» Досыць. Вось вам, з дазволу сказаць, лірычны герой, вось вам асоба паэта і яго свет. (І прыклады я прывёў не з самых горшых вершаў кнігі). У гэты свет, дзе пануе ненатуральнасць, фальш, разлад, мяне, чытача, і на вяроўцы больш не зацягнеш. Я толькі магу другім параіць, каб не спяшаліся туды трапіць. Але ці заўсёды паслухаюць: кніга ж выйшла пяцітысячным тыражом. І калі яна выдана аўтарытэтным выдавецтвам, дык паспрабуй дакажы, што тут нешта не так! З дэзарыентаваным чытачом размаўляць складана. У гэтай сувязі прыгадваецца нядаўняя размова з загадчыцай аднаго з дзіцячых садоў г. Брэста. У адказ на маю заўвагу адносна якасці падабраных ёю для ранішніка вершаў, яна здзіўлена сказала: «Што вы, гэта ж узята з кніжкі!» Вось якую часам шкоду прыносім мы, пускаючы ў свет пасрэдную, а то і проста нікчэмную кнігу, шкоду і чытачу, і аўтару...

І калі далей ужо гаварыць пра свет паэта, яго грамадзянскую пазіцыю, дык хочацца далучыцца і мне да тых, каго не прывабіў зборнік Міколы Мінчанкі — з яго конікамі дзеля конікаў, раўчукамі дзеля раўчукоў...

Было б яшчэ паўбяды, каб праблема асобы паэта, паэта з багатым духоўным светам, добрым густам, стаяла толькі ў першых кнігах. Яна часта застаецца і ў другіх і трэціх вершаваных зборніках. Яскравы доказ таму—зборнікі Хведара Чэрні, Мацвея Яцука, аб чым ужо гаварылася ў друку. Між іншым, гладкапіс і хуткапіс па сваёй прыродзе — актыўныя, наступальныя... Вось у чым складанасць (я працягваю спрэчку з Алесем Марціновічам), а не ў тым, што паэт у раннім узросце прэтэндуе на зборнік. Дарэчы, пэўнал блытаніна назіраецца ў яго наконт «камунальных паслуг» і вясковага «светлага ранняя»... Адно другога не датычыцца і адно другому нікольні не замінае.

Асабіста мне імпануе размова аб асобе паэта, аб яе ролі ў паэзіі, размова, якая своечасова ўзнята на старонках штотыднёвіка. Упэўнены, што яна прынясе карысць, сумленна паслужыць нашай агульнай літаратурнай справе.

Барыс БУР'ЯН

РОЗДУМ АБ СУЧАСНІКУ

РАМАН «СНЕЖНЫЯ ЗІМЫ» І. ШАМЯКІНА НА СЦЭНЕ БЕЛАРУСКАГА ДРАМАТЫЧНАГА ТЭАТРА імя Я. КОЛАСА

Чатыры гады назад беларуская проза ўзбагацілася шматпланавым, па-грамадзянску ўсхваляваным творам Івана Шамякіна «Снежныя зімы». Як часта бывае, раман гэтага пісьменніка зацікавіў чытача, выклікаў жаданне разам з аўтарам і яго героямі абдумаць і наш сённяшні дзень, і тое мінулае, якое заўсёды застаецца з пакаленнямі людзей, што перажылі навалу вайны. Звернуты самым яркім промнем у сучаснасць, даючы гістарычную перспектыву перажытага народам, твор не мог застацца па-за ўвагай «суседніх» відаў мастацтва: гэта тая проза, дзе востры драматызм падзей і шмат у чым характэрныя персанажы жывяць думку і сцэны (тое, што раман інсцэніруюць адразу тры тэатры рэспублікі, сведчыць аб гэтым дастаткова пераканаўча), і тэлебачання (тут таксама ёсць падставы чакаць прэм'еры на «блакітным экране»), і, магчыма, кінематографа, ды і музычнага тэатра.

Першае сцэнічнае ўвасабленне «Снежным зімам» даў калектыў коласаўцаў. Ёсць у гэтым факце адна заканамернасць, не сказаць пра якую нельга. Тэатр даўно і паслядоўна, кіруючыся гаспадарскім клопатам аб арыгінальным рэпертуары, фарміруе афішу і са спецыяльна для коласаўцаў напісаных п'ес, і з «перакладаў» на мову сцэны яркіх празаічных твораў беларускіх пісьменнікаў. Мабыць, дастаткова прыгадаць хоць бы спектаклі «Навальніца будзе» паводле трылогіі Якуба Коласа, «Крыніцы» і «Сэрца на далоні» І. Шамякіна, «Вайну пад стрэхамі» А. Адамовіча, «Бацькаўшчыну» К. Чорнага. Назапашаны багаты вопыт, ён тым больш каштоўны і павучальны, што інсцэнізацыя прозы наогул цяпер заваявала роўныя правы з арыгінальнай п'есай.

Спектакль «Снежныя зімы», вядома, дадае да гэтага вопыту нешта істотна новае, я сказаў бы, прынцыпова новае. Зразумела, лягчэй за ўсё паўтарыць вядомую ўжо ісціну аб тым, што ніякая інсцэніроўка не можа ахапіць далягляды і глыбіні буйнога празаічнага твора. І тая п'еса, якую напісалі паводле рамана «Снежныя зімы» загадчык літаратурнай часткі тэатра імя Я. Коласа Ул. Ганчароў і сам І. Шамякін, у сцэнічнай рэдакцыі, што была распрацавана галоўным рэжысёрам тэатра С. Казіміроўскім, — гэта толькі адна з магчымых тэатральных версій твора.

Першая асаблівасць пастаноўкі — яе публіцыстычны напал. І сам метад інсцэнізацыі, калі драма «чытаецца» тэатрам як маналог-успаміны галоўнага героя Івана Антанюка, спрыяе мастацкаму асэнсаванню таго, што адчувае, думае і гаворыць (часта звяртаючыся непасрэдна ў залу, да нас, гледачоў) ён, чалавек, якому аддадзена асноўная ўвага, да якога, як да эпіцэнтра, скіраваны эмацыянальныя і інтэлектуальныя токі ўсіх дзейных асоб.

Рэжысёр С. Казіміроўскі і выканаўца ролі Антанюка Ф. Шмакаў так будуюць і так іграюць кароткі пралог да спектакля, што зала адразу адчувае права героя на шчырую споведзь, на адкрытую размову і з сам'м сабой, і з глядзельнай залай.

— У лесе заўсёды хораша думаецца, — гучыць са сцэны, уся прастора якой як бы разгорнута ў панараму ўмоўнага, але і дакладнага па дэталях месца дзеяння. — Лес разганяе трывогу. Самыя вялікія непрыемнасці, якія яшчэ ўчора здаваліся трагічнымі, пасля такой вось прагулкі па лесе і развагі пад шум дрэў, робяцца дробязнымі, не вартымі сур'ёзных перажыванняў...

Ёсць у голасе, ва ўсёй постаці Антанюка—Шмакава штосьці жывое і ўнутрана значнае, калі ён пачынае гэтую споведзь. Артыст перадае не толькі тэкст, непасрэдны змест слоў, ён дае адчуць нам, што словы аб «трагічных непрыемнасцях» — не тыя, ад якіх лёгка адмахнуцца, хай сабе і ў лесе, пад шум дрэў, што напярэдадні яшчэ мы не раз, настройваючы сябе на «Антанюкову хвалю», успрымем жывы і хвалюючы напал драматызму і падзей, пра якія пойдзе гаворка, і чалавечых узмаемаадносін.

Другая асаблівасць спектакля вынікае з першай. Ён і сапраўды часам глядзіцца як «монадрама», як мастацкі разрэз біяграфіі і лёсу аднаго чалавека. Тэатр свядома абраў такую форму перадачы параманнаму шырокага агляду жыцця м н о г і х праз тое, як гэты «агляд» працінае чалавечую адзінку. Жывы ў кожнай праяве свайго «я», свайго яснага характару, сцэнічны вобраз Антанюка ўбірае ў сябе запаветныя рысы часу. Тэатр не ідэалізуе Івана Васільевіча, былога партызанскага важака, партыйнага работніка, салдата партыі: тое, чаго ад яго патрабавалі абавязак і сумленне, ён выконваў з верай і самаахвярнасцю, а калі памыляўся, то не хаваўся ад адказнасці і не даваў сабе палёгкі.

Амаль няўлоўнымі штрыхамі і нюансамі Ф. Шмакаў нясе яшчэ адну ноту, якая не аціхае ў душы героя. Не выпадкова Антанюк аграном — па прафесіі і па жыццёвым прызванні. Сын зямлі, ён даражыць ле характвом, а ў характве — людзьмі. Артысту важна тое, што роля дае яму магчымасць паказаць героя жывым, не «ад схемы» чалавекам. Таму Антанюк Ф. Шмакава так непасрэдна і па-творчы адчувае рэальнасць на маральным праціўнікам робіцца і баявы паплечнік, калі такі чалавек здраджвае высокім ідэалам. Мабыць, найбольш ярка гэта праяўляецца ва ўзаемаадносінах Антанюка з Валянцінам Будыкам. Па-акцёрску тонка, з псіхалагічнай праўдай нават у нюансах Ф. Шмакаў іграе ролю тады, калі яго герой вельмі востра (а для самога Антанюка — унутрана балюча!) адчувае ў былым начальніку штаба партызанскага злучэння, а цяпер дырэктары навукова-даследчага інстытута Будыку «перамены» дзіўныя, незразумелыя. Антанюк жа не такі, каб дараваць «дзіўныя» ўчынкі і пакідаць нешта «незразумелым» у прыстасаванцы ад навукі. Не, ён не змірыцца з тым, што яго колішні паплечнік цяпер зневажае годнасць і прыніжае грамадзянскую сутнасць савецкага характару.

Паспрабуйце сказаць гэта вы таму Будыку, якога такім «паважным», з ветлівай усмешкай на вуснах, з упэўненасцю ў самім сабе паказвае А. Шэлег! Ён не толькі прыме стойку «смірна». І ўсё ж па-свойму высакародна гучыць гэты, хай сабе ў мірных умовах і наіўны заклік да прыстасаванца-абывацеля: маўляў, вярніся ты ў сваё баявое і па-юнацку чыстае мінулае, узваж цяперашнія ўчынкі і намеры сэрцам, а каб лягчэй табе гэта было зрабіць, выконвай знаёмую каманду: «Смірна!» І ўжо не так Будыку, як і нам, у залу, кідае па-публіцыстычнаму адкрыты тэкст шмакаўскі Антанюк, успамінаючы пабраціма, які загінуў у баі:

— Ён ляжыць у зямлі, каб ты рабіў трагедыю з таго, што табе не далі яшчэ адной прэміі, яшчэ аднаго ордэна!..

Памяць сэрца... Яна прыціхла і «маўчыць» у Будыку, яна кіруе думкамі і настроямі Антанюка. Вобразна гэта на сцэне часам ілюструецца амаль літаральна — з'яўляюцца наплывы з «ваеннай пары», хтосьці з дзейных асоб нагадвае, якімі яны ўсе былі тады, калі партызанілі. Магчыма, некаторыя з умоўна - сцэнічных, выконваемых, дарэчы, нават эфектна, літаратурна - рэжысёрскіх «наплываў» (а на іх будуецца і раман) на сцэне і не абавязковыя. Бо з сутнасці і тэмпераменту канфлікту паміж Антанюком і Будыкам (ён іграецца Ф. Шмакаевым і А. Шэлегам кідка, ёмістка, і гэта робіць дастаткова яркае ўражанне) для большасці гледачоў «і так усё зразумела».

Наогул спектакль выглядае расцягнутым, асабліва ў першай частцы. Аўтары інсцэніроўкі, відаць, як гэта звычайна бывае з людзьмі, якія пішуць для тэатра, былі залішне падрабязнымі, баючыся, што хтосьці з тых, хто не чытаў раман, не зразумее прычын і матываў некаторых паводзін дзейных асоб. Сярод амаль дваццаці персанажаў інсцэніроўкі, бадай, больш за іншых пашанцавала Валянціну Адамавічу Будыку: яго роля дае магчымасць артысту «сыграць лёс», а не толькі даць пэўную даведку-ілюстрацыю адносна Антанюка, яго сяброў і яго праціўнікаў.

Помніцца, адзін крытык (даўно гэта было!), адзначаючы па-рэжысёрску і па-акцёрску старанна «сцэментаваны» ансамбль спектакля паводле рамана «Мадам Бавары», сказаў і такое: «Ды толькі ці не празмерна другараднымі выглядаюць усе астатнія персанажы пастаноўкі?» А гаворка вялася пра спектакль А. Таірава ў Камерным... Калі глядзіш «Снежныя зімы» ў коласаўцаў і чытаеш інсцэніроўку, адчуваеш жаданне паўтарыць гэта — ці не залішне другараднымі атрымаліся ўсе астатнія персанажы? А іх жа многа, і некаторыя з іх праходзяць амаль праз увесь спектакль, яны перажываюць свае трагедыі і свае радасці.

Яшчэ раз скажу, што п'еса і спектакль так і задуманы — маналог героя, «падключэнне» да яго эпізодаў з «сёння», «паплывы» эпізодаў часоў вайны. Таму пэўная мазаічнасць тут была непазбежная. І дзякуй трэба сказаць тэатру за тое, што многія з так званых «занадта другарадных» персанажаў нясуць сваю тэму (узаемаадносіны «бацькоў» і «дзяцей», сумленнае служэнне высокім ідэалам і пакар'ерысцку зразуметы «дух часу», неспакойная памяць сэрца і сардэчная глухата і г. д.), у межах тэксту і маштабу эпізоду раскрываюць характар і нават даюць магчымасць «далучыцца» нам да лёсу чалавека.

Колькасць выхадаў на сцэну артысткі Г. Бальчэўскай можна, як кажуць, пералічыць па пальцах. А яе Віталія, дзяўчына ўнутрана насцярожаная, так прыслухоўваецца да сябе і да таго, што адбываецца навокал, так патрабавальна шукае сваёй праўды і свайго месца ў жыцці, што не верыць у гэты характар — нельга. Як і Антанюк, яна — цэльны характар. Як і Антанюк, яна не пойдзе на кампраміс. І яна, мабыць, не менш мужна сустрэне абвінавачанне ў «ханжаскай маралі», калі толькі хтосьці па-будыкаўску абразіць яе «ўнутраны кодэкс».

Яшчэ менш «выхадаў» на сцэну ў артыста Ул. Куляшова, які іграе ролю адказнага па пасадзе кіраўніка (яго завуць Іванам Іванавічам), ад якога залежыць лёс і Антанюка, і тых, каго можна лічыць надзейным саюзнікам Антанюка і яго маральных прынцыпаў. Хоць знешне гэта зусім прыстойны і нават падкрэслена ўважлівы, ветлівы адміністратар, Ул. Куляшоў усімі акцёрскімі фарбамі вядзе нас да таго, што і мы пачынаем бачыць сапраўднае аблічча Івана Іванавіча, дэмагога і перастрахоўшчыка. Побач з такім персанажам яшчэ ярчэй адцяняецца мужная бескампраміснасць Антанюкоў, іх сапраўднае хараство, іх партыйныя па духу адносіны да жыцця. Па-мастацку Іван Іванавіч выкрыты на сцэне артыстам вельмі пераканаўча.

А маці загінуўшых братоў-партызан Марына Казюра! А стары

Яны — партызанскія пабраціімы. Таму і спрачаюцца зараз. Народныя артысты БССР Ф. Шмакаў і А. Шэлег (у ролях Антанюка і Будыкі) так і іграюць гэты эпізод...

Фота С. КОХАНА.

ўсіх скрыжаваннях жыццёвага шляху. Дарэчы, многія эпізоды спектакля так і ўспрымаюцца — чалавек, сустрэўшы когосьці або прыгадаўшы штосьці, як бы затрымаўся на скрыжаванні, узважвае, дзейнічае.

Як і ў пачатку-пралогу, рэжысёр у фінале выводзіць Антанюка на авансцэну: зноў — на гэты раз у пошуме жытнёвых каласоў — герой абдумвае перажытае ім. А навокал — хлеб, хлеб...

(Мабыць, Антанюк у такі момант прыгадаў бы адзін верш, і, не пагадзіўшыся з першымі яго радкамі: «Забыта многае ў жыцці, з дарогі змецена і змыта», — прамовіў бы як запаветнае: «Мне ў жыта хочацца ўвайсці, мне вечнасцю здаецца жыта... Тут даспявае пад смугой зліццё надзей, жаданняў сумесь...»).

— Пакуль жыву, буду шумець, — з прасветлена-лірычным і ў чымсьці нібы «на новым этапе» сталым роздумам вымаўляе шмакаўскі герой. — Буду і памыляцца, бо не памыляюцца толькі абываццелі і мерцвякі. А я — жыву! Можна вінаваціць мяне шмат за што, але не за тое, што было галоўнай лініяй майго жыцця, што павінна быць галоўнай лініяй жыцця кожнага чалавека...

Максімалізм? Што ж, такі ўжо ён чалавек, Антанюк — чалавек для людзей! (І зноў жа, гартаючы вершы А. Пысіна, ён, мабыць, аднёс бы да сябе радкі: «Мой сцяг вышэй усіх няўдач, вышэй усіх няпраўд. Я сам загорнуты ў кумач ад галавы да пят...»).

Калі хочаце, тэатр тут скарыстоўвае сцэну як трыбуну, дае публіцыстычную выснову ўсяму, што было паказана нам у спектаклі. Гэта — мараль сцэнічнага твора, заклік, зварот да гледачоў. А жыццё перад намі прайшло сапраўды драматычнае, здольнае забраць у палон, узрушыць, абудзіць роздум, актыўны эмацыянальны «адказ» на мастацкі твор.

«Пераклад» шамякінскай прозы зроблены па законах драмы. Спектакль драматычны, канфліктны. Антанюк сутыкаецца не толькі з адкрытым ворагам, з фашызмам; для яго абурыцца, ён і пасмяецца з вас. Але перад ім — Антанюк.

Здаецца, нічога ўжо не трэба Будыку, акрамя высокай урадавай прэміі. І ён атрымаў бы яе — ва ўсякім разе А. Шэлег іграе так, што на сцэне прадстае гэткі прэтэндэнт на любыя ўзнагароды і падзякі, які «выпрацаваў» у сабе непахісную ўпэўненасць, што яны яму «ўжо» належаць, калі ён—Будыка! А на гэты раз — тым больш: прэмія ў яго, як гаворыцца, «у кішэні». Ды і Антанюк не дужа вялікі знаўца ў машынабудаванні... Аграном. Улагодзіць яго і... І ўзнікае паядынак. Будыка яго не хоча; яму ніякай карысці ад спрэчкі з Антанюком. Ах, якая ліслівая і дзяжурна «прыяцельская» ўсмешка асвятляе твар шэлегаўскага персанажа! Будыка па-свойму паважае «празмерна», на яго думку, сумленнага, трошкі нават цнатлівага «дзівака» (у рамане ёсць словы — «прынцыповы ідэаліст») Антанюка. Ды толькі маральны канфлікт набірае разгон, робіцца небяспечна-гарачым, і тады (зноў жа А. Шэлег па-акцёрску апраўдана іграе ўнутраны выбух Будыкі) доктар навук не стрымліваецца. Перад пагрозай канчатковага «выкрыцця» ён кідае абразлівыя словы: «Чаго мне не хапае — твайму прымітыўнаму розуму непасільная задача. Прэмія трэба не аднаму мне! Калектыву...» Не, пра «калектыў» і пра інтарэсы людзей, відаць, Антанюку тлумачэнні даваць і не варта: гэта ў яго крыві. Тады — новы выбух Будыкі: «Даволі з мяне тваёй ханжаскай маралі!..» Як і ў рамане, ён выглядае (парадокс!) амаль «манументальна прыгожым», доктар навук Валянцін Будыка.

І тут рэжысёр на «дзень сённяшні» дае па-мастацку абгрунтаваную праекцыю «мінулага»: як былы камбрыг, Антанюк камандуе — «Смірна!..» Праўда, пакуль што гэты момант (магчыма, адзіны ў сцэнічных паводзінах Ф. Шмакава) іграецца празмерна «ў лоб», з разлікам на «рэакцыю» гледача, які, зразумела, засмяецца, калі Будыка

калгаснік, які так маляўніча «ўваходзіць» у калейдаскоп эпізадычных дзейных асоб! Артыстам Л. Пісаравай і І. Матусевічу апладзіруе зала, і гэта не выпадкова, бо і яны з «празмерна другарадных» роляў здабываюць жыццёвую праўду і падаюць яе па-тэатральнаму выразна, сакавіта, пераканаўча.

Па рэцэнзенцкаму штампу я мог бы папрасіць прабачэння ў тых, каго мушу называць «па спісе». Але не сказаць, што сапраўды артыстычныя работы паказалі Т. Мархель (жонка Антанюка), Г. Маркіна (Надзея Пятроўна), Т. Кокштыс (інтрыган Эдуард Кляпнёў), М. Цішачкін (камісар атрада Шугановіч), Я. Шыпіла (палонны), было б недаравальна нават вельмі абмежаванаму памерам артыкула рэцэнзенту. Гэтыя выканаўцы адчуваюць эпізадычнасць сваіх персанажаў, але карыстаюцца вельмі выразным светаценем, каб у гісторыі Антанюка не было чалавека, які б «прайшоў мімаходзь» у лёсе героя.

Сустракаючы розных людзей, кожны з якіх то падтрымлівае ў нечым яго, то выступае са сваёй жыццёвай філасофіяй і тым спрачаецца з ім, шмакаўскі герой ярчэй за ўсё раскрывае характар і светапогляд у сутычках з негатыўнымі з'явамі. І на першы план спектакля, а гэтага вымагае прырода драматычнага мастацтва, выступае не так званы «мікшыраваны» (штучна прыглушаны) канфлікт, а непрымірымая барацьба паміж носьбітамі неаднолькавых маральных прынцыпаў. Рэжысёр С. Казіміроўскі так ставіць інсцэніроўку, а выканаўца галоўнай ролі Ф. Шмакаў так іграе яе, што глядач непасрэдна адчувае: тэатр, не балансуючы колькасць станоўчых і адмоўных персанажаў і іх выказванняў, усім пафасам твора супрацьстаўляе негатыўным з'явам і памылковым поглядам сваю выразную ідэйную пазіцыю. Гэта — сапраўды па-сцэнічнаму; гэта — сапраўдная драма!

Спектакль складаны. Вынаходлівасць рэжысуры (С. Казіміроўскі працаваў у супрацоўніцтве з дыпламантам Беларускага тэатральнага мастацкага інстытута А. Інсневічам) праяўляецца і ва ўсёй творчай арганізацыі відовішча. Мастак А. Салаўёў сваімі праекцыямі на тры сцяны-экраны, дакладна знойдзенымі мастацкімі дэталямі на сцэнічнай пляцоўцы і зменамі агульнай каляровай гамы стварыў арганічна сугучную твору дэкаратыўную палітру спектакля. Не «падвёрствуў» да сцэнічных эпізодаў і да старонак рамана, а шукаў музычнага эквіваленту ў перадачы таго, што вось зараз «узрушае душу» галоўнага героя «Снежных зім», кампазітар Г. Вагнер. Яго фрагменты ўспрымаюцца як часткі самастойнага сімфанічнага твора. Гэта той шчаслівы выпадак, калі музыка выступае раўнапраўным саўтарам тэатральнай дзеі і яе філасофскага зместу.

Так, беларуская сцэна дала гледачам яшчэ адзін патрыятычны твор, які не толькі захапляе, прыцягвае ўвагу сюжэтам і акрэсленым характарам сапраўднага героя нашага часу, а і вучыць на прыкладзе нядаўняга мінулага берагчы, як зрэнку вока, гонар савецкага чалавека. Мабыць, многія з тых, каму адрасаваны спектакль, пакідаючы тэатр, возьмуць з сабой па-новаму асэнсаваны і загрэты Антанюковым сэрцам заклік героя: «Дзеці павінны выхоўвацца не толькі на нашых гераічных справах, але і на памылках мінулага, каб не паўтараць іх...» Судзіць жа сябе можна і варта так, як гэта робіць камуніст Іван Антанюк.

ДВОЙЧЫ коласаўцы паказалі «Снежныя зімы» грамадскасці. Спектаклю наканавана доўгае сцэнічнае жыццё. З цягам часу ён набудзе яшчэ больш адчувальную цэласнасць і завершанасць ва ўсіх кампанентах тэатральнага відовішча. Калектыў гэта ведае. Калектыў да гэтага імкнецца.

А. ГАНТМАН

КАЛІ ЎЗЯТЫ РАЗГОН...

ПРАЗ ПАЎТАРА ГОДА ПАСЛЯ АДКРЫЦЦЯ ТЭАТРА МУЗКАМЕДЫІ БССР

ПАСЛЯ ТАГО, ЯК Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР увогуле «аформіўся», калі грамадскасць адчула пэўныя тэндэнцыі развіцця і пэўныя характэрныя недахопы, задаеш пытанне: як да працы тэатра ставіцца глядач, ці задаволены ён сённяшнім творчым плёнам калектыву?

Я ў дадзеным выпадку — глядач. Скажу шчыра: спектаклі мяне парадавалі. Спадабаўся вядучы склад артыстаў.

У аперэтачным тэатры, як і ў тэатры іншых жанраў, самая каштоўная якасць — майстэрства і добры густ акцёраў. Зразумела, яшчэ не ўсе артысты і музыканты адпавядаюць патрабаванням сталічнага тэатра. Аднак, ужо цяперашні ансамбль падкупляе сваёй маладосцю, адухоўленасцю, культурай сцэнічных паводзін. У некаторых тэатрах артысты размаўляюць на сцэне не так, як у жыцці, і не па «законах» драматычнай сцэны, а «па-аперэтачнаму» — з прыкрымі штампамі, вульгарна падкрэсліваючы «смешнае» або «трагічнае». У гэтым тэатры такія недахопы ўласцівыя нямногім артыстам. На добрай вышыні афарыстычная культура спектакляў. З самага пачатку, як мне здаецца, вызначылася правільная рэпертуарная лінія. У дзевяці спектаклях, выпушчаных менш чым за два сезоны, творы савецкай аперэты складаюць пераважную большасць. Ствараецца і нацыянальны рэпертуар — пастаўлены «Спявае «Жаваранак» Ю. Семянякі, «Рэпартаж з пекла» Я. Глебава. Ідуць «Больны вецер» І. Дунаеўскага, «Халопка» М. Стрэльнікава, «Каўказская пляменніца» Р. Гаджыева, «Увага, здымка!» А. Эшпая. За гэты ж час выпушчаны тры класічныя аперэты — «Баядэра», «Сільва» і «Фіялка Манмартра» І. Кальмана. Тэатр у кожным новым сезоне намячае выпускаць не менш адной нацыянальнай аперэты. Ужо вядзецца работа над стварэннем аперэты «Паўлінка» па камедыі Янкі Купалы і ёсць намер даць аперэтачную версію «Несперкі» В. Вольскага.

Доўгі час пасля адкрыцця ў тэатры не было галоўнага рэжысёра. Толькі сёлета ў канцы мая на гэту пасаду запрасілі Э. Корсакава. Да гэтага ж дзевяць спектакляў у тэатры за два сезоны паставілі сем розных рэжысёраў! Гэта не магло не адбіцца на стылявых рысах спектакляў і на ўзроўні выканання роляў. Добра, што пераважная большасць гэтых «разавых» рэжысёраў аказаліся кваліфікаванымі. І яны выпусцілі ў асноўным добрыя спектаклі. У маю задачу не ўваходзіць падрабязнае рэцэнзаванне спектакляў, таму што асобныя рэцэнзіі ўжо з'явіліся ў друку.

На маю думку, з сённяшняга рэпертуару толькі два спектаклі не могуць задаволіць патрабавальнага гледача. «Баядэра», якую паставіў артыст В. Шаўкалюк, атрымалася вельмі ж традыцыйнай, а спектакль «Увага, здымка!», падрыхтаваны горкаўскім рэжысёрам А. Даўгаполавым, пазбаўлены, на жаль, выразнай мастацкай задумы. Да гэтага можна было б яшчэ дадаць, што ў наогул удалым спектаклі «Каўказская пляменніца», які паставіў рэжысёр з Азербайджана М. Кларысаў, чамусьці ні ў знешнім выглядзе акцёраў, ні ў манеры іх выканання не адчуваецца нацыянальнага каларыту (выключэнне ў гэтым сэнсе, бадай, толькі адзін артыст В. Шаўкалюк).

Большасць творчых работнікаў падабраны з мясцовых кадраў. Вось тры мінскія дырыжоры — П. Кірыльчанка, Э. Арашкевіч і Г. Хананьеў. Няхай у іх пакуль што мала дырыжорскага вопыту ў спецыфічным жанры аперэты — гэта прыйдзе з часам. Але сам факт смелага вылучэння мясцовых дырыжораў радуе. На пасады галоўнага хормайстра і хормайстра запрошаны Н. Андросава і Г. Палянкова. У тэатры працуе з самага пачатку малады рэжысёр, выпускнік Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута В. Вярбоўская — работнік, безумоўна, здольны, цікавы. На пасаду галоўнага мастака быў запрошаны з Брэста А. Марозаў, мастак творча цікавы і з добрым густам. Усяляк трэба вітаць запрашэнне на асобныя пастаноўкі мастакоў А. Грыгар'янца і Я. Чамадурава, якія маюць багаты вопыт работы ў оперы і драме.

У трупе салістаў ёсць нямала акцёраў. На жаль, мне не ўдалося ўбачыць у прагледжаных спектаклях усіх артыстаў. Спынюся толькі на тых, якія здаліся мне цікавымі па творчых якасцях: Н. Гайда, Н. Белавусава і В. Мазур («гераіні»), К. Лосеў і М. Смаршкоў («героі»), Л. Зубцова і С. Муратава («субрэткі»), В. Фаменка («прасцяк»), Ю. Лазоўскі, В. Шаўкалюк, Л. Мацісава (характарна-камедыйная амплуа), характарныя артысты Н. Равінская, С. Бажэнава, А. Крайнікава, Р. Курлыкова, С. Шчапаў і іншыя.

Я карыстаюся старымі тэрмінамі акцёрскіх «амплуа». Што ж, мабыць, аперэта без такіх вызначэнняў, прынамсі ў прафесійных размовах, абысціся не можа.

У трупе не хапае вядучага коміка і каскаднай артысткі. Каб завяршыць фарміраванне, неабходна запрасіць яшчэ дзвюх вядучых гераінь, камічную «старую» і вядучага «прасцяка».

У асобных артыстаў не заўсёды ў парадку з вакалам і дыкцыяй, няма дастатковага ўмення ў падачы тэксту. Улічваючы маладосць асноўнай часткі гэтага калектыву, неабходна, вядома, удасканальваць артыстаў па лініі акцёрскага майстэрства. Гэта справа рэжысуры. Але варта, відаць, і спецыяльна запрасіць педагогаў па вакале і культуры мовы, якія кансультавалі б артыстаў не толькі перад выпускам новых спектакляў, а і давалі б ім парады перыядычна, так сказаць, у рабочым парадку. Гэта дапаможа павысіць майстэрства і асобных артыстаў, і ўсяго калектыву.

У аперэту мы ходзім не толькі на новыя спектаклі, але, як кажуць, і на любімых артыстаў. «Любімыя» ж часта даюць сабе палёгку — іграюць без унутранага кантакту з партнёрамі, парушаюць рэжысёрскі малюнак, «адхіляюцца» ад тэксту. Добра было б, каб калектыў беларускай аперэты не хварэў на «прэм'ерства», спаганяў з вінаватых за адступленне ад тэксту, за недаацэнку вакалу, за штучнае «выціскание» смеху ў гледача...

Масавыя творчыя калектывы таксама падабраны пераважна з мясцовых кадраў. А гэта важна, бо спрыяе фарміраванню сталай трупы — хору, аркестра, балета.

Найбольш стабільнае становішча ў балеце. У штатах прадугледжаны даволі вялікі склад: 32 артысты. Пакуль што застаюцца дзевяць нявыкарыстаных вакансій.

Трэба сказаць, што ў харэаграфіі спектакляў, аўтарам якіх бывае галоўны балетмайстар Л. Травінін, не адчуваеш сапраўды творчай выдумкі, вынаходлівасці, фантазіі. У тых яго работах, што мінчане бачылі, многае зроблена стэрэатыпна. Магчыма, гэта спрэчна, але пакуль што не зусім унаўнена выступаюць нават вядучыя салісты. Трэба спадзявацца, што Л. Травінін яшчэ «раскрыўся» як харэограф не поўнасцю, што, умацаваўшы калектыў яркімі салістамі, ён здолее больш арыгінальна весці харэаграфічную трупу да поспехаў. Хочацца прад'явіць прэтэнзіі і да балетмайстра-рэпецітара А. Панчанкі. Не заўсёды выразна і адшліфавана выконваюцца танцавальныя нумары. Ці прад'яўляецца прафесійная патрабавальнасць да артыстаў балета? Здаецца, што і ў педагагічным напрамку яшчэ трэба многае зрабіць...

Цяпер пра аркестр. Склад аркестра даволі розны па кваліфікацыі. Ва ўсякім выпадку, па свайму майстэрству ён пакуль што яшчэ не даведзены да ўзроўню аркестра сталічнага музычнага тэатра. Калі я гаварыў пра гэта з галоўным дырыжорам П. Кірыльчанкам, ён спасылаўся на тыя арганізацыйныя і вытворчыя прычыны, якія замінаюць выхаванню музыкантаў. Пра гэта ён сам напісаў у нататках «Па той бок куліс» («ЛІМ», 16 чэрвеня г.г.). Аб'ектыўна ўсё сказанае ім здаецца правільным. Ды толькі і самі дырыжоры павінны прад'яўляць больш патрабавання да сябе і да аркестра. Нельга дараваць салістам разыходжанняў з аркестрам. А гэта часта заўважаецца ў спектаклях (тут ужо аркестравая яма ні пры чым). Многае залежыць і ад кваліфікацыі музыкантаў.

Трэба ў тэатры мець добрых канцэртмайстраў — піяністаў, якія разучвалі б з артыстамі вакальныя партыі і даводзілі іх гучанне да ўзроўню оперных спевакоў. Тады павысіцца вакальная культура ў тэатры.

Найбольш цяжкае становішча склалася з хорам. Пры наяўнасці 35 штатных адзінак запоўнена ўсяго толькі 10—15. Астатнія выступаюць «на разавых». Хор зусім бездапаможны ў сцэнічных адносінах. Трымае сябе на сцэне статычна і не адчувае сябе ў атмасферы дзеяння п'есы. Слаба пастаўлена і вакальная частка. Канечне, пры такіх умовах і рэжысёры і хормайстры трапляюць у складанае становішча.

Можна ж і ў студыйным парадку наладзіць заняткі па акцёрскім майстэрстве, вакале і руху са «статыстамі» з хору. Толькі тады яны стануць дзейнічаць у жывой плыні спектакля.

Хочацца адзначыць, што, нягледзячы на цяжкія ўмовы, у якіх пастаўлены работнікі мастацка-тэхнічных цэхаў тэатра, афармленне і касцюмы выглядаюць на сцэне прыгожа і акуратна. Гэта вялікая заслуга загадчыка пастановачнай часткі У. Кучара. А колькі вынаходлівасці ў работах мастака-грымёра Ю. Рабровай, якая рыхтуе парыкі! Майстар па касцюмах З. Палівода дабіваецца добрага выканання і захавання касцюмаў...

ДЛЯ ТАГО, каб Дзяржаўны тэатр музкамедыі БССР стаў сапраўды рэспубліканскім па значэнні тэатрам, яму трэба стварыць добрую вытворчую базу з памяшканнямі для артыстаў і аркестра, а таксама складамі для дэкарацый, касцюмаў і рэквізіту. Атрымаўшы такое падспор'е, калектыў тэатра можа з часам выйсці ў лепшыя аперэтачныя тэатры краіны.

ШЧАСЛІВАГА НАВАСЕЛЛЯ!

Вытворчы камбінат Беларускага тэатральнага аб'яднання быў арганізаваны ў 1955 годзе. Штат яго складаўся тады ўсяго з дваццаці рабочых, і прадукцыі выпускалася на 22 тысячы рублёў. Паступова, год ад году, прадпрыемства набірала сілу. Летась прадукцыі было выпушчана ўжо на 1 мільён 100 тысяч рублёў.

— Адно нязручна: не маем мы сыравіннага фонду, бо няма ў нас сувязі з заводамі-пастаўшчыкамі,— расказвае дырэктар камбіната В. Браім. — Даводзіцца самім ездзіць па розных прамысловых прадпрыемствах Беларусі і ледзь не вымольваць у іх гэтую сыравіну. Мяркуецца, што яе павінен пастаўляць сам заказчык, але часта заказчыкамі з'яўляюцца калектывы сельскай мастацкай самадзейнасці, у якіх няма патрэбных матэрыялаў. А як ім адмовіш? Вось і даводзіцца любымі праўдамі і няпраўдамі даставаць сыравіну самім.

Недахопу ў заказчыках мы не адчуваем. Выконваем заказы не толькі ад калектываў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, але па меры магчымасці задавальняем просьбы арганізацый з іншых гарадоў — Мурманска, Уладзівастока, Херсона і г. д. Нядаўна беларускія касцюмы, якія мы выканалі для горада Тальяці, атрымалі там на конкурсе першы прыз...

Што ж уяўляе вытворчы камбінат БТА, чым ён займаецца? У дзесяці цэхах, якія пакуль што размешчаны ў розных месцах горада, шыюцца тэатральныя касцюмы, расшываюцца тканіны, робіцца рэквізіт, бутафорыя і г. д. На жаль, усе гэтыя патрэбныя рэчы вырабляюцца ў нязручных, непрыстасаваных для работы памяшканнях. Драпіровачны цэх размясціўся ў вільготным склепе без адзінага акна, без належнай вентыляцыі. Уздоўж сцен нагрувашчаны велізарныя цюкі матэрыял — не хапае складскіх памяшканняў. Не ў лепшым становішчы і іншыя цэхі. Цэх роспісу тканін і вырабаў за апошнія восем гадоў чатыры разы мяняў памяшканне і кожны раз няўдала — фарбавальнікі маюць такі моцны пах, што цэх павінен быць зусім ізаляваны. Знайсці такое памяшканне — задача не з лёгкіх. У кравецкім цэху гатовая прадукцыя вісіць проста над столамі работніц. Цесната і непрыстасаванасць вытворчых памяшканняў, натуральна, перашкаджае ўкараненню новых сучасных механізмаў. Да таго ж цэхі раскіданы па ўсім горадзе, што нязручна для цэнтралізаванага кіравання вытворчасцю.

— Ці будуць у бліжэйшы час палепшаны ўмовы працы? — спытаў я ў В. Браіма.

— Гэтае пытанне не раз узнімала перад кіраўніцтвам БТА, — адказаў ён. — Зараз з радасцю магу паведаміць, што праз некалькі месяцаў пераўладзем усе цэхі ў новы будынак. Будаўніцтва яго ўжо закончана, засталіся дробныя ўнутраныя даробкі. Кожную суботу і нядзелю калектыў нашага прадпрыемства ходзіць на ачыстку ўнутраных памяшканняў... На 1973 год мы запраектавалі выпусціць гатовай прадукцыі на 1 мільён 975 тысяч рублёў, г. зн. на 600 тысяч рублёў больш, чым сёлета. Ужо цяпер закуплем самае новае тэхнічнае абсталяванне...

І вось мы пад'язджаем да велізарнага чатырохпавярховага будынка. Перад фасадам — тэрыторыя, пакінутая для кветніка. Валянцін Яфімавіч паказвае памяшканні, у якіх вельмі хутка размесцяцца цэхі, падсобкі, склады. Шмат святла, выдатныя вентыляцыйныя сістэмы, прасторныя гардэробныя, забяспечаныя душавымі пакоямі.

Шчаслівае наваселле будзе неўзабаве святкаваць калектыў вытворчага камбіната БТА. Хутка, хутка ў новы будынак (плошча яго роўная 3253 кв. м) прыйдуць людзі, пачуецца гоман, застракочуць швейныя машыны, загудуць станкі і пачнецца новае жыццё камбіната, які даўно ўжо заваяваў сабе добрую славу.

М. СМІРНОЎ.

ЯСНАСЦЬ

ГЭТУЮ КНІГУ я чытаў з тым хвалюючым пачуццём асабістасці, якое прыходзіць толькі пры судакрананні з сапраўднай паэзіяй. А ў гэтым жа, відаць, і заключаецца яе таемная, чароўная сіла, што ўладарыць над розумам і сэрцам чытача, што валодае здольнасцю рабіць радкі, напісаныя іншымі, тваімі ўласнымі — па суперажыванню.

Хто раней,
хто пазней,
Толькі ўсе
Зноў і зноў
Мы прыходзім
Да простых,
як хлеб і паветра,
Высноў:
Што жыццё чалавеку —
Любому —
Даецца адно,
І што,
як ні надточвай,
Кароткае вельмі яно,
І што праўда на свеце
Адна —
Без крупінкі маны,
І што шчасця на свеце
Няма
Без сваёй стараны...
Колькі б ты ні мудрыў,
Як ні кідаўся б ты,
А прыходзіш
Да гэтай святой прастаты...

Як не далучыцца да гэтых слоў паэта, як не знайсці паразумення з «гэтай святой прастатой»! Тым больш, што гаворыць, спавядаецца перад табой — равеснік, твой аднагодак...

Вершам «Хто раней, хто пазней...» адкрываецца новая паэтычная кніга Генадзя Бураўкіна «Жніво». І назва кніжкі, і згаданы верш маюць паміж сабой несумненную сувязь: жніво тут — сімвал сталасці, а сталасць завітвае да чалавека тады, калі ён прыходзіць «да простых, як хлеб і паветра, высноў». Аднак пра гэта — пасля. Напачатку ж вось пра што...

Паэты заяўляюць аб сабе па-рознаму. Адны ўжо сваёю першаю кніжкаю даволі выразна акрэсліваюць характар, схільнасці і мажлівасці свайго паэтычнага «я» і ў далейшым паглыбляюць гэты характар і раскрываюць ягоныя схільнасці і мажлівасці. Іншыя ж доўгія гады ніяк не могуць вылезці з палону пачаткоўніцкай безаблічнасці, з цяжкасцю прабіваюцца да спазнання простай ісціны, што паэзія — гэта найперш самавыяўленне, «песня сэрца», «гарманічнае тварэнне гарманічнага духу».

З чым выходзіў — яшчэ ў студэнцкія гады — на першую сустрэчу з чытачом Г. Бураўкін? Прыгадаем яго першыя вершы (першыя не ў сэнсе храналогіі, а ў сэнсе творчай біяграфіі паэта), такія, напрыклад, як «Я хачу прайсці па зямлі...», «Я іду», «Калі часам трохі засумуецца...», «Я з твайго неспакойнага племені, Партыя...» і іншыя. Успомнім:

Я хачу прайсці па зямлі
Самым верным, любімым сынам.
Каб дарогі мяне вялі
Пад вятрамі прасторам сінім.

Каб нямоўчна ў мяне на плячах
Росным раннем спявалі птушкі,
Каб я кветкамі ўсімі прапах
Ад падэшваў да самай макушкі.

Каб легенды глухой сівізны
Мне з даверам дубы шапталі,
І крыніц залатыя званы
Для мяне калыхалі хвалі...

Гэтыя радкі выйшлі з-пад пяра дваццацігадовага паэта, і ў іх, як і ў іншых згаданых вышэй вершах, відочны сляды пачаткоўства, сляды чыста юначай нявопытнасці і захопленасці. Але ўжо і тут знайшло сваё выяўленне тое, што вылучала Г. Бураўкіна сярод тых, хто пачынаў адначасова з ім: незвычайная шчырасць і ўзнёсласць лірычнага выказвання, даверлівасць інтанацый, празрыстасць пачуцця, значнасць думкі, адшліфаванасць радка, а яшчэ (што, бадай, галоўнае) — схільнасць да грамадзянскіх матываў, абвостраная публіцыстычнасць, якая шчасліва паядноўвалася ў яго з глыбокай чалавечай непасрэднасцю лірычных споведзяў. Апошняе стала ці не галоўнай, вызначальнай рысай характару бураўкінскай паэзіі: змест і пафас яе — непрымірымасць да хлусні, подласці, здрады, мяшчанства, прыстасавальніцтва, бескампраміснасць у сцвярджэнні дабра, праўды, справядлівасці, чысціні ў чалавечых узаемадачыненнях, неўміручасці высокіх ленінскіх ідэалаў, прыналежнасці, неадрыўнасці яе лірычнага героя ад роднай зямлі і роднага народа.

Голас паэта мацнеў ад кніжкі да кніжкі, гучаў упэўнена і мэтаімкнёна, не губляючыся ў хоры іншых паэтычных галасоў, гучаў без надломаў і эстэцкай хрыпаты, захоўваючы нерастрачаную сілу маладосці і баявітай, нязломнай жыццесцвярджальнасці.

І вось «Жніво» — кніжка, назва якой, канечне ж, не выпадковая. Кніжка гэтая, несумненна, сведчанне сталасці паэта, той сталасці, якую яшчэ не назавеш «поўднем веку», але з надыходам якой чалавек пачынае ўсё часцей азірацца — яшчэ без смутку і скрухі — назад, на пройдзеныя гады, набывае здольнасць чуць «продкаў галасы» і бачыць «нашых дзён карэнні», калі, пад паглядам «сынавых ясных вачэй», становіцца на свеце «жыць намнога цяжэй і лягчэй».

З гадоў,
калі неба крамсалі
Узнятыя гневам клінкі,
Прыходзяць да нас камісары —
Духоўныя нашы бацькі...

Сцвярджэнне духоўнай еднасці бацькоў і сыноў — гэта было ў Г. Бураўкіна і раней (памятаеце: «Я з твайго неспакойнага племені, Партыя...»). Але ў вершы, які названы суровым і рамантычным словам «Камісары», ёсць і іншае, а іменна:

І марай свяшчэннаю самай
У сэрцах надзея гарыць,
Што нас не ўпікнуць камісары —
Суровыя нашы сябры.

«Нас не ўпікнуць камісары» — гэта сказана ад свайго імя і ад імя пакалення, якое сёння перагнала ва ўзросце сваіх «духоўных бацькоў» і для якога ў адказе на пытанне — упікнуць ці не ўпікнуць? — сэнс жыцця, сэнс чалавечага і грамадзянскага існавання.

Новае, далейшае развіццё атрымаў у паэта і традыцыйны для «маладзейшай» беларускай паэзіі матыў вяртання «бадзягі-сына» ў родную вёску. У вершы «Мая вясковая хаціна...» паэт не клянецца бацькоўскаму куту ў любві (што стала ледзь не паэтычным штампам), не наракае на свой «гаротны» гарадскі лёс. У сваю вясковую хаціну ён прыязджае на споведзь, прыязджае для таго, каб папоўніць свой душэўны запас, каб да скону дзён зберагчы ў сэрцы яе святую навуку.

Тэматычная кніга «Жніво» — разнастайная, але, тым не менш, яна стройная, нават цэласная. Гэтай цэласнасці надаюць ёй ярка выяўленыя ідэйная скіраванасць і пафас твораў, турботлівая думка паэта, якая радуецца, крычыць, абураецца, весяліцца, гневаецца, засмучаецца, але ніколі не заспакойваецца. Кранаючы самыя розныя сферы жыцця, сягаючы ад якойсьці будзённай праявы ў касмічныя вышыні, народжаная ўласным вопытам і ўзабагачаная ведамі іншых, яна, думка паэта, вядзе чытача за сабой, захапляе,

СТАЛАЙ

здзіўляе, уражвае, радуе нечаканымі паваротамі і супастаўленнямі.

О, век дваццаты:
гэтакія штормы,
Не разбярэш,
дзе неба, дзе зямля.
Патрапіцца няўстойлівы
каторы —
Збівае пенной хваляй з карабля...

Лепшая песня паэта прысвечана роднаму краю, бацькоўскай зямлі і яе мужнаму народу. «Люблю свой край, зялёны і спакойны...», «Вераснёўскі прыпар», «Вечаровы дождж», «Асенняя элегія», «Вечарамі па чужых узгорках...», «Мінскі трыпціх», «Я над аджылым не дрыжу...», «Лісцё абсыпалі бярозы...» — ва ўсіх гэтых вершах сцвярджаецца «з небам крэўная роднасць, роднасць з мілай зямлёй». Але вершы гэтыя — не «чыстая» лірыка, у іх не толькі сузіральны спакой пейзажных замалёвак.

Лісцё абсыпалі бярозы.
Буслоў не бачна за ракой...
Нібы на споведзі,
цвярозы
Сыходзіць на душу спакой...

Спакой гэты няпэўны, як няпэўны спакой і позняй восені. Хутчэй гэта зусім не спакой, а — «негаваркі сялянскі одум» лірычнага героя: пра тое, «што па-блазенску мітусіўся і часта, як хлапчук, спяшыў і нёс вядро сваё няпоўным, і спатыкаўся шмат разоў, і хваляваўся не галоўным, а выпадковай драбязой...».

Чалавек між людзей... Можа быць, гэта адна з самых важных і трапяткіх праблем часу, калі сацыяльныя і псіхалагічныя сувязі паміж людзьмі планеты надзвычай ускладніліся. Ёсць тут праблемы і менш лакальныя — унутрыграмадскія, сямейныя, узроставыя. І, пэўна, па гэтай прычыне паэт часцей за ўсё скіроўвае свой погляд менавіта сюды. Чалавек павінен быць дабрэйшым, больш уважлівым і спагадным, павінен быць гатовым прыйсці на дапамогу іншым — такі закон нашага ладу. З другога боку, ён павінен быць непрымірымым да заган, якія яшчэ надараюцца ў нашым жыцці, і да іх носьбітаў, павінен быць бескампраміснымі у барацьбе з подласцю, прыстасавальніцтвам, бюракратызмам, мяшчанскай бездухоўнасцю. Пра гэта — вершы «Мы хочам зразумець галактык мову...», «Памяці народнага артыста СССР Б. В. Платонава», «Не кліч мяне музыкай модненькай...», «Можа, ад таго, што ўжо старэю...» і, канечне, «Кампрамісы» і «Хлапчукі» — сапраўдныя ўзоры публіцыстычнай лірыкі, дзе грамадзянская думка паэта дасягае высокага паэтычнага ўзлёту:

Нас усё хлапчукамі клічуць,
Нас усё блазнюкамі лічаць,
Пацяшаюцца «дружбакі».
Спачуваюць, калі вытыркаемся,
Ушчуваюць, калі не каемся.
Кпяць паблажліва: «Хлапчукі!»

Мы бунтуем з запалам хлапечым,
Аб высокіх ідэях ляпечам,
Пром да ісціны напрасткі.
А яны аціраюцца ззаду,
Выглядаюць сабе пасаду
І пасмейваюцца: «Хлапчукі!»

Менавіта гэтыя вершы — сведчанні грамадзянскай і паэтычнай сталасці аўтара, сведчанні, бадай, больш красамоўныя і важкія,

ПАРЫ

чымся тыя вершы, у якіх лірычны герой гаворыць пра «тапаліны пух» на скронях, пра «гадоў пражытых зімні халадок» (хоць гэтым самым я зусім не хачу кінуць ценю на апошнія).

У кнізе «Жніво» ёсць дзве буйныя рэчы — «Хатынскі снег» і «Паэма расстання».

«Хатынскі снег» — гэта своеасаблівы рэквіем ахвярам фашысцкіх злачынстваў на нашай зямлі. Пра ўзнікненне задумы твора Г. Бураўкін расказваў аднойчы па тэлебачанні. Неяк ён трапіў у Хатынь (сённяшнюю, вядома) зімою, і яму раптам зусім па-асабліваму ўбачылася трагедыя, якая адбылася тут 22 сакавіка 1943 года. Нарадзіўся вобраз снегу. Спачатку белага: «застагнаў, загаласіў пад нагамі **белы** балючы снег». З белага балючага ён ператварыўся ў **чырвоны** гарачы, а пасля трагедыі — у **чорны**, жалобны.

Ужо сама па сабе гэтая знаходка паэта ўражвае, падкрэслівае жахлівасць хатынскай трагедыі. А каб жа толькі гэта! Чаго варты, напрыклад, малюнак той сакавіцкай раніцы ў Хатыні, якая так нечакана і жорстка сталася для хатынцаў апошняй:

Жураўлём сакавіцкім раніца
зарыпела.
Бухнула ў студні аб лядок вядро.
Крактануў пад нагамі снег белы.
Грымнула каля прыпечка бярэмя
бярозавых дроў.
Нясмела кукарэкнуў певень
прастуджаны.
Дзвынкнула аб даёнку тугое
малако.

Генадзь Бураўкін. «Жніво». Выдавецтва «Беларусь». Мінск, 1971.

ЛЮДЗІ СЁННЯШНЯЙ

БОЛЬШАСЦЬ КНІГ Міколы Гроднева напісана на тэмы жыцця вёскі. Гэта не выпадкова. Сын селяніна, журналіст, Гроднеў піша пра тое, што лепш ведае. Мажліва, журналісцкая практыка дыктуе яму і выбар жанру — кароткая аповесць, апавяданне. Гэты найбольш актыўны мастацкі жанр дае пісьменніку магчымасць аператыўна адгукнуцца на тыя зрухі і перамены, што адбываюцца сёння ў нашых калгасах і саўгасах. Праўда, часам такая аператыўнасць не дазваляе глыбока асэнсаваць сутнасць многіх новых з'яў жыцця. Што ж, у літаратурнай справе бываюць нейкія страты.

Прыгадваюцца ранейшыя кнігі М. Гроднева — «За бацькоўскім парогам», «Цяжкае шчасце», і ў іх, у прыватнасці, аповесці «Чужая віна», «Вяртанне», «Сцяпан Покат», некаторыя апавяданні.

Асноўныя героі гэтых твораў — маладыя людзі, якія толькі пачалі свой жыццёвы шлях. Адказнасць чалавека перад сваім сумленнем, перад грамадствам, справядлівасць і дабро — вось тыя асноўныя праблемы, якія найбольш хвалююць М. Гроднева. Ён вырашае іх на глебе будзённага, традыцыйнага ў большай сваёй частцы матэрыялу.

Складаныя працэсы збліжэння вёскі і горада непазбежна выклікаюць пералом у свядомасці маладых людзей. Даследуючы гэтыя працэсы, М. Гроднеў адсылае герояў сваіх аповесцяў з вёскі ў горад. Тут шляхі Сашкі, Дзяніса Кухты, Сцяпана Поката складваюцца па-рознаму. Але несумненна адно: які б ні быў герой, якія б заганы ні былі ўласцівы яго характару, паводзінам, поглядам на жыццё, — трапляючы ў добры працоўны калектыў, у якім пануе сапраўдная атмасфера павагі, дружбы, узаемадапамогі і патрабавальнасці, чалавек не можа заставацца ранейшым. Пісьменнік лепшымі сваімі творамі слушна даводзіць, што разуменне чалавекам сваёй маральнай адказнасці перад сям'ёй, сябрамі, калектывам, Радзімай робіць яго сапраўдным грамадзянінам.

У сваёй новай кнізе «Заручыны» М. Гроднеў паказвае, як пераўтвараецца вёска ў пасёлак гарадскога тыпу. Радасным, аптымістычным настроем прасякнуты гэты твор. Перасяліўшыся ў новыя дамы, людзі, па сутнасці, пачынаюць новае жыццё. З якім маральным багажом падыходзяць яны да гэтага новага жыцця, што адбываецца з імі далей — вось аб'ект даследавання аўтара. Каб ахапіць пабольш жыццёвага матэрыялу, М. Гроднеў своеасабліва кампазіцыйна будуе твор — гэта аповесць у апавяданнях, кожнае з якіх — карцінка жыцця, дзе ёсць месца і бытавым замалёўкам, і гумару, і трывожным і радасным чалавечым перажываннямі. У аповесці няма адзінай, цэласнай фабулы, але тым не менш твор успрымаецца як завершаны. Аўтар імкнуўся адлюстраваць паток вясковага жыцця, як яно ёсць, часам, можа, ідэалізуючы некаторыя моманты. Але рамантычны погляд на новае, што з'яўляецца ў нашай рэчаіснасці — з'ява заканамерная, без якой, думаецца, немагчыма развіццё і літаратуры, і творчай індывідуальнасці пісьменніка. Стварыўшы карціну новай вёскі, М. Гроднеў стараецца давесці правамернасць спалучэння традыцый вясковага жыцця з лепшымі элементамі гарадской культуры. А ўвогуле, перш за ўсё пісьменніка цікавяць адносіны чалавека да чалавека, адносіны чалавека да працы, да роднай зямлі.

Кожная навела тут — жыццёвы канфлікт, хай сабе на першы погляд і невялікі, але за ім — тэндэнцыя часу, рух перамен у свядомасці людзей. Цяжка развітвацца са старой хатай, з якой звязана ўсё жыццё, і прывыкаць да новай старым людзям, напрыклад, Красанку з апавядання «Красанкова амбіцыя». Яшчэ больш, аказваецца, цяжка аддаваць толькі што атрыманую кватэру, з-за чаго і адбываюцца сваркі ў сям'і Валодзі Гаманкова.

З адчуваннем віны перад сям'ёй і аднавяскоўцамі вяртаецца ў родны калгас Васіль, які блукаў па свеце, невядома чаго шукаючы. Маладыя людзі — Тамара і Ніна — не едуць у горад, а застаюцца працаваць на родных палях, дзе яны сапраўды патрэбны. І зусім ужо нечуваная раней з'ява — раённы архітэктар едзе з жонкай у Навасёлкі. Гэта — прыкмета часу. Сапраўды, будаўніцтва разгарнулася ў вёсках незвычайнае... Сведчаннем таму — Верцялішкі, новы ар-

Мікола Гроднеў. «Заручыны». Выдавецтва «Беларусь». 1972.

Высока падымаючы лапы,
прабег па ўчарашняй лужыне
Худы і ахрыплы кот...

А плач мацярок па сваіх дзецях? Кроў стыне, калі чытаеш гэтыя роспачныя, непрыдуманыя радкі:

А вы ж не паспелі пажыць!
А вашы ж ногі не паспелі
нахадзіцца.
А вашы ж рукі не паспелі
напрацавацца.
А вашы ж вочы не паспелі
наглядзецца.
А вы ж не паспелі ўнукамі
парадаваць нас.
Крывіначкі нашы!
Сонейкі нашы!
Дзеці!
За што ж яны вас?!

«Паэма расстання» прысвечана памяці Юрыя Гагарына. Трагічная гібель першага Ікара Зямлі болем адгукнулася ў сэрцах усіх людзей планеты. Гэтым болем і народжана паэма Г. Бураўкіна. У нечым яна блізкая да «Хатынскага снегу»: як і там, напрыклад, так і тут паэт дае ў пачатку карціну ціхамірнай раніцы — раніцы зямлі, сакавіка, калі «няўклюдна асунуліся забытыя снегавікі ў дварах», калі «на пятакі «зайчыкаў» разменьвала золата свайго рубля» сонца, калі «чакала высокае неба бясхмарнае гулкага жаўруковага гімна». Такою сакавіцкаю парою «радыё хрыпла аб'явіла: «Юрый... Гагарын... Загінуў...»

Адкаласяцца годы.
Дні праляцяць заклапочаным
роем.
Неба прашыюць новымі трасамі
караблі.
А ў нас
будзе біцца сумленне,
як жылка на скроні:
«Не зберагліі».

Апошнія словы сталі своеасаблівым рэфрэнам паэмы. Яны балюча кранаюць душу. Як жа нам дараваць сабе гэтую недарэчную смерць, калі гоўкі папрок — не зберагліі! — («Можа, за клопатнасцю і тлумнасцю, што перапоўнілі жыцця берагі», а можа «за чэрствасцю і бяздумнасцю — не зберагліі») — падступае да сэрца?

Урэшце, нельга не сказаць колькі слоў пра інтымную лірыку кнігі «Жніво». Лірычны герой вершаў на так званую адвечную тэму не ханжа і не пашляк, яго пачуццё да каханай — моцнае і чыстае, памаладому палкае і ўзнёслае:

Гэта я з табой вечарую,
Туманамі цябе чарую.
Васількоў шапатлівай моваю
Зачароўваю, зачароўваю.
Роснай сцежкаю, рэчкай ціхаю
Закалыхваю, закалыхваю...

Я знарок не гаварыў тут пра чыста паэтычны бок твораў, сабраных у кнізе «Жніво». Думаю, што ў гэтым не было пільнай патрэбы: нават па цытаваных радках чытач мог заўважыць, што паэтычная палітра Г. Бураўкіна багатая і яркая, што вобраз яго дакладны і ўражлівы, падтэкст тонкі і значны, што ягоны верш разнастайны, але заўсёды звонкі і ашчадны, радок выверана і адшліфаваны.

Тым больш ніякавата бачыць у кнізе радкі, накшталт: **«беражна** збярог», **«другія** з доўгіх падарожжаў», «бегаць **па двару»**, «я ніколі не быў **змалі»**, «сонца **ламілася** ў вокны», **«адчаянная** галава». Усё гэта, вядома, дробязі, але і іх не хацелася б сустракаць у змястоўнай і крыштальна-празрыстай кнізе, якой з'яўляецца бураўкінскае «Жніво».

Мікола ГІЛЬ.

НАВІНКІ КНІЖНАЙ ГРАФІКІ

Алесь Есакоў. «Янка Купала і Беларускі тэатр». Мастак В. Тарасаў. Выдавецтва. «Мастацкая літаратура».

«Зорка Венера». (Зборнік лірыкі кахання). Мастак В. Шаранговіч. Выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Пятрусь Броўка. «Тымая пчолка». Лірыка. Мастак В. Бароўка. Выдавецтва «Беларусь».

АРЫЕНЦІР У ЯГО ТВОРЧАСЦІ

Вершы, паэмы, драматычныя творы Янкі Купалы трывала ўвайшлі ў залаты фонд беларускай культуры, сталі гордасцю ўсёй савецкай літаратуры. Кнігі беларускага народнага песняра выдаюцца на мовах народаў СССР, а таксама ў многіх краінах свету.

Лепш арыентавацца ў багатай спадчыне паэта дапамагаюць бібліяграфічныя даведнікі яго твораў, падрыхтаваныя да друку супрацоўнікамі Літаратурнага музея Я. Купалы. Першы такі даведнік выйшаў у 1955 годзе і ахопліваў дакастрычніцкую творчасць паэта (1905—1917 гг.), другая частка «Бібліяграфіі твораў Янкі Купалы», прысвечаная яго паслякастрычніцкай творчасці (1917 —1942 гг.), з'явілася ў 1957 годзе. Напярэдадні купалаўскага юбілею ўбачыла свет III частка бібліяграфічнага даведніка пра творчасць народнага песняра. Яна ахоплівае перыяд з 1942 па 1960 г.

Нават сам памер даведнікаў сведчыць пра рост цікавасці да купалаўскай спадчыны, пра рост выданняў твораў паэта. Так, для бібліяграфіі публікацый дакастрычніцкіх твораў пісьменніка хапіла 80 старонак. Другая частка змясцілася на 200 старонках. Для трэцяй жа спатрэбілася каля 350 старонак. Гэта ўжо салідны том.

Новы даведнік дапаможа бібліёграфам, настаўнікам, лектарам лепш арыентавацца ў творчасці пісьменніка.

Стваральнікі і складальнікі III часткі «Бібліяграфіі твораў Янкі Купалы» (супрацоўнікі музея, а таксама пісьменнікі, бібліёграфы, навуковыя супрацоўнікі, якія былі прыцягнуты да падрыхтоўкі даведніка) імкнуліся ўлічыць усе выданні народнага песняра. Яны правялі вялікія пошукі, сабралі і апрацавалі многа матэрыялаў.

Складзена III частка «Бібліяграфіі твораў Янкі Купалы» са строгай дакладнасцю. Яе па праве адкрывае самы багаты раздзел: «Публікацыі твораў Янкі Купалы ў беларускім перыядычным друку і зборах твораў», затым ідуць раздзелы, прысвечаныя публіцыстычным артыкулам і выступленням паэта, а таксама выданню яго твораў на беларускай мове. Асобнымі раздзеламі зборнік дае магчымасць сарыентавацца ў выданнях перакладаў твораў Я. Купалы на мовы народаў СССР і на замежныя мовы, даведацца аб перакладах паэта з рускай, украінскай і польскай моваў. Вялікі раздзел «Творы Янкі Купалы ў перакладах на мовы народаў СССР» яскрава сведчыць, што беларускі пісьменнік стаў блізкі і родны для чытачоў усёй нашай шматнацыянальнай краіны.

З'яўленне раздзела «Дадаткі» ў III частцы «Бібліяграфіі» трэба лічыць заканамерным. У гэтым раздзеле падаюцца звесткі пра публікацыі твораў Я. Купалы ў беларускім перыядычным друку і ў калектыўных зборніках, пра публіцыстычныя артыкулы і выступленні, пра калектыўныя выступленні з удзелам паэта ў 1905—1942 гадах, звесткі, якія па тых ці іншых прычынах адсутнічалі ў першых дзвюх частках «Бібліяграфіі».

Матэрыялы новай «Бібліяграфіі» складальнікі размясцілі па алфавітна-храналагічным прынцыпе, які аблягчае карыстанне даведнікам. Гэты прыём апраўданы, таму што ўзросшая колькасць публікацый твораў Я. Купалы пры ранейшым спосабе выкладання непамерна расшырыла б рамкі даведніка, ды і карыстацца ім было б цяжкавата. Зыходзячы з рэальных абставін, складальнікі выбралі найлепшае рашэнне, якое дае магчымасць адразу ўбачыць, дзе друкаваўся той ці іншы твор паэта. А вось у раздзелах «Асобныя выданні твораў Янкі Купалы на беларускай мове» і «Асобныя выданні твораў Янкі Купалы на мовах народаў СССР», на наш погляд, лепш было б захаваць храналагічны прынцып, які дазволіў бы паказаць паслядоўнасць выданняў кніг пісьменніка.

Добра, што складальнікі зрабілі «Паказальнік твораў і перакладаў Янкі Купалы» — з ахопам матэрыялаў першых двух даведнікаў. Гэта дае магчымасць знайсці ў «Бібліяграфіі» ўсе звесткі пра новы твор Я. Купалы: дзе ён друкаваўся, на якія мовы перакладаўся і г. д. Праўда, ёсць тут і некаторыя хібы. Напрыклад, супраць вершаў «Воўк» і «Гэй, капайце, далакопы...» няма звестак пра тое, што яны перакладаліся на іншыя мовы, але калі мы пачнем звяртацца да нумароў, пад якімі значацца гэтыя творы, то дазнаемся з самога даведніка, што першы з іх перакладаўся М. Галодным, а другі — А. Карынфскім. Супраць верша «Даўгажданая» ёсць указанні, што ён перакладаўся на грузінскую і кітайскую мовы, але нідзе не зазначаецца, што ён перакладаўся на рускую мову. А верш жа неаднаразова друкаваўся ў зборніках Я. Купалы на рускай мове ў перакладзе Б. Турганава. З даведніка можа здацца, што яшчэ не перакладаўся на рускую мову верш «Дарогі». А ён ужо даўно вядомы ў перакладах В. Колычава і А. Андрэева. Купалаўскі верш «Як цені» ў паказальніку атрымаў назву «Як у цені». Відаць, з часам знойдуцца яшчэ некаторыя недарэчнасці, але пры ўсім гэтым трэба адзначыць, што выданне новай «Бібліяграфіі» прынясе карысць у далейшым вывучэнні спадчыны народнага паэта. Даведнік аблегчыць працу ўсім, хто звяртаецца да творчасці Я. Купалы. Несумненна, ён паслужыць і справе развіцця і ўзбагачэння купалазнаўства.

Ц. ЛІЯКУМОВІЧ.

«Бібліяграфія твораў Янкі Купалы». Частка III. 1942—1960. Выдавецтва «Навука і тэхніка», Мінск, 1972.

Выйшлі з друку

ВЫДАВЕЦТВА «БЕЛАРУСЬ»

С. Баруздзін. Месяц і сонца. Аповесці і апавяданні. Пераклад з рускай мовы А. Марціновіча. Мастак П. Калінін. 1972 г. 152 стар. Тыраж 7 000 экз. Цана 34 кап.

Я. Крупенька. Нядзеля. Вершы. Мастакі М. і Ул. Басалыгі. 1972 г. 128 стар. Тыраж 3000 экз. Цана 30 кап.

Я. Купала. Тры паэмы («Курган», «Бандароўна», «Магіла льва»). Гравюры А. Кашкурэвіча. 1972 г. 80 стар. Тыраж 25000 экз. Цана 43 кап.

Веслаў Яжджынскі. Рэ. партаж з пустога поля. Пераклад з польскай Я. Брыля. Мастакі Ул. і М. Басалыгі. 1972 г. 112 стар. Тыраж 4500 экз. Цана 20 кап.

Я. Глебаў. 4 п'есы для скрыпкі з ф-на. Мастак М. Шырокаў. 1972 г. 36 стар. і ўкладыш для скрыпкі на 8 стар. Тыраж 500 экз. Цана 70 кап.

Песні для хору з суправаджэннем. Зборнік. Серыя «Мастацкай самадзейнасці». Мастак І. Бялецкі. 1972 г. 64 стар. Тыраж 5700 экз. Цана 51 кап.

Хоры а капэла. Зборнік. Серыя «Мастацкай самадзейнасці». 1972 г. 56 стар. Тыраж 2600 экз. Цана 51 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»

А. Гурло. Вершы. Серыя «Бібліятэка беларускай паэзіі». Укладальнік С. Александровіч. Афармленне В. Юрчанкі. 1972 г. 176 стар. Тыраж 5000 экз. Цана 56 кап.

Я. Зазека. Трывожная ноч. Апавяданні і нарысы. Малюнкі К. Ціхановіча. 1972 г. 80 стар. Тыраж 14000 экз. Цана 13 кап.

А. Русак. Выбранае (Песні і вершы). 1972 г. 160 стар. Тыраж 9000 экз. Цана 52 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАРОДНАЯ АСВЕТА»

Беларускія байкі. Зборнік. Укладальнік В. Зуб. Мастак С. Волкаў. 1972 г. 144 стар. Тыраж 44000 экз. Цана 44 кап.

Хв. Шынклер. Сонца пад шпалы. Школьная бібліятэка. Мастак Г. Грак. 1972 г. 248 стар. Тыраж 18000 экз. Цана 45 кап.

ВЫДАВЕЦТВА «НАВУКА І ТЭХНІКА»

Ул. Ампілаў. Сучасны газетны нарыс. На рускай мове. 1972 г. 240 стар. Тыраж 2600 экз. Цана 1 руб. 02 кап.

А. Булыка. Даўнія запазычанні беларускай мовы. Вокладка В. Рудзянкава. 1972 г. 384 стар. Тыраж 1100 экз. Цана 72 кап.

ВЁСКІ

хітэктурны комплекс якой атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР.

І так надарылася, што адным з першых у беларускай літаратуры ўзняў праблему архітэктурнага аблічча вёскі Мікола Гроднеў...

Новае імкліва ўрываецца ў жыццё. Але людзі не забываюць пра мінулае. Сакратар партарганізацыі калгаса Доўбік дзеля справядлівасці сам ездзіць па Беларусі і шукае людзей, якія маглі б пацвердзіць сувязь настаўніцы Аскалёнак з партызанамі. Аб гэтых і многіх іншых цікавых падзеях у жыцці Навасёлак расказваецца ў аповесці «Заручыны».

Героі новай кнігі Гроднева — працавітыя, цікавыя людзі. Некаторыя з іх сустракаюцца не ў адным, а ў некалькіх апавяданнях кнігі. Аўтар знаёміць чытача з самабытнымі характарамі калгаснікаў Навасёлак. Вядома, пісьменнік абмежаваны памерамі і канструкцыяй свайго твора і, на жаль, многія вобразы не атрымалі па гэтай прычыне дастатковага развіцця. Найбольш цікавы, хоць у нейкай ступені і традыцыйны, вобраз старога Красанка, напісаны з цёплым гумарам і замілаваннем. Своеасаблівы вобраз калгаснага старшыні Мяжэннага, чалавека валявога, працавітага і сумленнага, але не без недахопаў. Астатнія героі аповесці больш эпізадычныя. Некаторыя з іх — Васіль, Ніна, Рэпікаў, цётка Разэліха — нейкімі рысамі ці абставінамі жыцця паўтараюць сваіх папярэднікаў з іншых аповесцяў і апавяданняў Гроднева. Але большасць — вобразы арыгінальныя. У параўнанні з іншымі творамі ў «Заручынах» Гроднеў узыходзіць на больш высокую ступень псіхалагічнага аналізу.

Творчая манера пісьменніка вызначаецца прастатой, натуральнасцю, спакойнай рытмікай, частым ужываннем народных выслоўяў, элементамі гумару. Вось прыклад з апавядання «Багіня Разэліха»: «Дз ўсяго, што зрабіў Красанок у жыцці, а зрабіў ён нямала, хату збудаваў, сад пасадзіў, чатырох сыноў вырасціў, — хацелася старому яшчэ і разумнае слова людзям пакінуць. Такое слова, каб праз сто ці болей гадоў землякі ўспомнілі, маўляў, от гэтак некалі сказаў мудры Красанок. А мудрасць, што ні кажы, наравістая штука: у каго яна прыжылася, дык водзіцца на кожны дзень, а Красанку хоць за грошы яе купляй...» Аўтар не імкнецца аздобіць сваё апавяданне атрыбутамі лірычнай, так званай вясковай прозы, ці, скажам, рванымі дыялогамі прозы моднай (хоць у некаторых ранейшых творах быў у яго такі «грэх»). «Заручыны» арганічна спалучаюць у сабе дакументальнасць добрага нарысу з псіхалагічнай выразнасцю. Праўда, спалучэнне такое не ўсюды вытрымліваецца аўтарам. Часам ён збіваецца на мову газетную — не ў лепшым разуменні гэтага слова. І тады з'яўляецца ў апавядальніка схематычнасць у абмалёўцы абставін і персанажаў, шкодная паспешлівасць. Некаторыя раздзелы ўвогуле здзіўляюць: навошта так падрабязна апісваць недарэчнае сватаўство заезджага французскага турыста да беларускай, зусім не знаёмай яму, дзяўчыны? Іншыя навелы, наадварот, аўтар паспешліва канчае, што не дае яму магчымасці раскрыць характары, на якія даў цікавую заяўку (раздзел «Госць»). Безумоўна, апавяданне — цяжкі жанр, аповесць у апавяданнях — яшчэ цяжэйшы. Аўтару прыйдзецца ў далейшым нямала папрацаваць над пераадоленнем нарысавасці і стылявой рыхласці.

Такім чынам, з мастацкага боку «Заручыны» — твор няроўны, побач з добрымі, удалымі сітуацыямі, характарамі ў ім ёсць нямала слабога. Само ж імкненне пісьменніка паказаць узаемаадносіны, «заручыны» вёскі і горада, адлюстраваць няўхільны рост культуры сялянскага жыцця не можа не атрымаць адабрэння. Далейшую працу аўтара ў такім напрамку можна толькі вітаць. Аднак хочацца выказаць адну перасцярогу сацыялагічнага плана. Наўрад ці можна пагадзіцца, што рост культуры сённяшняй вёскі — гэта просты перанос у яе атрыбутаў гарадской культуры. Думаецца, што працэс тут больш складаны. У вёсцы ў большай меры захоўваюцца лепшыя эстэтычныя і этычныя народныя традыцыі. Ва ўсялякім разе, задача літаратуры — памагчы іх захаваць. А якраз на гэты бок аўтар «Заручын» амаль не звярнуў увагі.

Калі не лічыць мовы, якой напісана аповесць, у творы слаба адчуваецца спецыфічны нацыянальны беларускі коларыт. Мала нават добрых пейзажных замалёвак. Усё гэта значна збядняе вобразную тканіну аповесці.

І ўсё ж, нягледзячы на шэраг недахопаў, «Заручыны» можна лічыць творчай удачай Міколы Гроднева.

Таццяна ШАМЯКІНА.

БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ:

Іван МЯДЗВЕДЗЕЎ

Іван Мядзведзеў — настаўнік, працуе ў Шарпілаўскай сярэдняй школе на Гомельшчыне. Любіць паэзію, піша вершы. Выступаў у рэспубліканскім друку, у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» друкуецца ўпершыню. Жадаем яму поспехаў.

●

А што каму наканавана,
Таго не ведае ён сам...
Бяда прыйшла неспадзявана,
Калі вясенні дзень згасаў.
Хто мог падумаць, здагадацца,
Што ён пакіне нас зусім.
І маці ў роспачы на лаўцы
Сядзіць нямая перад ім.
Не мёртвая і не жывая,
Паклаўшы рукі на прыпол,
Не чуе і не заўважае,
Што адбываецца наўкол.
Яна усё яшчэ не верыць,
Што смерць тут сховішча
знайшла.
А у двары дзяўбуць сякеры,
Тужліва шаркае піла.
І бацька, зноў зайшоўшы
ў хату,
Не распрамляючы плячэй,
Сказаў: «Сынок!»—і слёзы
раптам
З ягоных пырснулі вачэй.
Сястра, зусім яшчэ малая,
Крыху разгублена глядзіць
І ўжо ў каторы раз пытае:
«А што, Рыгорка доўга спіць?»
Дыміць агаркам свечкі
вечнасць...
Адкрыты вокны у прастор.
А над сялом, як недарэчнасць,
Вясенні высеў буйных зор.

●

Яшчэ пясок смылеў, як прысак,
І дзень спякотны не прачах,
А небасхіл маланку высек,
І дождж паліў на чорны шлях,
На шаты дрэў...

Шумела ўлонне
Клянок, нібыта той хлапчук,
Свае нязграбныя далоні
Падставіў цёпламу дажджу.

І кроплі вільгаці чаканай
Лавіў, нягледзячы на гром.
Яна між пальцаў працякала,
Цякла ў лагчыну раўчуком.

І шыкавала там зайздросна
Між чарналозу і кражоў.
Было не рана і не позна,
Але й не сонечна ужо.

І каля хаты з пахам мяты
Стаяла горыч палыну...
Пасля дажджу ў ляску заўзята
Гулялі хлопчыкі ў «вайну».

●

На глянец сцішаных азёраў,
На задуменнасць сініх рэк
Прысеў нячутна надвячорак,
Як закаханы чалавек,
І зоркі высеяў нясмела,
Бы зерне спелае з сяўні.
І падалося: зазвінела
Няўмольна штосьці ў цішыні.
Каго яна нам нараджала?..
Звон перайшоў у ціхі гул.
То зорка першая упала
Метэарытам на зямлю.

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

СЛАВА НАРОДНАЯ, ГОНАР НАРОДНЫ

ТВОРЧАЕ жыццё сталіцы рэспублікі не спыняецца ні на дзень. Вось і ў выставачных залах Мінска — новыя змястоўныя экспазіцыі. Адна з іх — у гонар 28-й гадавіны вызвалення Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — у залах Саюза мастакоў БССР. Хаця ў экспазіцыю ўвайшлі і выпадковыя, «прахадныя» работы, усё ж досыць выразна вырысоўваецца адна з вядучых тэм сучаснага беларускага выяўленчага мастацтва — мужнасць народная ў гады выпрабаванняў Вялікай Айчыннай вайны. Мы зноў з задавальненнем бачым карціны «Аршанскія партызаны» М. Салідкага, «9 мая. 1945 год» І. Стасевіча, «Макі» М. Залознага, «Мужнасць» А. Казлоўскага, графічныя лісты аб партызанах А. Кашкурэвіча, М. Гуціева, «Памяць» Г. Паплаўскага, «Хатынь» Ю. Зайцава, «Брэсцкая крэпасць» П. Дурчына.

Другая значная палзея ў мастацкім жыцці Мінска — выстаўка твораў беларускіх мастакоў, прысвечаная 90-годдзю з дня нараджэння народных песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Аснова гэтай экспазіцыі — рэтраспекцыя. Есць і новыя творы.

Увачавідкі пераконваешся: у новых творах мастакі працягваюць пошукі новых выяўленчых сродкаў, каб глыбей раскрываць тэму, філасофскі асэнсоўваць яе, акрэсліваючы самае істотнае ў ёй. Бадай, кожны аўтар гаворыць сваёй работай: «Вось ён, мой Купала! Вось ён, мой Колас! Вось яна, мая Беларусь, якая дала ім жыццё і натхненне!..» І — вымаўляецца гэта з рознай інтанацыяй.

...«Купалаўскія радкі» — новая карціна М. Данцыга.

У зямлянцы за сталом дзяўчына - партызанка пры святле агарка, замацаванага ў гільзе артылерыйскага снарада, чытае кніжку Купалавых вершаў... Вайна і прыгажосць... Аўтаматы і музы... Нянростая тэма!.. Такія, як гэтая партызанка, — заўжды прыгожыя. І гэта мастак выказаў пераканальна.

У. Стальмашонак, які некалі пачынаў з жанравых палотнаў, цяпер з кожнай новай работай імкнецца ўсё больш паслядоўна і поўна вырашаць праблему манументальнага мастацкага вобраза. Пад манументальнасцю тут я маю на ўвазе перш за ўсё спосаб мыслення, светаўспрыняцця. Вось і ў новай карціне «Слова пра Беларусь» мастак раскрывае тэму Радзімы, адметна трактуючы агульначалавечае ў вобразах волатаў беларускай культуры. Мастак імкнецца нагадаць нам пра жыватворныя сілы роднай зямлі, пра народныя выточкі творчасці сродкамі, непадобнымі на ўжо апрабаваныя. Асацыятыўны лад карціны вымагае ад гледача ўнутранага напружання. Патрабуе ўсведамлення таго, што на ідэю твора працуе тут і сюжэт, і пластыка.

На актыўнасць эмацыянальнага суперажывання гледача разлічана і новая карціна М. Савіцкага «Сейбіты». Тут асацыяцыі — шырокага ладу: і складанасць пачуцця, і выразнасць строгай арганізацыі палатна, і рацыянальнасць пластычнай сістэмы. Мабыць, на нейкім адметным скрыжаванні эмацыянальнага і рацыянальнага і шукае сёння М. Савіцкі тую гармонію і завершанасць вобразнага ладу, да якой ён заўсёды імкнецца.

Прыгожая, тонкая па колеры карціна А. Кішчанкі «Прысвячаецца паэту». Яна ў пэўным сэнсе слова спрэчная, таму што ў ёй сімволіка «спрачаецца» з рэальнасцю. Думаецца, сёе-тое ў кампазіцыйных адносінах навеяна тут карцінаю «Чэ Гевара» Рэната Гутуза. Палатно А. Кішчанкі, мне здаецца, павінна было б мець некалькі інакшую структуру і сэнсавую арганізацыю.

Шмат жывапісных апавяданняў на выстаўцы звязана з тымі ці іншымі фактамі біяграфіі паэтаў. Цнатліва светлая карціна В. Сахненкі «Настаўнікі». Даўно ўжо вядомая гледачу і кампазіцыя «Янка Купала і Кузьма Чорны ў Печышчах. 1942 год» Х. Ліўшыца. Хвалююць і жанравыя карціны «Янка Купала і Якуб Колас па дарозе ў Канеў» А. Шаўчэнкі, «Янка Купала і Цётка ў Пецярбурзе» А. Кроля, «На возеры Нарач» І. Давідовіча, «Першы арышт» М. Беляніцкага.

Жыццёвая сіла, напружанасць думкі—у скульптурных партрэтах Якуба Коласа, выкананых А. Глебавым, Д. Шварцам, У. Ананькам. «Дум высокае імкненне» — у мадэлі помніка Якубу Коласу, выкананага З. Азгурам.

Увагу гледачоў несумненна прыцягне карціна-партрэт Л. Дударэнкі, прысвечаная Янку Купалу, — «Бацькаўшчына». Графічныя партрэты паэта стварылі С. Герус, В. Шаранговіч, І. Раманоўскі.

Значнае месца ў экспазіцыі належыць лірычнаму і мемарыяльнаму пейзажу.

Прыгожыя і тэмпераментныя, прасякнутыя светлым адчуваннем навакольнага, пейзажы Б. Цвірко, напісаныя ў розных мясцінах Беларусі, у тым ліку і ў звязаных з Купалам і Коласам. Гэта вобразы тонкага лірызму, сапраўднай акрылёнасці.

Прыгожыя, віртуозна выкананыя манатыпіі А. Гугеля «Цішыня», «Асенні матыў». Стрыманая гама высакародных, ясных тонаў.

«Купалаўскі край», «Восень у Вязынцы» — новыя работы В. Вярсоцкага. Мастак уважліва ўглядаецца ў асаблівасці асвятлення, шукае колерныя спалучэнні, уласцівыя канкрэтнаму моманту жыцця прыроды.

Нёманскія пейзажы Н. Воранава тонка перадаюць трапяткое хваляванне, якое ўзнікла ў душы мастака ад коласаўскіх мясцін.

У жывапісных пейзажах «Хутар Альбуць» С. Катюра, «На радзіме Янкі Купалы» А. Малінаўскага, «У саўгасе імя Янкі Купалы» І. Карасёва, «Вуліца Янкі Купалы» А. Кроля, у графічных лістах «Якуб Колас» і «На радзіме Янкі Купалы» Ю. Тышкевіча, у акварэлях «Рака Нёман. Мікалаеўшчына» і «Вязынка» Я. Красоўскага — глыбока творчае даследаванне роднай прыроды.

Бездакорны па колеры, выразны, прадуманы ва ўсіх дэталях кампазіцыі нацюрморт Г. Вашчанкі: сялянская ежа, атрыбуты сялянскага інтэр'ера. Трывалы дабрабыт. Простае, здаровае жыццё...

Кніжная графіка... Мастакі шукаюць найбольш выразныя рашэнні. Магчыма, гэта самы складаны від ілюстравання — пераказваць паэзію моваю графікі... Кожны чытае Купалу і Коласа пасвойму.

У серыі выключных па густсце графічных лістоў А. Кашкурэвіча паводле матываў купалаўскай паэзіі — беражлівае стаўленне да першакрыніцы. Даўно палюбіліся гледачам аўталітаграфіі Г. Паплаўскага паводле матываў Коласавай «Новай зямлі»...

А побач — даве цудоўныя гуашы А. Паслядовіча да гэтай жа паэмы. Яны—у інакшым ключы, на іншай пластычнай аснове.

Літаграфіі Н. Паплаўскай да Коласавага «Сымона-музыкі»... Вобразы надзвычай інтымныя. Яны ўвасабляюць узвышаныя чалавечыя пачуцці.

Выяўленчы эквівалент Купалавым вершам «А хто там ідзе?» і «Мужык» шукае Б. Забораў. Яго літаграфіі на гэтыя тэмы — манументальныя, змястоўныя. Звязаныя адзінай мастакоўскай задумай, гэтыя лісты быццам спалучаюць у сабе напружанасць руху з устойлівай раўнавагай мас. Тут валявая скіраванасць Купалавых герояў да лепшай долі перададзена музычнай выразнасцю графічных рытмаў.

Імкненне абнавіць мову гравюры — у ілюстрацыях В. Шаранговіча да Купалавых паэм «Адвечная песня», «Адплата кахання». Тое ж — у яго ілюстрацыі да Купалавага верша «Касец».

Хвалюешся, знаёмячыся з лаваннай яшчэ спробаю І. Гембіцкага стварыць ксілагравюры да Коласавай «Дрыгвы».

Зноў і зноў прыгадваю ўбачанае на выстаўцы. Яна па-сапраўднаму змястоўная.

Барыс КРЭПАК.

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

БАБУЛЯ, АДЧЫНІ КУФАР!

ГУТАРКА З ДЫРЭКТАРАМ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ДОМА НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ Г. ТАЛЧЫНСКАЙ

На адным з тэматычных вечароў у сельскім клубе на Гомельшчыне запомнілася сцэнка: хлопцы ў нацыянальных касцюмах вынеслі на сцэну куфар і, вымаючы з яго посцілкі, паясы, ручнікі, раскрывалі іх перад гледачамі, каб тыя лепш маглі разгледзець. І сімпатычная Лявоніха выкрыкнула ў залу: «Каб вы, маладыя, не забывалі; гэтак жа ткалі ды вышывалі!»

А потым зусім у другім кутку Беларусі, на Гродзеншчыне, я паглядзела невялічкую школьную выстаўку. Незвычайнай прыгажосці вышыўкі на кашулях, ручніках, паясах... Многія з іх—амаль стогадовай даўнасці. Не шкадуючы ні сіл, ні часу, збіралі іх па навакольных вёсках настаўнік беларускай мовы Гудзевіцкай сярэдняй школы Аляксандр Мікалаевіч Белакоз і яго вучні. Тады падумалася: гэта ж толькі ў апошнія гады пачалася ў нас шырокая прапаганда народнай творчасці, а колькі сапраўды бясцэнных экспанатаў так і не будзе знойдзена, таму што позна... Але добра, што вось цяпер маладыя выхоўваюцца ў павазе да скарбаў народа, самі спрабуюць сябе і ў разьбе, і ў вышыўцы, і ў ганчарстве. Добра, што пачынаюць адраджацца некалі шырока распаўсюджаныя промыслы: пляценне з лазы, саломы, бяросты, народны роспіс. Вось аб гэтым—адраджэнні адных відаў народнай творчасці, далейшым росце другіх, праблемах, звязаных з імі,—гаварылі мы з дырэктарам Рэспубліканскага дома народнай творчасці Ганнай Мікітаўнай Талчынскай.

— Ганна Мікітаўна, а колькі ўвогуле народных майстроў і самадзейных мастакоў налічваецца ў рэспубліцы?

— Больш за 10 тысяч. Гэта толькі тыя, якіх мы ведаем: яны працуюць пры фабрыках мастацкіх вырабаў (дарэчы, па нашых рэкамендацыях), у сістэме мастацкай прамысловасці БССР. А многія ж нашы раёны яшчэ зусім не даследаваны, пра многіх майстроў мы ўвогуле не ведаем. Гэта, па-першае, таму, што работа з народнымі майстрамі вядзецца, у асноўным, рэспубліканскім і абласнымі дамамі народнай творчасці. А два метадысты ў рэспубліканскім і па адным метадысце ў абласных дамах народнай творчасці—яны ж не могуць весці гэтую работу, як належыць. Дзесяць чалавек на 116 раёнаў! Лічбы гавораць самі за сябе... Па-другое, у саміх раёнах няма чалавека, які б сачыў за работай народных майстроў, аказваў ім метадычную дапамогу, хаця б арганізаваў іх улік. Вось калі трэба арганізаваць выстаўку—тады іншая справа. Але выстаўкі бываюць параўнаўча не часта.

— А чаму б не накіроўваць у раёны спецыялістаў, каб яны на месцах правялі кансультацыю, дапамаглі творчай парадай?

— Мы выкарыстоўваем літаральна кожную такую магчымасць, але ў нас яшчэ не хапае сродкаў на камандзіровачныя выдаткі і зарплату для няштатнікаў. Відаць, настаў ужо час перагледзець існуючыя нормы камандзіровак, гэтак жа, як і зарплату метадыстам рэспубліканскага і абласных дамоў народнай творчасці. Па гэтай прычыне нам цяжка падбіраць на штатныя пасады спецыялістаў высокай кваліфікацыі.

— І ўсё-такі за апошнія гады мно-

КАБ РАБОТЫ ГУЧАЛІ «ФОРТЭ»

Яго чуць хітраватыя вочы нібы вышукваюць смешнае; здаецца, ён пастаянна настроены востра пажартаваць. Гэта ясна адчуваецца і ў яго работах, якія заўсёды нясуць у сабе адценне гратэску — нават калі яны зусім не гумарыстычныя па сваім характары.

Гратэскнасць — адметная рыса творчага почырку кераміста Аляксандра Зіменкі. Яна — у змененых прапорцыях, у агульнай пабудове малюнка, у знарочытай акругленасці ліній ці,наадварот, у крыху большай, чым звычайна, іх вуглаватасці. Зіменка падкрэслівае, гіпербалізуе, завастрае. Гэта праяўляецца не толькі ў форме, такі — сам стыль яго мастацкага мыслення. Вось як, напрыклад, расказвае Аляксандр аб сваёй новай рабоце — афармленні інтэрната персанальных пенсіянераў.

— Разумееш, тут будуць жыць старыя людзі. Старым не зусім лёгка арыентавацца ў паверхах, калі ўсе яны акажуцца аднастайнымі. Другі можна будзе зблытаць з трэцім, трэці — з чацвёртым. Я вырашыў афарміць адзін з паверхаў пад зіму — на пано вялізная сняжынка, другі пад лета — матылёк, і гэтак далей. Не патрэбна будзе лічыць, дзе які паверх, — ужо не зблытаеш!

У гэтых словах — амаль увесь Зіменка-мастак, які імкнецца да максімальнай выразнасці, да таго, каб яго работы гучалі «фортэ». Ён смела і шмат эксперыментуе, шукае новыя формы, новыя прыёмы. Але гэта не навацыі дзеля навацыі. Пачуццё меры, густ і вельмі сур'ёзныя адносіны да сваёй працы дазваляюць мастаку нават у самых сваіх незвычайных «фантазіях» застацца ў межах мастацтва.

Відаць, кераміцы пэўнае імкненне да сімвалічнасці ўласціва ў сілу таго, што яна не можа даць столькі дэталяў, намаляваць такую падрабязную карціну, як любы іншы від выяўленчага мастацтва. і таму патрабуе абагульненняў. Абагульненне ж — падстава і перадумова сімволікі. Гэтая спецыфіка керамікі выявілася ў першай жа вялікай рабоце Аляксандра — афармленні інтэр'ера Беларускага аддзялення АДН. Тры ідэі выказваюцца трыма гранічна лаканічнымі сімваламі, якія робяцца дэталямі насценнай керамікі. Ідэя самой перадачы інфармацыі (дзве літары на вагах), ідэя залежнасці інфармацыі ад часу (літары на цыферблаце), ідэя перамогі святла ведаў над цемрай невуцтва (сонца і месяц). Вельмі простыя (хаця і стылізаваныя) формы нясуць тут вялізную сэнсавую нагрузку. Гэта — крок да выканання галоўнай мары Аляксандра Зіменкі: даказаць, што кераміка—такое ж мастацтва, як і жывапіс, скульптура, графіка, што яна дае магчымасць вырашаць любыя, самыя буйныя і складаныя творчыя задачы.

Гумарыстычныя работы — наогул рэдкасць у кераміцы — складаюць большасць твораў Аляксандра. Яны дэманструюць амаль усе адценні гумару — ад мяккага жарту да рэзкай, жорсткай сатыры. Проста вясёлая, напрыклад, работа «Матылькам львы не страшныя», а сатырычная група «Пляткары» — сацыяльна завостраная, «злая», бескампрамісная. Зараз Аляксандр працуе над партрэтнай серыяй, дзве работы з якой ужо гатовыя,—гэта «Крытык» і «Мастак». Фігурка крытыка, выкананая са з'едлівай іроніяй, нагадвае шчадрынскіх персанажаў. «Мастак» больш мяккі (адбіліся, відаць, прафесійныя пачуцці аўтара). «Крытык», бадай, уяўляецца нават страшнаватым, але штосьці робіць яго толькі смешным. Што?

— Прапорцыі, — тлумачыць Аляксандр. —Я адкрыў адзін цікавы закон (крыху пазней, праўда, даведаўся, што ён даўно ўжо вядомы псіхолагам). Ты заўважыў, што шчаняты, кураняты і г. д. выклікаюць замілаванне, жаданне іх палашчыць? Гэта, як ні дзіўна, ад таго, што ў іх вялікая галава — такія прапорцыі асацыіруюцца з уяўленнем аб дзяцінстве. Вось і «Крытыку» галаву я зрабіў адзін да трох, і фігурка ўжо не выклікае пачуцця небяспекі, робіцца смешнай.

Зіменка-мастак не абмяжоўвае сябе керамікай. Яго прыцягвае і графіка, і жывапіс, якімі ён збіраецца заняцца як след. Пакуль што Аляксандр толькі спрабуе свае сілы ў гэтых жанрах, шукае сябе — і вынікі атрымліваюцца цікавыя.

Цікава, што сімволікі на палотнах Зіменкі значна больш, чым у кераміцы, — асабліва гэта відаць у серыі «Гульня», задума якой, дарэчы, нарадзілася зусім выпадкова — са спрэчкі з настаўнікам аб тым, чым павінна быць творчасць — працай ці ў нейкай ступені гульнёй.

Нягледзячы на тое, што вынікі сваёй працы Аляксандр ацэньвае сур'ёзна, да самога яе працэсу ён адносіцца «лёгка», трымаючыся пункту гледжання, што калі творчасць пачынае стамляць, яна перастае быць творчасцю. Аднак Зіменка працуе шмат і ўжо дабіўся пэўных поспехаў. Ён, адзін з самых маладых мастакоў Беларусі, прадстаўляў нашу рэспубліку на Усесаюзнай выстаўцы керамістаў у Вільнюсе, адна з яго работ экспануецца ў ленінградскім Рускім музеі.

— Два чалавекі асабліва моцна дапамагаюць мне ў працы, — прызнаецца Аляксандр. — Гэта — мая мама і мастак М. Савіцкі, які літаральна шэфствуе нада мной.

Упершыню асаблівасці светаадчування Аляксандра Зіменкі як мастака пачалі праяўляцца яшчэ ў школе, дзе ён маляваў дэкарацыі да сустрэч клуба вясёлых і знаходлівых. Дэкарацыі гэтыя, зразумела, трэба было не проста намаляваць, а зрабіць вострымі, смешнымі, лаканічнымі—і Аляксандр спраўляўся з гэтым. Тады ж пачалі развівацца і яго арганізатарскія здольнасці: ён стварыў у школе мастацкі савет, які з поспехам афармляў школьныя інтэр'еры.

Выбіраючы прафесію, традыцыйных у такіх выпадках вагання Аляксандр не адчуваў. Ён ужо ведаў, што не можа жыць без малюнкаў, без лепкі, без жывапісу. Афармленне аддзялення АДН было яго дыпломнай работай у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце. Яму прапанавалі застацца ў аспірантуры, але ён абраў іншы шлях...

— Ведаеш,—смяецца Аляксандр,— я падумаў: што лепей — самому пісаць пра іншых, альбо каб іншыя пісалі пра цябе?.. Я—мастак і як мастак магу стварыць нешта новае, яшчэ невядомае, а як тэарэтык я гэтага зрабіць, відаць, не здолею.

Зрэшты, мастацтвазнаўчая праца ўсё ж прываблівае Зіменку. На стале Аляксандра ляжаць грэнкі яго артыкула, які рыхтуецца да друку ў часопісе «Декоративное искусство».

Зараз у Зіменкі шмат працы. Нядаўна ён атрымаў заказ ад Беларускага тэлебачання на медаль для міжнародных спаборніцтваў па пяціборстве. Медалі—адзін з любімых «жанраў» Аляксандра, яны яму ўдаюцца, і ён ахвотна іх робіць. У мінулым годзе, напрыклад, стварыў камплект медаляў для ўдзельнікаў добра вядомай мінчанам выстаўкі «Фотаграфіка-71». І ў медалях таксама—дзе больш, дзе менш—адчуваецца тонкая ўсмешка і, гэта галоўнае, багаты ўнутраны свет аўтара—тое, што ўтварае стыль Зіменкі-мастака.

У Аляксандра няма якойсьці адной асноўнай тэмы («Навошта сябе абмяжоўваць?»), але ў яго ёсць свой почырк — вельмі выразны, своеасаблівы. Зіменка — «радыкал», як ён сам сябе называе—бачыць рэчаіснасць востра, арыгінальна, свежа, па-свойму.

М. КАЛОМЕНСКІ.

КАБ БАГАЦЕЎ РОДНЫ КРАЙ

Прыцягнуць увагу людзей да прыроды, навучыцца правільна выкарыстоўваць багацці нашых лясоў, азёраў, рэк — такая мэта рэспубліканскага конкурсу на лепшае асвятленне ў друку праблем, звязаных з аховай прыроды.

Конкурс на працягу трох год праводзяць Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па ахове прыроды, Рэспубліканскія саветы Беларускага таварыства аховы прыроды і Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў.

Як адзначае журы конкурсу, у гэтым годзе ў ім прымае ўдзел каля 20 творчых калектываў.

Лепшай прызнана рэспубліканская «Сельская газета», якая шырока асвятляе пытанні землеўладання, рацыянальнага выкарыстання водных рэсурсаў. На старонках газеты часта выступаюць вучоныя, спецыялісты, работнікі лясной гаспадаркі, калгаснікі.

Другія прэміі прысуджаны абласной газеце «Віцебскі рабочы» і Гомельскай студыі тэлебачання.

«Настаўніцкая газета», «Звязда», Брэсцкая абласная газета «Заря» ўдастоены трэціх прэмій.

Дыпломы і прэміі за лепшыя аўтарскія матэрыялы, за арганізацыйна-масавую работу прысуджаны настаўніку сельскай школы Р. Ігнаценку, журналістам А. Касенку, В. Старцаву, А. Сцепанцу, І. Тэвелеву, мастацкаму рэдактару «Бярозкі» П. Драчову.

ЧАЧЭРСКІ РАЁННЫ АДДЗЕЛ КУЛЬТУРЫ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ ЗАПРАШАЕ НА РАБОТУ У ФІЛІЯЛ МУЗЫЧНАЙ ШКОЛЫ У САУГАСЕ «МЯРКУЛАВІЧЫ» ВЫКЛАДЧЫКАЎ ПА КЛАСЕ БАЯНА І ТЭОРЫІ МУЗЫКІ.

СЯМЕЙНЫМ ПРАДАСТАЎЛЯЮЦЦА КВАТЭРЫ.

Звяртацца: г. Чачэрск, раённы аддзел культуры, тэл. 2-17-50 або 2-18-50.

Супрацоўнікі Літаратурнага музея Якуба Коласа выказваюць глыбокае спачуванне вучонаму сакратару музея М. І. Пратасевічу з прычыны напатнаўшага яго вялікага гора — смерці БАЦЬКІ.

гае зроблена. Я маю на ўвазе і колькасць майстроў, якая з кожным годам павялічваецца, і шматлікія выстаўкі, і, нарэшце, альбомы лепшых работ народных умельцаў, якія цяпер можна знайсці ў нашых магазінах.

— Дадайце да гэтага і значную метадычную дапамогу, якую мы аказваем на месцах—абагульненне вопыту, выпуск метадычных дапаможнікаў, праграму па асновах народнага мастацтва Беларусі для інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры... і многае іншае. Рэспубліканскім домам народнай творчасці ўстаноўлены цесныя сувязі з Саюзам мастакоў, з кафедрамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, а таксама з Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Нашы супрацоўнікі ўдзельнічаюць у рабоце рэспубліканскіх мастацкіх саветаў, дзе разглядаюцца работы народных майстроў.

Але я лічу, што работу па развіцці народнай творчасці мы павінны з кожным годам паляпшаць, уважліва вывучаць тэндэнцыі яе развіцця, вынаходзіць для гэтага новыя рэзервы.

— Што вы маеце на ўвазе?

— Думаю, што дзейнасць дамоў народнай творчасці павінна быць пастаўлена на навуковую аснову. Не толькі метадычныя цэнтры па рабоце з мастацкай самадзейнасцю, але і навукова-даследчыя ўстановы —вось пры якой умове дамы народнай творчасці будуць адпавядаць сучасным патрабаванням. Гэта значна пашырыць і сферу дзейнасці дамоў народнай творчасці, і іх уплыў.

— Ці дапамагаюць вам у прапагандзе народнай творчасці прафсаюзныя, камсамольскія арганізацыі?

— Пакуль што малавата. Мы яшчэ шукаем формы цеснага супрацоўніцтва. І не толькі з гэтымі ўстановамі, але і з дамамі мастацкай самадзейнасці, якімі кіруе Рэспубліканскі савет прафсаюзаў (у адрозненне ад дамоў народнай творчасці, якія падпарадкоўваюцца Міністэрству культуры БССР). Здараецца, што яны дублююць нашу работу: не знаходзяць новыя таленты, а працуюць з даўно вядомымі ў дамах народнай творчасці майстрамі. Тыя часам атрымліваюць супярэчлівыя парады і рэкамендацыі. Гэта ідзе не на карысць агульнай справе. Што ж датычыць іншых устаноў, то ў арганізацыі фестываляў, аглядаў мастацкай самадзейнасці ўдзельнічаюць і органы культуры, і прафсаюзныя ўстановы, і гаркомы, райкомы камсамола. Іх ацэнка пры падрыхтоўцы фестываляў, аглядаў мастацкай самадзейнасці можа быць слушнай.

Дабіваемся таксама, каб абласныя ўпраўленні культуры штогод выдзялялі і прадугледжвалі ў кашторысе сродкі для таго, каб набываць лепшыя творы народных майстроў у фонды музеяў і для калекцый абласных дамоў народнай творчасці.

— Дарэчы, аб зборы экспанатаў. У абласных ДНТ, у вас ёсць такія калекцыі. Але яны, відаць, не задавальняюць патрэбы ў наглядным, як кажуць, «матэрыяльнай» прапагандзе народнай творчасці?

— Безумоўна. Як ніколі востра паўстае зараз пытанне аб пастаяннай экспазіцыі народнай творчасці. Экспазіцыі, для якой мы рэгулярна збіралі б экспанаты і якая ў будучым стала б асновай для музея народнага мастацтва Беларусі. Мы марым аб такім музеі. Канечне, для гэтага патрэбен і час, і сродкі, але пачынаць можна ўжо цяпер. Узяць хаця б конкурс па збору народнай творчасці: нядаўна аб'явілі, а ўжо пішуць нам настаўнікі, школьнікі, рабочыя, прысылаюць тэксты, ноты. Энтузіястаў народнай творчасці з кожным годам бо́льшае, і стварэнне музея — не такая ўжо недасягальная задача.

У стадыі вырашэння і другая наша прапанова: аб стварэнні тэлевізійнага тэатра народнай творчасці. Тут таксама ёсць свае цяжкасці, але, калі кіраўніцтва Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні пойдзе нам насустрач, мастацкія калектывы, асобныя выканаўцы, майстры мастацкіх вырабаў атрымаюць новы стымул для сваёй творчасці, магчымасць абмяняцца вопытам. Ахвотней пойдзе ў самадзейнасць моладзь...

— Увогуле, калі глядзець на ўдзел моладзі ў развіцці народных промыслаў, то відаць, што яшчэ мала маладых вырабляюць прыгожыя беларускія сувеніры, мастацкія вышыўкі, тканіны. А ў мастацкай самадзейнасці таксама магло б быць куды больш удзельнікаў?..

— Сапраўды, у развіцці мастацкай самадзейнасці мы павінны арыентавацца на моладзь. Асабліва мала ўдзельнічае яна ў гуртках выяўленчага мастацтва, тэхнічнай творчасці, кіна- і фотагуртках. Ды і саміх гуртко́ў мала: усяго 43 калектывы выяўленчага і 204 кінафотамастацтва на рэспубліку. І гэта ў сферы самых сучасных відаў мастацтва!

Мы забываем пра тое, што выпускнікі інстытутаў атрымліваюць «другую прафесію», якая можа нам вельмі і вельмі дапамагчы. Абавязкова трэба праз раённыя аддзелы культуры прыцягваць маладых спецыялістаў да работы ў гуртках, да прапаганды народнага мастацтва. Мы павінны выкарыстоўваць гэтую «другую прафесію» як мага паўней. І ставіць пытанне так: юнак і дзяўчына павінны не толькі цікавіцца, што знаходзіцца ў бабуліным куфры, але і самім папаўняць вялізную і шчодрую скарбонку народнага мастацтва...

В. БЕЛЯЗЕКА.

СУСТРЭЧЫ З ЦІКАВЫМ

Чатыры дні ў Бярозаўскім раёне гасцявалі галоўны рэжысёр Маскоўскага тэатра сатыры В. Плучак, загадчык літаратурнай часткі тэатра М. Лінецкая і беларускі драматург А. Макаёнак.

Яны сустрэліся з працаўнікамі калгаса «Запаветы Леніна», саўгаса «Прамень», пабывалі на Бярозаўскай ДРЭС імя 50-годдзя БССР, птушказаводзе «Альшэўскі».

У адзін з дзён адбылася сустрэча гасцей з членамі літаб'яднання «Крыніца», на якой В. Плучак цікава расказаў аб законах творчасці, аб уменні мастака «бачыць і чуць» навакольны свет, аб патрабавальнасці мастака да сябе. Ён паведаміў аб тым, што Маскоўскі тэатр сатыры вельмі зацікаўлены тэмай сучаснай вёскі. Гэтай тэме прысвечана п'еса А. Макаёнка, над якой зараз працуе драматург.

А. Макаёнак расказаў аб рабоце над п'есамі, адказаў на шматлікія пытанні.

М. Лінецкая коратка азнаёміла прысутных з тым, над якімі творамі зараз працуе тэатр.

●

У Бярозаўскім райкоме партыі адбылася сустрэча народнага паэта Беларусі М. Танка з членамі літаратурнага аб'яднання «Крыніца».

М. Танк расказаў аб сучасным стане беларускай літаратуры, аб яе інтэрнацыянальных сувязях з літаратурамі братніх рэспублік і зарубежных краін. З цікавасцю быў выслуханы расказ народнага паэта аб творчасці — пошуку тэмы, патрабавальнасці аўтараў да сябе, уменні адбіраць галоўнае і г. д.

Я. СЯЛЕНЯ.

Днямі ў інстытуце «Мінскпраект» адкрыўся новы народны кніжны магазін, арганізаваны на сродкі і пры ўдзеле аматараў літаратуры. На грамадскіх асновах дырэктарам магазіна працуе інжынер Аляксей Школьны, прадаўцамі — старшы інжынер Валерыя Піражкова, архітэктар Яўгенія Сап'янік і тэхнік Тамара Хорт. Тут прадаецца мастацкая, палітычная літаратура, літаратура па архітэктуры і мастацтве.

Гэты здымак зроблены ў час адкрыцця народнага кніжнага магазіна.

Фота Ул. КРУКА.

МАСКОЎСКІ ТЭАТР З МАЛОЙ БРОННАЙ—У МІНСКУ

Толькі за першую палавіну гастроляў на спектаклях тэатра пабывала звыш 28 тысяч мінчан і гасцей сталіцы, і гэта далёка не поўная лічба тых, хто так ці інакш далучаецца да мастацтва тэатра, творчасці яго акцёраў.

Па некалькі творчых сустрэч з гледачамі правялі артысты С. Сакалоўскі і Г. Сайфулін. На гэтых сустрэчах акцёры расказвалі аб сваёй творчасці, дэманстравалі ўрыўкі з кінафільмаў, адказвалі на шматлікія пытанні. Некаторыя акцёры тэатра падтрымліваюць творчыя кантакты з беларускім кіно і цяпер здымаюцца на «Беларусьфільме». Так, артыст Л. Дураў здымаецца ў фільме рэжысёра Б. Сцяпанава «Воблакі», дзе іграе адну з цэнтральных роляў. Яго герой Лёнька — чалавек неспакойны, увесь у пошуках, ён ідзе па жыцці сваім шляхам. Прымае ўдзел акцёр і ў фільме «Зямля, да запатрабавання» рэжысёра В. Дормана, які прысвечаны савецкаму разведчыку Льву Маневічу. Дарэчы, у гэтым фільме здымаецца і другі акцёр тэатра Л. Канеўскі, вядомы нашаму гледачу па шэрагу работ у кіно. Зараз Л. Канеўскі здымаецца і ў камедыі рэжысёра А. Ігішава «Вось і лета прайшло», дзе выконвае ролю дзядзькі Аліка — любімца і вялікага сябра юнага героя фільма.

У гэтыя дні на Беларускай кінастудыі і на здымачнай пляцоўцы ў Наваполацку, дзе ідуць натурныя здымкі, можна сустрэць і Б. Кудраўцава: ён заняты ў фільме рэжысёра І. Дабралюбава «Вуліца без канца» ў ролі Ярошкі, былога франтавіка, Героя Савецкага Саюза, а цяпер мантажніка-высотніка. Гэты фільм — аб рабочым класе нашай рэспублікі, ён павінен выйсці на экраны ў пярэдадзень святкавання 50-годдзя Савецкага Саюза.

Гастрольныя будні маскоўскага тэатра ў Мінску вельмі насычаныя: два спектаклі кожны вечар, плюс два ранішнія спектаклі ў суботу і нядзелю, і рэпетыцыі. І ўсё ж акцёры знаходзяць магчымасць сустрэцца са сваімі гледачамі на прадпрыемствах. Такая сустрэча, напрыклад, адбылася 14 ліпеня на Мінскім маторным заводзе. Гаспадары сустрэлі акцёраў з радасцю, пазнаёміліся з сэрцам завода—зборачным канвеерам, з якога праз кожныя дзве з паловай мінуты сыходзіць новенькі матор для трактара «Беларусь». Намеснік старшыні заўкома М. Касарэвіч расказаў аб заводзе, аб яго планах на будучае, аб людзях, якія працуюць у яго цэхах. Акцёры далі канцэрт. Сцэны са спектакляў, сцэнкі і скетчы ў выкананні артыстаў Г. Васільева, А. Левінсон, Т. Давыдава, В. Платава, Л. Платонава, Н. Глазунова, А. Шыршова былі цёпла сустрэты рабочымі. Арганізатары сустрэчы паднеслі гасцям кветкі, падарылі памятныя значкі.

За час знаходжання ў Мінску маскоўскія артысты наведалі яго музеі і выдатныя мясціны, выязджалі ў Хатынь і на Курган Славы.

Было і такое — тэатр наладзіў таварыскі футбольны матч з камандай завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. І хоць гульня закончылася з лікам 7:1 не ў карысць зборнай тэатра, артысты не засмучаюцца, бо над усім панавалі добры настрой, шчырасць, дружба.

К. БЕЛАВУСАЎ.

РАДКІ З ПІСЕМ

□ Дзесяць дзён у Лунінецкім раёне праходзіла дэкада братняй Украіны, прысвечаная 50-годдзю ўтварэння СССР.

У Лунінцы пабывала вялікая дэлегацыя Сарненскага раёна. У калгасах і саўгасах, на прадпрыемствах былі арганізаваны гутаркі і даклады аб дасягненнях Савецкай Украіны, аб брацкай дружбе ўкраінскага і беларускага народаў.

У дэкадзе прынялі ўдзел і мастацкія калектывы Украіны: танцавальны ансамбль «Пралеска», вакальна-інструментальны ансамбль «Верас», а таксама народны хор калгаса імя Ватуціна — лаўрэат Усесаюзнага і рэспубліканскага фестываляў.

Ф. НЕФІДОВІЧ.

□ Гарачыя дні стаяць на палях рэспублікі. У гэты час, калі працаўнікі вёскі старанна вядуць нарыхтоўку сенажу, агітбрыгады выступаюць з канцэртамі на лугах і сенажацях. Толькі за два дні — у суботнік і нядзельнік, што праводзіўся 24 і 25 чэрвеня, агітбрыгада Тураўскага дома культуры дала пяць канцэртаў для хлебаробаў калгасаў «Савецкая Беларусь», імя Калініна, «Шлях да камунізма» і ў іншых гаспадарках.

І. НОВІКАЎ.

□ Гродзенскі абласны драматычны тэатр сыграў спектакль «Блудны сын» латышскага драматурга Р. Блаўманіса.

Гэта трэцяя пастаноўка калектыву, збор з якой паступіў у фонд міру.

Ул. ДЗЕМІН.

□ Жыхары Казахстана цёпла прымалі гасцей з братняй Беларусі—маладзёжны эстрадны ансамбль «Песні над Сожам». Гамяльчане далі некалькі канцэртаў у Карагандзе і ў гарадах-спадарожніках Абаі, Шахцінску, Сарані, Тэміртау.

А. КІТАЕЎ.

□ У госці да хлебаробаў калгаса імя ЦК КПБ Пухавіцкага раёна нядаўна прыязджалі артысты Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета. Спявак А. Ніканораў выканаў беларускія народныя песні, салісты балета В. Храброва і В. Нязанава — танцавальныя нумары.

М. ШМАРЛОЎСКІ.

СПЯВАЕ «ВЯСНЯНКА»

На самым поўдні Палесся шмат песенных вёсак. Адна з такіх — Ліпляны, цэнтр калгаса «За камунізм». З пакалення ў пакаленне перадаюць тут песенную спадчыну.

Ужо 20 гадоў, як у вёсцы Ліпляны існуе калектыў мастацкай самадзейнасці. А пяць год назад узнік дзявочы вакальны ансамбль «Вяснянка». Кіруе ім Наталля Лось, загадчыца клуба. А спяваюць, апроч яе, Таня Шчабетнік — галоўны бухгалтар калгаса, Аня Халько — аграном, Ніна Лось — работніца мясцовага цагельнага завода і яшчэ дзяўчаты.

Ансамбль часта выязджае з канцэртамі да суседзяў. Сёлета яго бачылі ў многіх калгасах і саўгасах раёна.

В. ЯРАЦ, В. ЗЯЛЕНКА,
работнікі
Гомельскай студыі
тэлебачання.

Што пішуць пра нас

УЗНІМІСЯ, ЧАЛАВЕК!

У абласной газеце «Рабочий край» № 133 за гэты год апублікавана рэцэнзія на спектакль «Рамэо і Джульета» Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра, які сёлета гастралюе ў Іванаве. Ніжэй перадрукоўваем рэцэнзію з невялікімі скарачэннямі.

...Тэатр пачаў размову з гледачамі спектаклем «Рамэо і Джульета». Гуманістычныя ідэі свабоды, чалавечнасці, радасці жыцця, чысціні і глыбіні пачуццяў, якія складаюць сутнасць бессмяротнай трагедыі Шэкспіра, патрэбныя і блізкія сучаснаму чалавеку. Выклік, які кінулі юныя закаханыя з Вероны ханжаскаму свету, не можа не хваляваць нас.

Пастаноўшчык спектакля — галоўны рэжысёр тэатра У. Караткевіч — рэалізаваў у вобразным рашэнні ўсё тое, што робіць трагедыю Шэкспіра з'явай нашага часу. Адсюль — зусім апраўданы лаканізм формы, які выдатна спалучаецца з глыбінёй думкі і сацыяльна - псіхалагічнай характарыстыкай персанажаў. Шырока адкрытая сцэнічная пляцоўка, вызваленая ад усяго лішняга (мастак спектакля Ю. Тур), дала прастору акцёрскай творчасці. І спектакль ідзе ў напружана-хуткім тэмпе, які дакладна адпавядае абвалу падзей і фатальных выпадковасцей, што прыводзяць да пагібелі — і да перамогі — Рамэо і Джульету. Узніміся, чалавек, і перамажы зло!

І сіла праўды, і шчырасць пачуццяў перамагаюць у гэтым шэкспіраўскім шэдэўры.

У трупе нашых гасцей многа цікавых акцёраў. Гэта паказаў і першы спектакль. Атрымалася так, што звычайныя гастрольныя цяжкасці ўскладніліся неабходнасцю замены ў апошні момант выканаўцы ролі Рамэо (артыст не здолеў прыехаць у Іванава). І гледачы аказаліся сведкамі своеасаблівага дэбюту: ролю Рамэо сыграў сам рэжысёр У. Караткевіч. Не экспромтам, вядома. Бо як пастаноўшчык ён прадумваў усе нюансы ролі. Але толькі поўная самаддача і сапраўдны артыстызм забяспечылі яму поўны поспех. У. Караткевіч напоўніў вобраз свайго героя складанасцю перажыванняў і ўзрушанасцю думак, высакароднай стрыманасцю і сілай усепаглынальнага кахання, якое ўзнялося над забабонамі і дзікасцю сярэдневякоўя. Светлы і чысты юнак, які прадстае перад намі, літаральна на вачах сталее, робіцца мудрым і моцным, здольным дастойна ацаніць марнасць і мішуру свету сацыяльных супярэчнасцей, і ў выніку паўстаць супраць яго.

Такая і Джульета. Яе каханне да Рамэо — выклік, кінуты варожаму свету. Актрыса Н. Караткевіч паказвае гэта шчыра, выразна. І хіба толькі Джульета-дзяўчынка ў першых сцэнах (да сустрэчы з Рамэо на бале) здаецца гледачу, можа, вельмі дарослай, нібы ўжо ўвабраўшай мудрасць моцнага пачуцця.

Важную для гуманістычнай ідэі і для фабулы п'есы ролю мудрага і добрага манаха Ларэнца іграе народны артыст БССР С. Бульчык. У акцёрскай трактоўцы мудрасць Ларэнца яўна падначалена дабраце. Адчуваецца, што дзейсную дапамогу закаханым ён аказвае менавіта па дабраце сардэчнай, што, безумоўна, адпавядае зместу вобраза, створанага Шэкспірам, але не вычэрпвае яго.

Рэжысёрскі мантаж тэксту вылучыў на першы план сярод сяброў Рамэо Бенволіо. Яму даверана словы ў пралогу, ды і заключная рэпліка, а не Эскалу, як у п'есе. Акцёр Н. Вайцюк у ролі Бенволіо знаходзіцца на ўзроўні, вартым гэтай ускладнёнай задачы: ён высакародны, стрыманы і чысты.

Вельмі яркі, своеасаблівы і блізкі да сучаснай моладзі сваёй рашучай насмешлівасцю, зменай настрояў Меркуцыо (А. Гаманюк). Дарэчы, артыст, як, між іншым, і большасць удзельнікаў спектакля, вельмі пластычны, добра фехтуе, свабодна і ўпэўнена карыстаецца багатым акцёрскім арсеналам.

Спектакль Магілёўскага тэатра можа, вядома, быць больш дасканалым. Не заўсёды апраўданы даволі значныя купюры і пераманціроўкі тэксту; губляецца пэўная частка шэкспіраўскага гумару, і таму спектакль крыху рацыяналістычны. Вельмі «забытоўлена» кармініца (заслужаная артыстка БССР Ю. Гальперына), — у ёй праглядваюць рысачкі свацця з п'ес А. Астроўскага. Бадай, вельмі трывіяльна традыцыйныя старэйшыя Мантэкі (заслужаны артыст БССР С. Яворскі і заслужаная артыстка РСФСР Э. Міхайлава) і Капулеці народны артыст РСФСР М. Радзіёнаў і заслужаная артыстка БССР З. Малчанава), крыху прасталінейны граф Парыс (В. Смірноў). Часткова ва ўсім ёсць свой рэзон: так мацней адцяняецца іх прыналежнасць да мінулага. Своеасаблівая рэзная лінія герцага Эскала (заслужаны артыст БССР А. Рудакоў), пакуль яшчэ дысгармаціруе з агульным стылем спектакля.

Работа магілёўчан — перспектыўная, творчая работа. Яна дэманструе вялікія магчымасці калектыву, сталасць думкі. Нават на фоне англійскага фільма, які шырока дэманструецца ў Іванаве, спектакль гасцей не губляецца і не робіцца менш ўражлівым.

Аркадзь ПАУЛАЎ.

ПРАБЛЕМЫ, МЕРКАВАННІ, РОЗДУМ

ПРА КУЛЬТУРУ АДЗЕННЯ

Р. БАКУНОВІЧ

ГАСПАДАРЧЫ РАЗЛІК

НЯДАЎНА я прысутнічала пры такой размове: дачка маіх знаёмых — студэнтка вну — аб'явіла бацькам, што ёй прапанавалі пайсці ў Дом мадэляў манекеншчыцай (без адрыву ад вучобы). Дзяўчыне было прыемна, што яе выдзелілі сярод іншых сакурсніц, яна радавалася, што асвоіць новую прафесію і, магчыма, паедзе дэманстраваць адзенне нават за мяжу...

Маці слухала дачку і не ведала, што адказаць. Але бацька, чалавек рашучы, між іншым, адказны работнік адной паважанай установы, адрэзаў: «Нікуды ты не пойдзеш, хай Дом мадэляў шукае сабе манекеншчыкаў не сярод студэнтаў, а ўвечары на праспекце. Там хапае баралатых стыляг!»

Нават няёмка даводзіць, што паказ адзення — справа не менш патрэбная і пачэсная, чым паказ здабыткаў прамысловасці і сельскай гаспадаркі, бо і адзенне адлюстроўвае новы дзень Беларусі, яе культуру, яе побыт. Няёмка даводзіць, што культура адзення не менш важная рэч, чым культура мовы, культура паводзін, культура ўзаемаадносін, — настолькі гэта ясна і зразумела, здавалася б, кожнаму.

Аказваецца, яшчэ той-сёй мяркуе, што клопат пра адзенне — гэта клопат «стыляг». Адкуль гэтая фальшывая сарамлівасць, калі не сказаць — коснасць, у дачыненні да адзення, да моды? Гэта, відаць, з тых часоў, калі мы свядома абмяжоўвалі сябе ў многім, калі кортавыя штаны і паркалёвая сукенка былі і рабочым нашым адзеннем, і святочным. Бо нічога іншага мы не маглі сабе дазволіць, каб нават і хацелі.

Сплыло з таго часу шмат вады, а старое сёння стаўленне да моды, у прыватнасці, да адзення, да звязаных з гэтым праблем, засталося.

Вернемся да нашай студэнткі, якой забаранілі выступаць у якасці манекеншчыцы.

Чаму наогул спатрэбіліся студэнты? Ды проста таму, што ў Мінскім доме мадэляў не хапае штатных манекеншчыкаў. Не папулярны занятак? Сорамна займацца такой справай? Відаць, так і ёсць з пункту гледжання шаноўнага бацькі. Яму і ў галаву не прыходзіць, што манекеншчык—гэта не толькі чалавек, які мае пэўны памер таліі, плячэй, пэўны рост. Манекеншчык — гэта **вобраз** юнака альбо дзяўчыны, жанчыны альбо мужчыны, якім пасуе пэўны стыль вопраткі, стыль мастацка распрацаваны, вынайдзены мастаком-мадэльерам і накіраваны на тое, каб прыгожа і зручна апрануць тысячы людзей.

Я падрабязна спынілася на гэтай праблеме таму, што стаўленне і да іншых, далёка не другарадных у гэтай галіне праблем, вынікае з таго ж яўна ці захавана грэблівага стаўлення да стварэння ўзораў адзення. Зараз Мінскі дом мадэляў рыхтуе новую калекцыю адзення для паказу на міжнародным кірмашы ў Югаславіі.

Першае пытанне, якое паўстае, гэта «з чаго пашыць»? Перш-наперш мастак шукае матэрыял, бо толькі ў матэрыяле ён можа рэалізаваць сваю задуму, максімальна выкарыстаўшы ўласцівасці тканіны і спалучыўшы іх з канструкцыяй мадэлі. Нават самы вопытны майстар наўрад ці пашые прыгожае адзенне з кепскай матэрыі. (Між іншым, на працягу стагоддзяў у Еўропе адзіным крытэрыем якасці адзення была тканіна, з якой яно пашыта. Як — няважна. Потым эстэтыка моды перамагла гэтую аднабокасць. Але і сёння на Усходзе якасці тканіны аддаецца перавага перад канструкцыяй).

У Міністэрстве ж лёгкай прамысловасці БССР лічаць, што мастакі Дома мадэляў павінны працаваць з тым матэрыялам, які ёсць. А для таго, каб зрабіць нешта новае, паказаць перспектыву мадэліравання, неабходна праяўляць «асабістую кемлівасць» і вынаходлівасць.

На практыцы гэта выглядае так. Бярэ мастак камандзіроўку і едзе куды вочы глядзяць. А глядзяць яны часцей туды, дзе ў яго ёсць знаёмствы, карысныя для справы. Напрыклад, у Маскву, Ленінград, Рыгу. Там ён па шматку, па кавалачку дастае новыя тканіны на адно—два паліто, на дзве—тры сукенкі, на тры—чатыры спадніцы. З гэтых падораных кавалкаў і ствараецца новая мадэль.

Чаму так робяць? Таму, што прадпрыемствы рэспублікі выпускаюць мала новых, «цікавых» тканін. І справа тут не толькі ў якасці фарбавальнікаў, якасці пражы, але і ў фантазіі фабрычных спецыялістаў, так званых дысанатараў. Праўда, яны не заўсёды вінаватыя. Паток, канвеер, вал — на фантазію мала часу.

Спрабавалі наладзіць супрацоўніцтва мастакоў Дома мадэляў з работнікамі мінскіх камвольнага і тонкасуконнага камбінатаў, з прадпрыемствамі Віцебска. Мадэльеры падказалі тэкстыльшчыкам больш тонкія, нечаканыя варыянты выкарыстання некаторых тканін. Выпускае камбінат тканіну пэўнага артыкула, скажам, для паліто. (Швейная фабрыка можа пашыць з яго толькі тое, што ўказана ў артыкуле). А мадэльеры выкарысталі тую ж тканіну для касцюма. Вынікі аказаліся цікавымі, былі задаволены і швейнікі, і мадэльеры.

Але справа спынілася на першых кроках, таму што для сумеснай работы патрэбен лішні час і аплата працы мастакоў. А прадпрыемствы, якія маюць патрэбу ў дапамозе мастакоў, плаціць не могуць — няма адпаведнага артыкула.

А вось яшчэ праблема. Мінскі дом мадэляў забяспечвае ўсю швейную прамысловасць рэспублікі новымі фасонамі, усёй дакументацыяй па канструяванні адзення. Гэта значыць, што б вы ні купілі — паліто, дзіцячы фартушок, прыгожую сукенку або хатні халат — усё гэта распрацавана ў Мінскім доме мадэляў. Ні адна швейная фабрыка не мае сваіх мастакоў-канструктараў.

Дрэнна гэта ці добра? На першы погляд, як быццам нядрэнна. Кваліфікаваныя мастакі і канструктары распрацоўваюць узоры адзення, так сказаць, на сталічным узроўні. Згодна з рэкамендацыямі рабочай групы СЭУ па культуры адзення — ніякай самадзейнасці, ніякага саматужніцтва. Але гэта па тэорыі. Паглядзім, што адбываецца на практыцы.

15 мастакоў Дома мадэляў ствараюць у год каля тысячы ўзораў адзення для прамысловасці. (Не ўлічваючы тых, што шыюцца для выставак і дэманстрацый). Усе гэтыя мадэлі зацвярджаюцца мастацкім саветам, у які ўваходзяць прадстаўнікі Міністэрства гандлю БССР, Міністэрства лёгкай прамысловасці БССР, Дзяржаўнага камітэта цэн, Дзяржаўнага камітэта стандартаў. Затым гэты зацверджаны ўзор мадэлі паступае на фабрычны канвеер — і вось вынік: за адзін 1971 год з 900 мадэляў 102 — зняты з вытворчасці, 47 — не рэкамендаваны ў вытворчасць на 1972 год, а 200 атрымалі заўвагі і дапрацоўваюцца. Прычына? То тканіна не адпавядае зацверджанаму ўзору, то аздабленне, а часам на фабрыцы адвольна мяняецца фасон. Адным словам, парушаецца тэхналогія вытворчасці.

Каб палепшыць становішча, работнікі гандлю прапануюць узор мадэлі, зацверджаны мастацкім саветам, дасылаць не толькі фабрыцы, якая будзе выпускаць новую прадукцыю, але і гандлёвай арганізацыі (на базу), дзе маглі б супаставіць яго з арыгіналам і тым самым пацвердзіць ідэнтычнасць абодвух экземпляраў.

Гэта па-першае. Па-другое, — мастак павінен заставацца гаспадаром свайго твора аж да таго моманту, пакуль ён не трапіць у рукі пакупніка. Ёсць такое паняцце, як аўтарскі нагляд. Мастак абавязан прысутнічаць на фабрыцы і сачыць за тым, як увасабляецца яго фантазія ў серыйнай вытворчасці. Але тут зноў праблема. Афіцыйна мастак-канструктар, выявіўшы парушэнне тэхналогіі, можа «паставіць пытанне» на мастацкім савеце аб знятці мадэлі з вытворчасці. Але права «паставіць пытанне» нічога не дае. Трэба даць мастаку права, падобнае на права інжынера па тэхніцы бяспекі. Калі той бачыць, што ў цэху парушаюцца правілы бяспекі, ён можа неадкладна спыніць канвеер, спыніць вытворчасць. Так і мастак: калі заўважыў, што фабрыка адышла ад мадэлі, адвольна спрасціла яе, лічыцца толькі з выкананнем плана, а не з інтарэсам пакупніка, ён павінен мець права спыніць канвеер. І думаецца, што калі б надзяліць мастака такім паўнамоцтвам, дык на нашых базах не ўтвараліся б запасы нерэалізаванага адзення, якія на 51 працэнт перавышаюць норму.

Аднак (зноў праблема!) калі нават і даць мастаку-мадэльеру такое права, дзе ён знойдзе час, каб яго рэалізаваць? Ён жа працуе на гаспадарча-разліковым прадпрыемстве і яго рабочы час на аўтарскі нагляд не разлічан. Відаць, што за гэтым хаваюцца пэўныя недахопы **цэнтралізацыі мадэліравання.** Скажам, у ГДР, ВНР, ЧССР буйныя швейныя фірмы маюць свае канструктарска-мастацкія групы, і яны добра зарэкамендавалі сябе перад пакупнікам. Дамы мадэляў там толькі ажыццяўляюць **метадычнае** кіраўніцтва гэтымі групамі і вызначаюць **напрамак** моды. Магчыма, што падобныя групы і на нашых швейных прадпрыемствах адыгралі б станоўчую ролю.

Мастацка - канструктарскія групы альбо лабараторыі, створаныя на буйных швейных прадпрыемствах, маглі б садзейнічаць больш хуткаму ўкараненню мадэляў у вытворчасць.

Натуральна, што ў такіх лабараторыях павінны працаваць спецыялісты, людзі адукаваныя, кваліфікаваныя. Дарэчы, такія спецыялісты ёсць, але яны не знаходзяць прымянення сваім ведам. Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут пачаў ужо выпускаць мадэльераў і мастакоў па тканіне. Але пасля таго, як яны заканчваюць інстытут, іх накіроўваюць на фабрыкі на пасаду дысанатараў, што не адпавядае ні іх ведам, ні запатрабаванням.

А створаныя лабараторыі маглі б укамплектоўвацца маладымі спецыялістамі. Але гэта пакуль што не робіцца.

Цэнтралізацыя мадэліравання вядзе часам да таго, што з'яўленне новай мадэлі на прылаўках магазінаў якраз супадае з адыходам моды, бо фабрыка не здольна аператыўна перабудоўвацца на новую мадэль, а Дом мадэляў не паспявае загадзя забяспечыць яе неабходнымі канструктарскімі распрацоўкамі.

Такому становішчу «садзейнічае» яшчэ адна акалічнасць. Бывае, што і мадэль гатова, і дакументацыя падрыхтавана, і фабрыка прыстасавалася да выпуску новага віду тавараў. Але яму няма цаны у самым літаральным сэнсе слова.

Вось прыклад: Мінскі дом мадэляў падрыхтаваў для швейнага аб'яднання імя Крупскай мадэль жаночага паліто са штучнай скуры для асеняга сезона, а выпускаць іх пачне недзе к зіме. І толькі таму, што на гэтыя паліто не зацверджаны расцэнкі. Хто іх зацвярджае? Група цэн пры Міністэрстве лёгкай прамысловасці БССР і Дзяржаўны камітэт цэн пры Савеце Міністраў БССР.

Такое становішча часам на паўтара — два месяцы затрымлівае выпуск швейнай прадукцыі, а таксама абутку. Яшчэ горш з трыкатажным адзеннем.

Але вернемся да праблем уласна Дома мадэляў. Ёсць у яго работнікаў і такі абавязак, як вывучэнне попыту на швейныя тавары. Арганізацыі, якая займалася б гэтым пытаннем, у нас няма. Канстатуюць факт — «пайшоў» ці «не пайшоў» новы касцюм, — работнікі прылаўка. Пры Мінскім доме мадэляў для вывучэння попыту арганізаваны эксперыментальны цэх, які шые сукенкі, курткі, касцюмы, паліто невялікімі партыямі і адпраўляе іх у магазіны. Гэта, так сказаць, апрабаванне фасона на пакупніку. Аб тым, падабаюцца яны пакупніку ці не, сведчыць попыт. Іх раскупляюць «па хаду». Такі цэх вельмі патрэбен Дому мадэляў — свая фірма, прэстыж. Але ад гэтай добрай справы Дому мадэляў няма выгады. Бо нават эксперыментальныя, супермодныя рэчы прадаюцца па сабекошце. А прадпрыемства, на якім яны выпускаюцца, гаспадарча-разліковае. Відаць, што варта было б прадпрыемству, якое працуе па новай сістэме эканамічнага планавання і стымулявання, даць больш самастойнасці, дазволіць вызначаць цэны на свае тавары, якія б зацвярджаліся на мастацкім савеце. Існуе ж у Мінску мастацка-вытворчы камбінат Мастацкага фонду БССР, які вырабляе розныя прыгожыя рэчы: ад сувеніраў да той жа сукенкі альбо вязанага жакета. Цэны на гэтыя тавары вызначае мастацкі савет пры камбінаце згодна з існуючымі расцэнкамі на мастацкія вырабы. Дарэчы, прадаюцца яны ў спецыялізаваным магазін-салоне. А хіба ж новая мадэль адзення, створаная ў Доме мадэляў, не мастацкі выраб? Гэта ж таксама ўзор, аўтарскі арыгінал. А прадаецца ён па цане серыйнага вырабу.

Што і казаць, гэта не заахвочвае мадэльераў. Дарэчы, добра было б, каб Мінскі дом мадэляў меў свой фірменны магазін, — зручна і прадпрыемству, і пакупніку.

І яшчэ. Вядома, што элегантнасць адзення залежыць не толькі ад пакрою і тканіны. Своеасаблівую «ізюмінку» вопратцы надае апошні сцяжок альбо кант, спражка ці гузік, кайма альбо модныя зараз махры. Іменна гэтыя дэталі робяць прывабнымі тавары, якія паступаюць на нашы прылаўкі з-за рубяжа, па імпарце. Гэта пацвердзіць кожная жанчына. Добра ведаюць пра гэта і мастакі адзення. Бадай таму мадэльераў Мінскага дома мадэляў можна ўбачыць за такой справай: сядзіць мастак за сталом, а перад ім нейкія ніткі, тасьма, пруткі, і нешта вывязвае, выкручвае, адным словам, майструе, рыхтуе аздобу для сваёй мадэлі. Гатовай прыгожай фурнітуры ў нас няма. Хаця фурнітурны завод у Мінску ёсць. Але ён пакуль што выпускае «ўпрыгожванні» для абутку. Але віназаціць завод нельга. Свайго мастака там няма. Праўда, у апошні час вырашана, што на дапамогу заводу прыйдуць мадэльеры з Дома мадэляў, на што яны ахвотна згаджаюцца. І зноў-такі — дзе ўзяць час на гэтую няпланавую работу?

І яшчэ. Дом мадэляў павінен стаць метадычным цэнтрам па рэкамендацыі ўзораў моды для ўсіх прадпрыемстваў Міністэрства лёгкай прамысловасці. Ці патрэбна прадпрыемствам Міністэрства бытавога абслугоўвання ствараць свае невялічкія дамы мадэляў? Хіба яны ўносяць у моду нешта новае? Ды і вытворчая база іх значна слабейшая і кваліфікаваных мастакоў менш. Вось тут і дарэчы цэнтралізацыя. Цэнтралізацыя ў прапагандзе моды. А для гэтага патрэбна мець свой часопіс, выпускаць буклеты, выкрайкі, рэгулярна паказваць новыя мадэлі па тэлебачанні і г. д.

З усімі гэтымі справамі Мінскі дом мадэляў можа справіцца, бо ёсць патрэбны энтузіязм, жаданне працаваць. Толькі неабходна гэтае жаданне падтрымаць.

НОВЫ НАРОДНЫ

Калегія Міністэрства культуры БССР прысвоіла званне народнага ансамбля танца «Юнацтва» Бабруйскага гарадскога Дома культуры.

□

Пяць гадоў назад нарадзіўся гэты цікавы творчы калектыў. Ім кіруе выпускніца Гродзенскага культасветвучылішча Людміла Крыштаповіч.

Ансамбль аб'ядноўвае звыш сарака маладых рабочых, служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў машынабудаўнічага завода імя Леніна, камбіната бытавых паслуг, хлебакамбіната, навучэнцаў сельгастэхнікума.

У рэпертуары калектыву беларускія народныя танцы: «Полька-Янка», «Полька-Весялуха», «Шаўцы», «Лявоніха», «Беларуская маладзёжная полька» і інш. Ставіць ансамбль харэаграфічныя сцэнкі і кампазіцыі: «1941 год», «Калі цвіце папараць», «Валёнкі». Нязменным поспехам у гледачоў карыстаюцца «Карабейнікі», «Мазурка», «Чардаш», «Чэшская полька» і шэраг іншых.

За паспяховае выступленне ў аглядах мастацкай самадзейнасці ў 1967 і 1970 гадах калектыў узнагароджаны дыпломамі і ганаровай граматай.

Зараз ансамбль танца «Юнацтва» актыўна рыхтуецца да фестывалю самадзейнага мастацтва, прысвечанага 50-годдзю СССР.

ВЯСЁЛАЯ ТРАСЯНКА

ЖАРТЫ, ГУМАРЭСКІ, ПАРОДЫІ, ЭПІГРАМЫ, ШАРЖЫ

Як я ні стараўся ціхенька сабраць з вечара падрыхтаваныя на дарогу рэчы, ён пачуў, што я прачнуўся і зашкрабаў пад дзвярыма. Я адчыніў.

— Прабач, — сказаў ён, тупаючы за мной па кухню. — Так курыць захацелася, аж вушы пухнуць, а запалак няма...

Па вачах бачу — не запалак ён шукае сярод посуду.

Я даў яму карабок.

— Ты куды сабраўся?—спытаў ён, зірнуўшы на маю сумку і плашч.

— Па грыбы...

— Пляшку, нябось, паклаў сюды...

— А як жа...

Я ўзяў сумку, гатовы ісці. Цімох пачухаў патыліцу.

— Можа і мне падацца з табою...

А сам з сумкі маёй вачэй не зводзіць, відаць, учора добра падпіў і гатоў за пляшкай ісці на край свету.

— Чаму ж не,—адказваю. — Прыемна па лесе пахадзіць, грыбкоў пашукаць, падыхаць свежым паветрам.

— Эх, пайду,—рашыў ён. — Трэба прасвяжыцца...

Я зачыніў кватэру і мы пайшлі на вакзал. Горад яшчэ не прачнуўся, толькі дзе-нідзе на шырокіх, абмытых з вечара дажджом тратуарах, з'яўляліся прахожыя. Праменні сонца пераліваліся і зіхацелі ў буйных кроплях на лісцях дрэў і ў лужынах на асфальце. Прыемная свежасць праганяла сон.

— А хораша раніцою прайсціся па горадзе, — сказаў я.

— Мгу, — буркнуў Цімох. — толькі дрэнна, магазіны ўсе зачынены...

У вагоне Цімох сядзеў прыгнечаны, сумна пазіраў на маю сумку. На ўсе мае словы адказваў абыякава:

— Мгу... Мгу...

— Ты аб чым зажурыўся, Цімох?—пытаю.

Цімох уздыхнуў.

— Думаю, брат, во каб мне ўсе тыя грошы, што я прапіў...

«Бярэцца за розум хлопец», — узрадаваўся я. Пытаю:

— Ну, а што б ты зрабіў з тымі грашыма?

— От мы б з табою выпілі...

Ён засмяяўся, а мне не хацелася смяяцца. Доўгі час я ўжо не бачу Цімоха на цвёрдых нагах.

— Ты, відаць, забыўся, — кажу, — пра вялікую прыемнасць

быць цвярозым. Весялуха таксама прыядаецца. Ды і не весяліць яна, калі часта яе ўжываем, а прыгнятае. Вось паходзіш па лесе, ажывеш...

У лесе Цімох сапраўды ажыў. Прайшла, відаць, смага пахмяліцца. Ён нават паружавеў. Шныруў пад галінкамі, радаваўся, калі знаходзіў там грыб. І ўсё ж тая пляшка, якая ляжала ў маёй сумцы, не давала яму спакою. Цяпер, мабыць, ужо не з патрэбы пахмяліцца, а з прывычкі.

Урэшце надышла хвіліна падсілкавацца.

— На вось сумку, — кажу, — вымай адтуль пажыткі, а я тым часам на хвілінку адлучуся. Тут побач заўсёды грыбкі былі...

— Ну, давай.

Я схаваўся ў кусты і... пачаў сачыць за Цімохам. Тым часам ён, нічога не падазраючы, выцягнуў з сумкі газету, расклаў яе на траве, потым — бутэрброды. Урэшце, выцягнуў самае галоўнае і... божа! Ці ж можна апісаць выраз яго твару! Я ўжо не ведаў, падыходзіць да яго ці ўцякаць дахаты. Усё ж наважыўся. Падыходжу, як бы нічога не здарылася.

— Хтосьці зрэзаў мае грыбы...

А ён:

— Ты што, здзекваццa з мяне рашыў?

— А што?—пытаю, быццам не ведаю, што да чаго.

— Што! Ты ж казаў, пляшку ўзяў.

— А гэта хіба не пляшка?

— Хваробу б я пайшоў з табой у лес, калі б ведаў, што гэта пляшка піва. Толькі час змарнаваў...— Ён устаў і сярдзіта пашыбаваў у бок станцыі.

— Ну, бяжы, наганяй час, — сказаў я яму ўслед.

Увечары я вярнуўся ў горад. Набраў поўную сумку баравікоў, надыхаўся свежым паветрам. Настрой быў цудоўны. Аднаго баяўся, не сустрэцца б з Цімохам дзе на сходах.

І толькі я пра гэта падумаў, бачу, паводдаль стаіць Цімох, абняўшы ліпу, а каля яго—міліцыянер.

— А што?—пачуў я праз хвіліну ўпарты голас Цімоха. — Нельга тут стаяць? Можа я каго чакаю. Можа хачу падыхаць свежым паветрам. Каму якое дзела? Я прыроду люблю, свежае паветра...

Убачыўшы мяне, Цімох узрадаваўся:

— Вось чалавек, якога я чакаю!..

Ён вызваліў ліпу са сваіх абдымкаў і накіраваўся ў мой бок, але не зрабіў і кроку, як... грымнуў проста пад ногі міліцыянеру.

— Гэта ваш знаёмы?—спытаў міліцыянер, з цікавасцю зірнуўшы на мае грыбы.

— Сусед.

— Далёка дзе жыве?

— Тут, побач.

— Не дайшоў, значыць...

І ўжо сумна павярнуўшыся да п'янага, сказаў:

— Ну што ж. Давядзецца забраць. Надыхаўся... прыродай...

Я. ГЕРЦОВІЧ

ГОРКІ СМЕХ

Шчаслівы, як цыган,
Што краў у Зэльве коней,
Ці як заезджы комік
(На іх расце цана),
Брыдзеш сабе далёка
Ад тлуму, мітусні.
Захочаш — загалёкай,
Захочаш — дык засні.

Юрка ГОЛУБ.

Шчаслівы, як цыган,
Што здаў на бойню коней,
Брыдзе заезджы комік
Між пушчаў і палян.
Брыдзе сабе далёка
Без мэты, без дарог,
Не хоча ні галёкаць,
Ні спаць без задніх ног.
Пад гэтай самай кручай
Калісь стаяў паэт
І песняй неўміручай
Здзівіў аж цэлы свет.
Пад гэтай самай ліпай
Без схем, чарнавікоў,
Народжана не ліпа,
А верш у сто радкоў.
Хоць не сказаў нікому
Паэт пра свой маршрут,
Знайшоў мясціну комік,
Дзе твораць без пакут,
Знайшоў, прысеў і прачытаў
Паэтаву падборку,
Паэта комікам прызнаў
І засмяяўся горка.

Барыс БЕЛІЖЭНКА

ПАЭТУ

— Гэй! Хто там, на Парнасе?
Я прыехаў.
Ці вельмі строгія у вас гаспадары?
Мо трэба браць сталёвыя даспехі,
Каб тут прабіцца як у песняры?..
Гляджу, выходзіць хлопец зухаваты,
Вачамі праплкае навылёт:
— Ты што тут робіш каля нашай хаты,
Так прагна пазіраеш цераз плот?
— Ды вось,—кажу,—прывёз паўпуда рыфмаў.
Дзе скласці іх і выпісаць квіток?
Як пералезці мне праз вашы рыфы
І трапіць у пісьменніцкі гурток?..
Ён пачытаў уважліва, прыкінуў
І даў, падумаўшы, адказ:
— Прывёз у Мінск ты, хлапчанё, мякіну,
А тут азёс адборны жрэ Пегас.

ГЭТЫМАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК

Працягваем публікацыю слоўніка «Вясёлай трасянкі», які выклікаў і, спадзяёмся, яшчэ будзе выклікаць водгукі ўдзячных чытачоў і рацпрапановы па яго паляпшэнні і ўдасканаленні. Чакаем!

Галіцца (быт.)—распранацца.
Гуляш — прагульшчык.
Далягляды (праф.)—аматары заглядваць у слоўнік Даля.
Душ (рэліг.)—духоўны саноўнік.
Завербавацца (жарг.)—схавацца за вярбу.
Зубіла (жарг.)—хуліган.
Калабок (праф.) — медсястра са шпрыцам.
Лазер—верхалаз.
Насупіцца—наесціся супу.
Несусветны — малавядомы пісьменнік.
Падагра (тэхн.)—машына для падагрэву.
Падранак (жарг.)—запознены гуляка.
Пікнуць (вайск.—гіст.) —кальнуць пікай.
Піратэхнік (спец.) — арганізатар банкетаў.
Прытулак (размоўн.)—жыхар ваколіц г. Тулы.
Самагон (тэхн.) — перпетуум мобіле.
Троя (жарг.)—складчына на траіх.
Турбавацца (быт.)—адпачываць на турбазе.
Туш—пажарнік.

І. ДАШЧЫНСКІ, П. САКОВІЧ.

Марыуш КВЯТКОЎСКІ

ЯК АДПАЧЫВАЦЬ?

У НАШ ЧАС рабочы дзень чалавека загружаны з пачатку да канца. Вось чаму вельмі важна ўмець рацыянальна арганізаваць свой адпачынак. Дарэчы, адпачынак не толькі пасля работы, але і на рабоце. Як вядома, разумовая праца стамляе чалавека. Восем гадзін перакладвання паперак з адной скрынкі стала ў другую, пастаяннае напружанне, выкліканае тым, каб, барані бог, не даць станоўчага адказу наведвальнікам, — усё гэта выклікае моцнае разумовае ператамленне і знясіленне нерваў.

З якіх фактараў павінен складацца арганізаваны, рацыянальны адпачынак на рабоце? Па-першае, патрэбна ўсялякім чынам пазбягаць яе. Але гэтага мала. Імкнучыся арганізаваць рацыянальны адпачынак на рабоце, мы павінны перш за ўсё прыбраць усё тое, што нам перашкаджае. Напрыклад, каб больш эфектыўна адпачываць, трэба прыкрыць вочы далонню — гэта дасць магчымасць хутчэй забыцца пра работу. Часам карысна заткнуць вушы ватай, што засцеражэ вас ад пабочных гукаў, якія маглі б перашкодзіць вам бачыць прыемныя сны. Пабочныя гукі, у тым ліку размовы, храпенне калег і г. д., вельмі зніжаюць прадукцыйнасць адпачынку.

Неабходна весці непрымірымую барацьбу і з шумам. У памяшканні, у якім мы разумова адпачываем, павінна панаваць абсалютная цішыня. У пакоях і калідорах неабходна паслаць тоўстыя дываны і палавікі, якія б заглушалі крокі; дзверы трэба шчыльна зачыняць (асабліва ад дакучлівых наведвальнікаў).

Вялікі шум ствараюць пішучыя і лічыльныя машынкі. Значыць, ад іх трэба адмовіцца. Шарыкавыя ручкі з поспехам могуць замяніць пішучыя машынкі, а замест лічыльных машын трэба завесці далікатныя драўляныя лічыльнікі.

Ні ў якім разе не трэба браць на работу людзей, якія храпуць у час сну. Калі ж такі ўсё ж апынецца сярод нас, неабходна яго самым належным чынам ізаляваць, высунуўшы яго на кіруючую работу, дзе ён будзе мець асобны кабінет.

Каб прадуктыўна адпачываць, неабходна перш за ўсё ўсімі спосабамі адцягнуць сваю ўвагу ад работы.

З'явіўшыся ва ўстанову, трэба пачаць свой працоўны дзень з адпачынку, вельмі неабходнага пасля намаганняў, прыкладзеных па шляху на службу. Як мага ямчэй уладкоўваемся ў крэсле, расслабляем мускулы і, не спяшаючыся, думаем пра тое, што прыйдзе нам у галаву.

Потым, на жаль, раскладваем на стале паперы, пасля чаго зноў адпачываем. Лепш за ўсё прайсціся па пакоі, зрабіць некалькі гімнастычных практыкаванняў, падцягнуцца, скажам, на люстры, зрабіць сальта з шафы на падаконнік, стойку на левай, потым на правай руцэ і да т. п.

Пасля гімнастыкі неабходна перакусіць. Уключаем электрычную плітку, абскубваем курыцу, што прынеслі з сабой, кідаем у вар макароны, моркву, пятрушку, потым пагружаем курыцу ў вар. Адвараная курыца — страва параўнаўча простая ў прыгатаванні і ў той жа час надзвычай спажыўная.

Пасля яды лепш за ўсё выйсці з кабінета, змяніць абстаноўку. Можна пайсці ў парк, у клуб міжнароднай кнігі, пачытаць часопісы ці схадзіць у басейн або кафэ.

Незадоўга перад сканчэннем рабочага дня вяртаемся ва ўстанову, складваем паперы і, як толькі гадзіннік праб'е чатыры, спяшаемся дадому, каб рацыянальна адпачыць пасля работы.

З польскай пераклаў М. НАВІЦКІ.

Па тэхнічных умовах унутраныя восем старонак васьмі знешніх. Атрымаўшы або набыўшы газету, газеты друкуюцца і выпускаюцца асобна ад укладзіце ўнутраныя аркушы ў знешнія.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Мінск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 АТ 02596

Адрас рэдакцыі: Мінск, вул. Захарава, 19.

Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара—33-44-04, аддзела літаратуры—33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі—33-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 33-24-62, аддзела публіцыстыкі — 33-24-62, аддзела культуры—33-21-53, выдавецтва — 32-22-19, бухгалтэрыі — 32-15-87.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Л. Я. ПРОКША.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. Ц. БАЖКО (намеснік галоўнага рэдактара), Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, А. С. ГРАЧАНІКАЎ, Ю. П. ГРЫГОР'ЕЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.